Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

23 ЖНІЎНЯ 2008 г.
СУБОТА
№ 158 (26271)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Ліст у нумар

## МОВУ ВЕДАЦЬ НЕ ТРЭБА?

**...Прачытаў у якойсьці з газет, што для таго, каб увайсці ў замежны парламент, патрэбна добрая сотня дадатных якасцяў. У кандыдата, які не ведае (прычым — дасканала) мовы сваіх выбаршчыкаў, упэўнены, шанцаў — ніякіх.**

Пачынаецца барацьба за дэпутацкія крэслы ў нас. Але, як і раней, практычна ўсе выступленні, у тым ліку па радыё, па тэлебачанні, будуць гучаць не па-беларуску.

На першы погляд яно, як быццам, зразумела: мова карэннага насельніцтва для яго парламента, на вялізны жаль, не з'яўляецца рабочай. Але ж, калі б выбраныя намі людзі, любілі і ведалі яе, калі б хварэлі душой, мо краіна хоць некалі ды ступіла б на шлях той жа Расіі — аб'явіла б год абароны роднай мовы, падняла б яе аўтарытэт, засяродзіла б увагу людзей, бо сёння абсалютную большасць іх турбуе ўсё што заўгодна, толькі не гэта. Мова пушчана на самацёк. Яе не трэба ведаць, каб стаць грамадзянінам краіны, каб жыць тут…

Да таго ж цяпер рэзка скарачаецца насельніцтва вёсак. Гэта не толькі ў нас, ва ўсіх краінах застаюцца высокатэхналагічныя буйныя альбо фермерскія гаспадаркі, харчовую незалежнасць забяспечваюць 5 працэнтаў вяскоўцаў. Але ж у Беларусі спрадвек менавіта вёска была апірышчам беларускасці і перш за ўсё мовы, калыскай таленавітых пісьменнікаў. Ці вырастуць на гарадскім асфальце новыя Купалы і Коласы, Быкавы і Барадуліны, Казько..?

З экранаў людзям даводзяць, што рускія і беларусы адна нацыя, адзін народ, што наша краіна зрабілася інтэрнацыянальнай. Дык мо тады (свят-свят) і назву яе памяняць?..

Не падумайце, я не ксенафоб, не нацыяналіст, хоць па дыплому і гісторык, у школе выкладаў нямецкую і англійскую мовы (вывучыў самастойна), паважаю рускую, усё разумею на ўкраінскай. Але перш за ўсё, я перакананы ў гэтым, усім (а тым больш дэпутатам) трэба дасканала ведаць, трэба размаўляць на мове той краіны, у якой жывеш.

Бо хто ж будзе паважаць нас, калі мы самі сябе не паважаем?

**Міхаіл Паўлавіч ДУБОВІК,**

*в. Арэшкавічы, Бярэзінскі раён.*




## Святкаванне 65-годдзя з дня Перамогі павінна адрозніваецца ад мерапрыемстваў 60-гадовага юбілею новымі ідэямі і падыходамі

**Такую думку выказаў падчас пасяджэння Рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання вышэйпамянёнай даты прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь Сяргей Сідорскі.**

Паводле слоў кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Макея, прапанавана стварыць рабочую групу пры Адміністрацыі Прэзідэнта, якая да 1 кастрычніка гэтага года сумесна з Урадам падрыхтуе праект праграмы святкавання 65-й гадавіны вызвалення Беларусі. 65-я гадавіна павінна яшчэ больш аб'яднаць беларусаў, дастойна прадставіць рэспубліку перад сусветнай супольнасцю і адбыцца як агульнарэспубліканская грамадска-культурная кампанія пад лозунгам «Мы перамаглі!». У межах кампаніі прапануецца правядзенне з верасня гэтага года па ліпень 2009-га акцыі «Беларусь: гісторыя Перамогі». Кульмінацыяй урачыстасцяў павінны стаць дні з 27 чэрвеня па 5 ліпеня 2009 года. Нягледзячы на імкненне пазбегнуць падабенства з мінулым важкім юбілеем, некаторыя традыцыйныя мерапрыемствы будуць захаваныя. Напрыклад, штогадовае рэспубліканскае фізкультурнае свята — шырокае і масавае, — дэталі якога будуць абмеркаваны крыху пазней.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

# ЗАЛАТЫ ДУБЛЬ БЕЛАРУСКІХ ВЕСЛЯРОЎ

*Беларускі квартэт у складзе Аляксандра і Андрэя Багдановічаў, а таксама беларуская чацвёрка ў складзе Рамана Петрушэнкі, Вадзіма Махнёва, Аляксея Абалмасава і Артура Літвінчука заваявалі залатыя медалі. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў спартсменаў з гэтымі ўзнагародамі.*



Фота БЕЛТА.

Раман ПЕТРУШЭНКА, алімпійскі чэмпіён-2008 у Пекіне па веславанні на байдарцы:

## «ХТО ШУКАЕ — ТОЙ ЗНАХОДЗІЦЬ»

*Залаты заезд беларускай чацвёркі ў складзе Рамана Петрушэнкі, Вадзіма Махнёва, Аляксея Абалмасава і Артура Літвінчука заключаў апошні від пятнічнай алімпійскай праграмы на вяслярным канале. Апладысменты квартэту беларусаў былі сарваныя ў той час, як браты Багдановічы толькі-толькі асвоіліся на беразе. Журналісты толькі паціралі рукі: залаты дубль — гэта супер. Хоць работы будзе па горла. У гэты ж час міністр спорту і турызму Беларусі Аляксандр Грыгараў лятаў як на крылах. Ура, за лічаныя хвіліны збылося тое, чаго, можна сказаць, чакалі ўсё сваё жыццё. І вось у межах дасягальнасці з'явіліся чацвёра беларусаў. «Аддувацца» перад журналістамі традыцыйна даводзіцца Раману Петрушэнку.*

**— Раман, з перамогай вас! Якія адчуванні зараз на душы?**

— Дзякуй! Адчуванні самыя прыемныя. Уся наша праца, якая рабілася на працягу многіх гадоў, не прапала дарма.

**— Магчыма, на пераможны фініш вас натхніла перамога братоў Багдановічаў, якія завяршылі гонку некалькімі хвілінамі раней?**

— Мы не мелі інфармацыі наконт папярэдняй гонкі, хоць братоў Багдановічаў я віншую з выдатнай перамогай. Ведаеце, калі настройваешся на сур'ёзную барацьбу, то нічога, акрамя фінальнай гонкі, у галаву не лезе.

**— На працягу апошніх гадоў беларуская чацвёрка на міжнародных стартах была ў «цяні». Няпроста для вас складвалася і кваліфікацыйная стадыя адбору на цяперашні фінальны заезд. І раптам — такі шыкоўны фінал з даволі значным адрывам ад сапернікаў!**

— Пачну з кваліфікацыйных заездаў. Сапраўды, нам неяк не каціла на гэтых стартах. Магчыма, не зусім добра акліматызаваліся да пекінскага надвор'я. Хоць тут ужо даводзілася бываць і нават пазнаёміцца з каналам. Але ж з трэцяга месца нам удалося прабіцца ў фінал. Што тычыцца нашай «непрыкметнасці» на працягу сезона... На мой погляд, не факт, што пастаяннае паспяховае выступленне на розных міжнародных стартах — гарант поспеху. Гэта, дарэчы, як і кваліфікацыйныя заезды. На памяці яшчэ Алімпійскія гульні ў Афінах. Тады мы куляй праляцелі кваліфікацыю, а калі чарга дайшла да фіналу — толькі 6-е месца. Крыўдна: чатыры гады «аралі», а калі трэба было стрэліць — стрэл аказаўся халастым.

**— Вопыт і яшчэ раз вопыт — вось гарант поспеху?**

— Можна сказаць і так. Хоць у нашай чацвёрцы кожны спартсмен дапаўняе адзін аднаго. Тут і вопыт, і маладосць, і імкненне дасягнуць завоблачных вяршынь. Думаю, што гэта і прадвызначае ў канчатковым выніку поспех.

**— На гэты раз ён быў заканамерным?**

— Шчыра кажучы, на «золата» мы не вельмі разлічвалі, бо добра ведалі сілу нашых сапернікаў. Але ж у тым і загадка гонкі, што на ёй можа адбыцца ўсялякае. На гэта мы проста былі добра настроены, летась на гэтым канале ў Пекіне выйгралі старты на перадалімпійскім тыдні. Зараз магу пацвердзіць: дабіваецца мэты той, хто шукае шляхі для гэтага. Наша дарога аказалася правільнай.

Аляксандр БАГДАНОВІЧ, алімпійскі чэмпіён алімпіяды-2008 у Пекіне па веславанні на каноэ:

## «КОЖНЫ ФІНАЛЬНЫ ЗАЕЗД — ЯК АПОШНЯЯ ГОНКА Ў ЖЫЦЦІ»

*Учарашняя перамога беларускіх весляроў на дыстанцыі 1000 метраў братоў Багдановічаў — Аляксандра і Андрэя — выклікала сапраўдны фурор на вяслярным канале SY Rowing Canoe Park. Адразу за абодвух братоў адказвае старэйшы Аляксандр.*



Фота БЕЛТА.

**— Ну і паказыталі вы нервы нашаму брату-журналісту!**

— Думаю, што ў першую чаргу мы паднеслі непрыемны сюрпрыз нашым сапернікам. Ну, а калі вы вельмі моцна хваляваліся, то гэта, пэўна, толькі дадавала нам сілы.

**— І ўсё ж якім прынцыпам вы кіраваліся, калі пачалі фінішны спурт? Мы перажывалі, што на заключны рывок не хопіць часу?**

— Ведаеце, у гэтым выпадку мы не можам загадзя ведаць, што браты Багдановічы павінны дагнаць нямецкі дуэт у асобе Хрысціяна Гіле і Томаса Віленчыка за 50 ці 30 метраў да фінішу. У нас ёсць у падсвядомасці, што пасля 250 ці 500 метраў мы павінны дадаць хуткасці — мы строга кіруемся гэтым правілам. А далей усё залежыць ад нашых сапернікаў, Усявышняга і Фартуны.

**— На п'едэстале гонару немца Томаса Вяленчыка не было — замест урачыстай цырымоніі ён быў адпраўлены ў шпіталь. Кажуць, што моцна пераневваўся і здароўе не вытрымала?**

— Не палічыце за нейкі спартыўны эгаізм, але цяпер можна гаварыць ім ўсё, што заўгодна. Дарэчы, нямецкая пара з'яўляецца вельмі моцным сапернікам.

**— І тое, што яны сёння праляцелі, заслуга выключна братоў Багдановічаў?**

— І не толькі. Зараз мне і майму брату Андрэю хочацца сказаць добрыя словы ўдзячнасці нашаму трэнеру Уладзіміру Уладзіміравічу Шантаровічу і ўсім тым, хто дапамагаў нам у падрыхтоўцы.

**— Аляксандр, твой брат Андрэй пачаў выступаць з табой, здаецца, з мінулага года. Адчувалася, што хлопец трапіў у сваю лодку?**

— Ну, спачатку ў нас не ўсё клеілася. У Андрэя былі пэўныя агрэхі ў тэхнічным плане. Аднак упартыя трэніроўкі, дапамога трэнераў і ўдача паспрыялі нам, каб сёння ўзняцца на вышэйшую прыступку п'едэстала.

**— У перадапошні дзень Алімпіяды ў цябе з братам яшчэ адзін фінал на 500 метраў. Якая дыстанцыя з дзвюх прадстаўленых больш падатлівая?**

— Ну, так вам і скажы, а вы ўсе тайны разнесяце па свеце. Ну, а калі без жарту, то не ведаю. Часам не ўсё ад цябе залежыць. Трэніруешся гадамі, праліваеш мора поту, а выніку можа і не быць. У любым выпадку на 500 метрах мы будзем выкладвацца так, быццам бы гэта наша апошняя гонка ў жыцці. Інакш — удачы не дабіцца.

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.**

## МЕДАЛЬНЫ ЗАЛІК

| Месца | Краіна | Золата | Серабро | Бронза | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Кітай | 47 | 17 | 25 | 89 |
| 2. | ЗША | 31 | 36 | 35 | 102 |
| 3. | Вялікабрытанія | 18 | 13 | 13 | 44 |
| 4. | Расія | 17 | 18 | 22 | 57 |
| 5. | Германія | 14 | 9 | 13 | 36 |
| 6. | Аўстралія | 12 | 14 | 16 | 42 |
| 7. | Паўднёвая Карэя | 11 | 10 | 7 | 28 |
| 8. | Японія | 9 | 6 | 10 | 25 |
| 9. | Італія | 7 | 8 | 10 | 25 |
| 10. | Нідэрланды | 7 | 5 | 4 | 16 |
| 11. | Ямайка | 6 | 3 | 1 | 10 |
| 12. | Францыя | 5 | 13 | 16 | 34 |
| 13. | Украіна | 5 | 4 | 12 | 21 |
| 14. | Іспанія | 4 | 6 | 2 | 12 |
| **15.** | **БЕЛАРУСЬ** | **4** | **4** | **8** | **16** |
| 16. | Румынія | 4 | 1 | 3 | 8 |
| 17. | Канада | 3 | 8 | 6 | 17 |
| 18. | Польшча | 3 | 4 | 1 | 8 |
| 19. | Чэхія | 3 | 3 | 0 | 6 |
| 20. | Славакія | 3 | 2 | 1 | 6 |
| 21. | Новая Зеландыя | 3 | 1 | 5 | 9 |
| 22. | Эфіопія | 3 | 1 | 1 | 5 |
| 23. | Грузія | 3 | 0 | 3 | 6 |
| 24. | Куба | 2 | 6 | 11 | 19 |
| 25. | Кенія | 2 | 4 | 2 | 8 |
| 26. | Бразілія | 2 | 3 | 7 | 12 |
| 27. | Данія | 2 | 2 | 3 | 7 |
| 28. | Паўночная Карэя | 2 | 1 | 3 | 6 |
| 29. | Швейцарыя | 2 | 0 | 3 | 5 |
| 30. | Венгрыя | 1 | 5 | 2 | 8 |
| 31. | Казахстан | 1 | 4 | 6 | 11 |
| 32. | Турцыя | 1 | 4 | 3 | 8 |
| 33. | Нарвегія | 1 | 4 | 2 | 7 |
| 34. | Зімбабвэ | 1 | 3 | 0 | 4 |
| 35. | Азербайджан | 1 | 2 | 4 | 7 |
| 36. | Узбекістан | 1 | 2 | 3 | 6 |
| 37. | Славенія | 1 | 2 | 2 | 5 |
| 38. | Балгарыя | 1 | 1 | 3 | 5 |
| 39. | Інданезія | 1 | 1 | 3 | 5 |
| 40. | Фінляндыя | 1 | 1 | 1 | 3 |
| 41. | Манголія | 1 | 1 | 0 | 2 |
| 42. | Партугалія | 1 | 1 | 0 | 2 |
| 43. | Тайланд | 1 | 1 | 0 | 2 |
| 44. | Эстонія | 1 | 1 | 0 | 2 |
| 45. | Аргенціна | 1 | 0 | 3 | 4 |
| 46. | Індыя | 1 | 0 | 2 | 3 |
| 47. | Іран | 1 | 0 | 1 | 2 |
| 48. | Латвія | 1 | 0 | 1 | 2 |
| 49. | Мексіка | 1 | 0 | 1 | 2 |
| 50. | Бахрэйн | 1 | 0 | 0 | 1 |
| 51. | Камерун | 1 | 0 | 0 | 1 |
| 52. | Панама | 1 | 0 | 0 | 1 |
| 53. | Туніс | 1 | 0 | 0 | 1 |
| 54. | Швецыя | 0 | 4 | 1 | 5 |
| 55. | Літва | 0 | 2 | 3 | 5 |
| 56 | Трынідад і Табага | 0 | 2 | 0 | 2 |
| 57. | Харватыя | 0 | 1 | 3 | 4 |
| 58. | Аўстрыя | 0 | 1 | 2 | 3 |
| 59. | Грэцыя | 0 | 1 | 2 | 3 |
| 60. | Алжыр | 0 | 1 | 1 | 2 |
| 61. | Кіргізія | 0 | 1 | 1 | 2 |
| 62. | Калумбія | 0 | 1 | 1 | 2 |
| 63. | Сербія | 0 | 1 | 1 | 2 |
| 64. | Таджыкістан | 0 | 1 | 1 | 2 |
| 65. | Бельгія | 0 | 1 | 0 | 1 |
| 66. | В'етнам | 0 | 1 | 0 | 1 |
| 67. | Дамініканская рэспубліка | 0 | 1 | 0 | 1 |
| 68. | Малайзія | 0 | 1 | 0 | 1 |
| 69. | Сінгапур | 0 | 1 | 0 | 1 |
| 70. | Чылі | 0 | 1 | 0 | 1 |
| 71. | Эквадор | 0 | 1 | 0 | 1 |
| 72. | ПАР | 0 | 1 | 0 | 1 |
| 73. | Арменія | 0 | 0 | 6 | 6 |
| 74. | Тайвань | 0 | 0 | 4 | 4 |
| 75. | Ірландыя | 0 | 0 | 2 | 2 |
| 76. | Нігерыя | 0 | 0 | 2 | 2 |
| 77. | Афганістан | 0 | 0 | 1 | 1 |
| 78. | Багамскія астравы | 0 | 0 | 1 | 1 |
| 79. | Венесуэла | 0 | 0 | 1 | 1 |
| 80. | Егіпет | 0 | 0 | 1 | 1 |
| 81. | Ізраіль | 0 | 0 | 1 | 1 |
| 82. | Маўрыкій | 0 | 0 | 1 | 1 |
| 83. | Марока | 0 | 0 | 1 | 1 |
| 84. | Малдавія | 0 | 0 | 1 | 1 |
| 85. | Тога | 0 | 0 | 1 | 1 |

*Па стану на 18.00 22 жніўня.*

# БЕЛАРУСКАЕ ВЯСЕЛЛЕ З ІНШАЗЕМНЫМ УХІЛАМ

**Як паведамляла ўжо наша газета, у беларускай правінцыі — у Лепельскім раёне ва ўрочышчы Люкжына — галандзец і француржанка сталі галоўнымі героямі традыцыйнага старога беларускага абраду — «жаніхом» і «нявестай». Цікава, што апошняя літаральна за дзень да дзейства даведалася, што яна будзе нявестай. Пагадзілася, бо, наколькі я зразумеў, вельмі закаханая.**

**На вяселлі пабываў карэспандэнт «Звязды».**

Парыжанка Мацільда Вендэнбаўм і Мено Хоўтстра — актывісты Еўрапейскага цэнтра эка- і агратурызму. Ён — адзін з кіраўнікоў, а яна — лідар падраздзялення гэтай грамадскай арганізацыі. Акрамя гэтага, прыгажуня Мацільда ў Францыі мае непасрэднае дачыненне да грамадскага руху з вельмі «экспрэсіўнай» для нас назвай — «Паўсталы фермер». Аказваецца, гэта — вельмі мірная арганізацыя, займаецца экалагічным накірункам і турыстычным. Ці застануцца чытачы «Звязды» без пікантных сюрпрызаў? Не! Мено і Мацільда ўжо гадоў сем «жывуць у грамадзянскім шлюбе». Менавіта ў нас, у Беларусі, вырашылі «ўзаконіць» свае адносіны. А дзе яшчэ яны цяпер могуць зрабіць гэта? У той жа «цывілізаванай Еўропе»?

— Мы вельмі сур'ёзна ставімся да сённяшняга абраду, — гаворыць спадар Хоўтстра, які вельмі нагадвае Дон Кіхота (так мне здалося) — ростам ён за 2 метры, хударлявы. — Мы ўжо сустракаемся сем гадоў. Пазнаёміліся на кангрэсе ў Італіі. Адпаведнае «кляймо» ў пашпартах для нас не галоўнае. У вас ёсць унікальная магчымасць удзельнічаць у «язычніцкім» абрадзе. Вельмі добра, што ёсць людзі, якія ведаюць, як яго правесці...

*(Заканчэнне на 3-й стар.)*



# «БЕРАГ ЛЕВЫ, БЕРАГ ПРАВЫ... МЫ ЧАКАЕМ ПЕРАПРАВЫ»

Заходняя Дзвіна звязвае водным поясам два раёны Віцебскай вобласці — Верхнядзвінскі і Міёрскі. Уздоўж аднаго берага цягнецца вёска Луначарскае, уздоўж другога — самы маленькі горад Беларусі — Дзісна. Падтрымліваць зносіны людзям з розных берагоў дапамагае «карабель без ветразяў» — паром. За пяць хвілін і зусім бясплатна паромшчыкі дастаўляюць сваіх пасажыраў на супрацьлеглы бераг…

На вуліцы вельмі душна. Але калі мы з мэрам Дзісны Вольгай Мароз падышлі да вады, то адразу ж дыхаць стала лягчэй. І вокам не паспелі міргнуць, як рачное судна падхапіла новых пасажыраў і плаўна пачало набліжацца ў наш бок.

Ахвотнікаў жа ехаць, якія чакалі паром ля берага разам з намі, было нямала. Дарослыя, дзеці, пешшу, на машынах, на веласіпедах…

*(Заканчэнне на 3-й стар.)*



Выбары-2008

## Наглядальнікі ад АБСЕ будуць прысутнічаць пры рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты на пасяджэннях акруговых выбаркамаў

**Аб гэтым паведаміла старшыня Цэнтрвыбаркама Беларусі Лідзія Ярмошына.**

Кіраўнік ЦВК адзначыла, што гэтыя пасяджэнні плануецца правесці 27—28 жніўня. Нагадаем, што цяпер акруговыя камісіі правяраюць дакументы, якія паступілі ад прэтэндэнтаў на дэпутацкія крэслы для рэгістрацыі ў якасці кандыдатаў. Правяраюцца падпісныя лісты, пратаколы сходаў працоўных калектываў і з'ездаў палітычных партый, якія вылучылі свае кандыдатуры.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

**УП «Минский городской центр недвижимости»**

**ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже здания многофункционального, принадлежащего УП «Завод точного машиностроения «Планар-ТМ» (металлический склад общей площадью 193,9 кв. м, инв. № 500/С-47118), расположенного по адресу: г. Минск, Партизанский проспект, 2.

Начальная цена – 386 783 000 белорусских рублей.

Отвод земельного участка будет осуществляться в установленном порядке Минской городской землеустроительной и геодезической службой.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 38 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение 2-х месяцев и 25 календарных дней с даты проведения аукциона. **Аукцион состоится 08 сентября 2008 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.** Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 05 сентября 2008 года до 16.45 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

**Телефоны для справок: (017) 227 48 36, 227 40 22.**

УНП 190398583

## З нядзелі — кароткачасовае пагаршэнне надвор'я

Сіноптыкі прагназуюць з нядзелі кароткачасовае пагаршэнне надвор'я. Аб гэтым паведамілі ў Рэспубліканскім гідраметэацэнтры.

У суботу будзе яшчэ цёпла, пераважна без ападкаў, але ўжо ў нядзелю сітуацыя зменіцца. Надвор'е будзе вызначацца тылавой часткай цыклону з цэнтрам у Ленінградскай вобласці. На большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць дажджы, месцамі навальніцы.

Днём тэмпература паветра складзе 16—23 градусы цяпла, уначы — плюс 10—17 градусаў. Толькі на ўсходзе Гомельскай і Магілёўскай абласцей днём паветра прагрэецца да 25—27 градусаў. У панядзелак, 25 жніўня, пахаладнее ўжо на ўсёй тэрыторыі Беларусі, паўсюдна пройдуць дажджы.

Але сіноптыкі запэўнілі, што лета яшчэ не скончылася і гэта пахаладанне часовае. Так, з аўторка зноў чакаецца паступовае паляпшэнне надвор'я. У сераду і чацвер тэмпература паветра павысіцца да 20—25 градусаў.

**Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.08.2008 г.**

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 111,00 |
| 1 еўра | 3 135,36 |
| 1 латвійскі лат | 4 458,29 |
| 1 літоўскі літ | 907,98 |
| 1 фунт стэрлінгаў | 3 940,08 |
| 1 польскі злоты | 949,40 |
| 1 расійскі рубель | 86,98 |
| 1 украінская грыўня | 456,78 |
| 1 шведская крона | 334,85 |
| 1 швейцарскі франк | 1 935,63 |

08158>
9771990763008

**БЕЛАРУСБАНК**

**Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»,**

*расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,*

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 29 АВГУСТА 2008 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:**

***1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.***

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 27 августа), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 29 августа) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах — областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

**Дата окончания приема бюллетеней — 27 августа 2008 года.**

**Телефоны для справок: (8 017) 218 84 38, 218 87 72.**

УНП 100325912.

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДИТ АУКЦИОННЫЕ ТОРГИ**

по продаже:

производственных баз (в т.ч. здания, сооружения и др.), расположенных:

- Минская область, г. Столбцы, ул. Зеленая, 58 (имеется ж/д ветка). Пл. зем. уч. 3,5164 га;
- Гродненская обл., Ошмянский р-н, д. Буденовка (54 км. до г. Вильнюс). Пл. зем. уч. – 3,6 га;
- Брестская обл., Лунинецкий р-н, д. Намокрово, ул. Намокровская, 20. Пл. зем. уч. 2,8330 га;

объектов недвижимости:

- 3-этажного кирпичного здания 1993 г.п., г. Минск, ул. Куйбышева, 19 (л. ЖЗ/К). Пл. зем. уч. – 0,0360 га;
- незавершенного строительством 4-этажного жилого дома (общ. пл. 3 712,56 кв.м.) в д. Копище Минского р-на. Общ. пл. зем. уч. 0,3202 га;

права заключения договоров аренды:

- складских и административных помещений по адресу: Минский район, дер. Б. Тростенец, ул. Западная, 9. Помещения расположены в 3 км от МКАД;
- земельных участков для строительства объектов различного назначения в Воложинском р-не, г. М. Горка, г. Мядель, к.п. Нарочь Мядельского р-на.

**Контактный телефон (8017) 2246134.**
**Сайт в интернете: www.rlt.by**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

## Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў Белпрамбудбанка з 85-годдзем з дня стварэння

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў ААТ «Белпрамбудбанк» з 85-годдзем з дня яго стварэння.**

У віншаванні гаворыцца, што гісторыя гэтага банка непарыўна звязана са станаўленнем фінансава-крэдытнай сістэмы Беларусі. Ён заўсёды актыўна ўдзельнічаў у вырашэнні стратэгічных задач развіцця айчыннай эканомікі. Сёння Белпрамбудбанк адыгрывае важную ролю ў рэалізацыі прыярытэтных нацыянальных праектаў, крэдытаванні галінаў народнай гаспадаркі, фінансаванні буйных інвестыцыйных праектаў, умацаванні міжнародных фінансавых сувязяў, прыцягненні ў Беларусь замежных інвестыцый, забеспячэнні банкаўскімі паслугамі насельніцтва.

Аляксандр Лукашэнка выказаў перакананасць, што адзін са старэйшых банкаў краіны і ў далейшым будзе прыкладам стабільнасці і надзейнасці, першакласным, універсальным, канкурэнтаздольным фінансавым інстытутам.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Прэзідэнт Беларусі павіншаваў губернатара Пскоўскай вобласці з днём нараджэння

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў губернатара Пскоўскай вобласці Расійскай Федэрацыі Міхаіла Кузняцова з 40-годдзем з дня нараджэння.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Першы самазвал «БелАЗ» сабраны на Урале

**Губернатар Свярдлоўскай вобласці Э. Росель паведаміў Прэзідэнту нашай краіны Аляксандру Лукашэнку аб зборы першага кар'ернага самазвала «БелАЗ» серыі 7547 у горадзе Ніжні Тагіл.**

У пісьме свярдлоўскага губернатара, у прыватнасці, гаворыцца: «Сумесная работа РУП «БелАЗ» і ААТ «Уралвагонзавод» дае практычныя вынікі і з'яўляецца яркім прыкладам рэалізацыі «Плана мерапрыемстваў па развіцці супрацоўніцтва паміж Урадам Свярдлоўскай вобласці Расійскай Федэрацыі і Урадам Рэспублікі Беларусь на 2008—2009 гады». Упэўнены, што далейшыя эканамічныя і культурныя сувязі Беларусі і Свярдлоўскай вобласці будуць паспяхова і плённа развівацца».

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Наглядальнікі ад АБСЕ будуць прысутнічаць пры рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты на пасяджэннях акруговых выбаркамаў

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Устанаўліваецца дакладнасць звестак, названых у гэтых дакументах, уключаючы асабістыя даныя тых, хто балаціруецца, дэкларацыі аб іх даходах і маёмасці. Спісы зарэгістраваных кандыдатаў будуць вядомы 29 жніўня. З гэтага ж дня пачнецца перыяд перадвыбарнай агітацыі і прапаганды.

Лідзія Ярмошына канстатавала, што незарэгістраваныя кандыдаты маюць права ў трохдзённы тэрмін падаць скаргу на адмову ў рэгістрацыі ў Цэнтрвыбаркам. Скаргі, якія не патрабуюць дадатковай праверкі, Цэнтральная камісія разглядае ў трохдзённы тэрмін, а астатнія — у дзесяцідзённы.

Нізкая актыўнасць пры вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў у ходзе бягучай выбарчай кампаніі можа негатыўна паўплываць на ўдзел выбаршчыкаў у працэсе галасавання.

Нагадаем, што ў Беларусі ў ходзе сёлетніх выбараў зафіксавана толькі 365 прэтэндэнтаў на званне кандыдата ў дэпутаты, у той час як у мінулую выбарчую кампанію іх было больш як 600.

«Такая нізкая актыўнасць вылучэнцаў не пабуджае выбаршчыкаў цікавіцца палітычнай кампаніяй, а значыць, прыйсці на ўчасткі для галасавання», — лічыць Лідзія Ярмошына. Тым не менш, дадала яна, «змяншэнне гэтага «палітычнага градуса» адбылося па натуральных прычынах. Гэта не навязаная кімсьці воля, а адпаведнае сацыяльна-палітычнае развіццё грамадства».

На думку кіраўніка Цэнтрвыбаркама, на гэтым этапе беларускае грамадства знаходзіцца менавіта на такім перыядзе палітычнай раскладкі сілаў. «Магчыма, у наступным годзе гэта раскладка зменіцца, але мы праводзім выбары тады, калі павінны іх праводзіць згодна з заканадаўствам, а не калі выспелі нейкія перадумовы», — заявіла Лідзія Ярмошына.

Разам з тым старшыня Цэнтрвыбаркама пераканана, што парламенцкія выбары адбудуцца. «Нават удзел толькі аднаго кандыдата ў акрузе іх не зрывае, і дэпутат можа быць выбраны», — адзначыла яна.

Прадстаўнікі 8 палітычных партый накіраваны ў склад Цэнтральнай выбарчай камісіі Беларусі ў якасці яе членаў з правам дарадчага голасу. У ліку гэтых партый — Ліберальна-дэмакратычная, Кампартыя Беларусі, Аграрная, Партыя камуністаў Беларуская, БНФ, Аб'яднаная грамадзянская партыя, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада), Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці.

Як адзначыла старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына, на пасяджэнні Цэнтральнай камісіі 22 жніўня ўпершыню ў ходзе цяперашняй выбарчай кампаніі рэалізаваны нормы дэкрэта № 13 ад 24 чэрвеня 2008 года: у пасяджэнні прынялі ўдзел прадстаўнікі палітычных партый з правам дарадчага голасу. На думку Лідзіі Ярмошынай, «гэта вельмі важны палітычны статус». Згодна з дэкрэтам, прадстаўнікі палітычных партый у ЦВК атрымліваюць права выступаць на пасяджэннях, уносіць у парадак дня і задаваць удзельнікам пытанні, удзельнічаць у дыскусіях. Яны не маюць права толькі галасаваць на пасяджэннях ЦВК, рабіць ад імя Цэнтральнай камісіі паведамленні і праводзіць праверкі.

Нагадаем, што дэкрэт № 13 прадастаўляе права палітычным партыям, якія вылучылі на з'ездзе кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, накіроўваць у Цэнтрвыбаркам аднаго свайго прадстаўніка з правам дарадчага голасу.

**БЕЛТА.**

## Наркадылера арыштавалі

26-гадовы гамяльчанін выбраў сабе лёгкі спосаб заробкаў — збыт наркотыкаў. І рабіў гэта ён у месцах масавага адпачынку моладзі, не зважаючы на тое, што гэта небяспечная і крымінальная справа. У чарговы раз продажу дурману яго затрымала міліцыя. Пасля арышту ў кватэры хлопца службова-вышуковы сабака ўнюхаў тайнік з наркотыкамі: 76 грамаў амфетаміну, 75 — гераіну і 12,5 грама гашышу. Ды яшчэ, як паведаміў нам супрацоўнік прэс-цэнтра УУС Гомельскага аблвыканкама Андрэй Кітаеў, 550 доз іх у расфасоўцы прыблізным коштам 20 мільёнаў рублёў. Нясоладка зараз будзе наркадылеру.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## Сярод белага дня

У Баранавічах з будаўнічай пляцоўкі па вул. Фабрычнай мясцовы беспрацоўны вырашыў сярод белага дня ўкрасці бетонамяшалку, будаўнічы інструмент і некалькі дзесяткаў метраў электракабеля, але нарваўся на нарад адзела аховы. І ў выніку — крымінальная справа.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ**

## Святкаванне 65-годдзя з дня Перамогі павінна адрозніваццa ад мерапрыемстваў 60-гадовага юбілею новымі ідэямі і падыходамі

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Паколькі свята вызвалення — добрая падстава для дэманстрацыі ў тым ліку і эканамічных дасягненняў, прапануецца з 29 чэрвеня па 5 ліпеня наступнага года правесці Нацыянальную выставу-кірмаш спажывецкіх тавараў, выраблены у Беларусі. Па традыцыі, беларусы і госці краіны змогуць разлічваць і на кірмаш народнай творчасці «Горад майстроў», і на сцэнічныя выступленні з выкарыстаннем лепшых пляцовак сталіцы — Палаца Рэспублікі і Кастрычніцкай плошчы. Мяркуецца, што ваенны парад стане больш відовішчным і запамінальным — з выкарыстаннем узораў сучаснай ваеннай тэхнікі. З 3 па 5 ліпеня святочныя мерапрыемствы павінны прайсці па ўсіх рэгіёнах рэспублікі ў рэжыме «нон-стоп» і завяршыцца грандыёзным гала-канцэртам «Мы перамаглі!».

Як адзначыў на пасяджэнні прэм'ер-міністр, вельмі важна, каб кожны з членаў аргкамітэта — кіраўнікоў міністэрстваў — уяўляў канкрэтныя мэты і задачы маштабнай работы. Асноўным прынцыпам усіх дзеянняў застаецца адзін: перагляду вынікаў Вялікай Айчыннай быць не можа, галоўным абавязкам — рабіць усё належнае для паляпшэння ўмоў жыцця ветэранаў, адзіным памкненнем — захаванне ў свядомасці грамадзян, у першую чаргу, маладога пакалення, сапраўднага ўяўлення аб вялікай перамозе савецкага народа ў тагачаснай вайне. Лозунг «Ніхто не забыты, нішто не забытае» павінен стаць вызначальным у комплексе мерапрыемстваў, якія будуць праводзіцца і на рэспубліканскім, і на мясцовым узроўнях.

Неабходна дайсці да кожнага ветэрана і вырашыць пры неабходнасці сацыяльна- медыцынскія аспекты іх жыцця, а таксама прывесці ў адпаведны стан кожны помнік, могілкі, заўважыў Сяргей Сідорскі. Дарэчы, цяпер у Беларусі пражывае 55,4 тысячы ветэранаў Вялікай Айчыннай, у тым ліку 41 тысяча інвалідаў і ўдзельнікаў вайны, 12,5 тысячы ўзнагароджаных работнікаў тылу, звыш 1 тысячы блакаднікаў Ленінграда і менш за 1 тысячу чалавек, якія бралі ўдзел у будаўніцтве абарончых збудаванняў і іншых аб'ектаў, ўваходзілі ў склад спецыяльных фарміраванняў па размініраванні тэрыторый і аб'ектаў у 1943—45 гадах.

Колькасць ветэранаў працягвае няўхільна скарачацца, і сёння дзяржава імкнецца праяўляць аб іх максімальны клопат. Так, узровень пенсійнага забеспячэння гэтай катэгорыі вышэйшы, чым у іншых, яны маюць права на бясплатнае забеспячэнне лекамі, тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі, першачарговае санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне. Калі гэта права не выкарыстана, выплачваецца грашовая кампенсацыя ў памеры 10 базавых велічынь. Для ветэранаў прадугледжаны льготы па аплаце за камунальныя паслугі, паслугі сувязі і некаторыя іншыя паслугі. Аднак гэтыя людзі часта маюць патрэбу ў рамонце жылля, надворных пабудоў, у апрацоўцы прысядзібных участкаў, забеспячэнні палівам, нарыхтоўцы гародніны на зіму... Паводле вынікаў абследавання ўмоў жыцця ветэранаў Вялікай Айчыннай мясцовым выканаўчым і распарадчым органам прапануецца распрацаваць мерапрыемствы па аказанні неабходнай дапамогі, забеспячэнні аб'ектыўных патрэб, для чаго прадугледзець і адпаведнае фінансаванне ў мясцовых бюджэтах на 2009 год. Не павінны застацца ўбаку прадпрыемствы і арганізацыі, у якіх калісьці працавалі ветэраны.

Будзе падрыхтаваны і праект указа аб аказанні аднаразовай матэрыяльнай дапамогі ветэранам ВАВ і асобным катэгорыям грамадзян, якія пацярпелі ад наступстваў вайны. Згодна з праектам, памер такой дапамогі зафіксуецца ў межах бюджэту пражытковага мінімуму. Аднаразовыя выплаты могуць прадугледзець і аблвыканкамы з мінскім гарвыканкамам.

Як адзначалася на пасяджэнні, сёння няма ніводнай незадаволенай заявы ад ветэранаў вайны аб устаноўцы стацыянарнага тэлефона. А ў перыяд з 1 па 5 ліпеня 2009 і з 7 па 11 мая 2010 года для інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай прадугледжваюцца права бясплатнага карыстання паслугамі стацыянарнай тэлефоннай сувязі, ільготы па забеспячэнні паслуг міжнароднай сувязі.

Каля 110 тысяч ветэранаў, якія пражываюць на тэрыторыі краіны і за яе межамі, атрымаюць у святочныя дні юбілейныя медалі.

Ваенны рэпертуар загучыць ва ўсіх тэатрах, кінатэатрах, а тэлебачанне прадэманструе не толькі добра вядомыя кінастужкі аб вайне, але прапануе і прэм'ерныя паказы. Вытворчасць 2-серыйнага мастацкага фільма «Дняпроўскі рубеж» і мастацкага фільма «Снайпер» ужо завяршаецца. На красавік, май і чэрвень запланавана правядзенне творчай акцыі «Пакланімся вялікім тым гадам».

Сяргей Сідорскі звярнуў увагу аргкамітэта на неабходнасць больш актыўнага адкрыцця мемарыяльных дошак у замежжы, найперш у краінах СНД. Пакуль падобная работа праводзіцца ў Германіі і Польшчы.

13 мільярдаў рублёў, атрыманыя з бюджэту не толькі Беларусі, але і краін Садружнасці, на капрамонт і рэканструкцыю мемарыялу «Брэсцкая крэпасць-герой», ужо асвоены. За дзесяцігоддзе значныя работы выкананы на 28 тамтэйшых аб'ектах. Сёлета з рэспубліканскага бюджэту выдаткавана 2,2 мільярда рублёў на капрамонт штыка-абяліска. Аднак па выніках абследавання будынкаў мемарыяла, рамонт якіх праводзіўся ў 60-я, плануецца выканаць яшчэ шэраг работ.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## БЕЛАРУСЬ І РАСІЯ ЗАСТАЮЦЦА СТРАТЭГІЧНЫМІ ПАРТНЁРАМІ УКРАІНЫ

**Аб гэтым заявіў учора на прэс-канферэнцыі, прымеркаванай да Дня Незалежнасці Украіны, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Украіны ў Рэспубліцы Беларусь Дзмітрый ЛІХАВЫ.**

Пра гэта было заяўлена Украінай пры вызначэнні яе знешнепалітычнай дзейнасці яшчэ ў 1993 годзе, падкрэсліў пасол, і ніякіх кардынальных зменаў тут не адбылося і адбыцца не можа, бо суседзі ёсць суседзі. Украіна надзвычай зацікаўленая ў супрацоўніцтве з Беларуссю ва ўсіх сферах, і апошнім часам яно расце.

«Канкурэнцыя тут можа быць на карысць толькі на эканамічным рынку, — лічыць Дзмітрый Ліхавы. — Ва ўсім астатнім трэба аб'ядноўваць намаганні».

Разам з тым пасол заўважыў, што Украіна аддае перавагу двухбаковаму супрацоўніцтву, асабліва ў гуманітарнай сферы. «СНД узнікла на абломках Савецкага Саюза, і пакуль не пазбавіцца адмоўнай спадчыны, наўрад ці будзе эфектыўна працаваць», — сказаў ён. Пасол не выключыў, што на бліжэйшым пасяджэнні Вярхоўнай Рады некаторыя блокі будуць ініцыяваць пытанне аб выхадзе Украіны з СНД, але наўрад ці такое рашэнне будзе прынятае. Украіна з'яўляецца асацыяваным членам Садружнасці, краіны якой з'яўляюцца яе прыярытэтнымі партнёрамі ў эканамічнай сферы. Як прыклад, пасол прывёў праект з нафтаправодам «Адэса—Броды», які, па яго словах, павінен забяспечыць энергетычную бяспеку краінам Паўднёвага Усходу і Паўночнага захаду Еўропы. Беларусь таксама можа ўзяць удзел у гэтым праекце, заўважыў спадар Ліхавы.

Гандлёва-эканамічныя адносіны Украіны і Беларусі знаходзяцца пад уздзеяннем сусветных працэсаў. Летась Украіна далучылася да Сусветнай гандлёвай арганізацыі, наступствам стала зняцце многіх абмежаванняў у знешнім гандлі. Так, на 30 працэнтаў узрос аб'ём паставак металу за межы краіны, зменшыўся кошт аўтамабіляў, стаў больш адкрытым рынак, большым выбар тавараў. Узраслі прамыя інвестыцыі ў эканоміку краіны і складаюць цяпер больш за 3,4 млрд долараў ЗША. За апошнія паўгода на 45 працэнтаў узраслі даходы насельніцтва, умацавала свае пазіцыі грыўна. Даход на аднаго чалавека застаецца пакуль невысокім — 1075 грыўнаў, але і ён паступова павялічваецца. Намінальны сярэднямесячны заробак ва Украіне вырас на 6 працэнтаў і складае цяпер 1200 грыўнаў. Гэта лічба не адлюстроўвае рэальнага заробку, сказаў пасол, бо Украіне пакуль не ўдалося пазбавіцца ад зарплаты ў канвертах.

Пра тое, што ўкраінцы сталі больш плацежаздольнымі, сведчыць рост імпарту, у тым ліку з Беларусі ва Украіну. Украінскія фермеры, малы і сярэдні бізнэс зацікаўленыя ў беларускай сельгастэхніцы, гарады актыўна закупляюць беларускія аўтобусы, значна ўзраслі пастаўкі з Беларусі энерганосьбітаў. Беларусь займае 5-е месца па экспарце тавараў у знешне-эканамічнай дзейнасці Украіны і 7-е месца па імпарце.

Праблемным застаецца міжрэгіянальнае супрацоўніцтва паміж краінамі. Пакуль толькі пяць абласцей Украіны з 25 стварылі працоўныя групы і сапраўды супрацоўнічаюць з беларускімі рэгіёнамі. Гэта можа тлумачыцца тым, што ва Украіне недастаткова інфармацыі пра Беларусь, пра яе эканоміку і жыццё. «На жаль, — заўважыў пасол, — у СМІ нашых краін больш палітыкі, чым адлюстравання рэальнага жыцця суседзяў».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## «Белыя плямы» гісторыі павінны мець колер

**На базе 120-й гвардзейскай асобнай механізаванай брыгады ў Мінску адбылася прэзентацыя чарговай кнігі беларускай пісьменніцы Наталлі Голубевай. У кнігу ўваходзяць дзве гістарычныя аповесці — «Радимичи» і «Земля непокоренная», прысвечаныя воінству, доблесці і гонару нашых продкаў. Гэта падзея адбылася невыпадкова. Аўтару вельмі хацелася, каб кніга, напісаная аб моцных духам людзях, якія жылі на тэрыторыі Беларусі ў старажытнасці, баранілі сваю зямлю ад ворага, берaглі яе, была прадстаўлена сучасным вайскоўцам, для якіх такія паняцці, як радзіма і гонар, не пусты гук.**



**— Наталля Аляксандраўна, пазнаёмце, калі ласка, у некалькіх словах вашых будучых чытачоў з новай кнігай.**

— Дылогія вяртае нас у глыбокую старажытнасць, да перыяду родаплемянных адносінаў. На тэрыторыі Беларусі ў IX—X стагоддзях пражывала тры племені: крывічы, дрыгавічы і радзімічы. Апошняе, якое мела пасяленні па Сожы і Дняпры, там, дзе цяпер размяшчаецца Гомельская і частка Магілёўскай абласцей, мела ўнікальныя вайсковыя, рэлігійныя традыцыі, цікавы ўклад жыцця, выключныя веды аб прыродзе, зорным небе. На старонках кнігі я расказваю аб ваенных паходах і перамогах радзімічаў, аб складаных перыядах, калі трэба было рабіць цяжкі выбар, іх уменні будаваць свае адносіны з суседнімі плямёнамі, Кіеўскай Руссю, быць добрымі дыпламатамі. Абедзве аповесці звязаныя агульнымі героямі, месцам дзеяння. Маецца тут месца і глыбокім чалавечым пачуццям, каханню.

У кнізе я пастаралася акумуляваць увесь матэрыял, навуковы, археалагічны, які быў напрацаваны ва ўсе перыяды вывучэння звестак аб племені радзімічаў, у першаю чаргу беларускімі навукоўцамі. Гэта і сапраўдныя дакументы, якія датычацца побыту, культуры і ўзаемаадносінаў радзімічаў. На тэрыторыі Беларусі яшчэ шмат курганоў, якія чакаюць свайго часу, свайго даследчыка і захоўваюць шмат сакрэтаў.

**— На якую аўдыторыю разлічаны вашы аповесці?**

— Для таго, каб у даступнай літаратурнай форме паказаць людзям, што у нас шмат «белых плямаў» у гісторыі, я наўмысна пакінула на нейкі час сваю навуковую работу. Імкнуся пісаць так, каб мяне зразумелі ўсе. Бо нашу гісторыю, перакананa, павінны ведаць усе, як дзеці, так і дарослыя.

**— Што галоўнае вы хацелі сказаць сваім чытачам?**

— Мая задача, як гісторыка, як пісьменніка — па крупінках вяртаць нашу гістарычную памяць, якая дапамагла б паказаць людзям, што беларуская нацыя ўнікальная ў сваіх традыцыях, што патрыятызм людзей, якія стагоддзямі жывуць на беларускай зямлі, сваімі каранямі адыходзіць у глыбокую старажытнасць.

Учынкі нашых продкаў даказваюць, што беларусы — моцная нацыя з цікавымі традыцыямі і з трывалымі каранямі. Гэта людзі, якія ніколі ні на каго не нападалі, а толькі адбівалі напады ворагаў, абараняючы сваю зямлю, прыкладалі намаганні, каб спыніць войны, агрэсію. Людзі, якія ўмелі не толькі ваяваць, але і самаадданa кахаць.

**— А ці можна прачытаць вашу кнігу на беларускай мове?**

— Планую перакласці цыкл «Земля непокоренная» на беларускую мову, але крышку пазней. Бо сёння ідзе праца па перакладзе яе на англійскую мову. Хочацца, каб іншаземцы фарміравалі меркаванне аб нашай краіне праз яе гісторыю і аб Беларусі даведалася як мага больш людзей у свеце. Пераклад на беларускую мову рабіць планую сама, бо вельмі люблю нашу родную мову і, на маю думку, ніхто, акрамя самога аўтара, не зможа перадаць падзеі, пачуцці, фарбы, як гэта было задумана.

**— Якія «белыя плямы» гісторыі будуць адкрытыя для беларусаў у хуткім часе?**

— Праектаў вельмі шмат. Наступны гістарычны раман будзе прысвечаны Бабруйскай крэпасці. Ён ужо знаходзіцца на стадыі завяршэння. Усе ведаюць Брэсцкую крэпасць, а вось пра Бабруйскую мала хто чуў. Яна адыграла важную ролю ў стратэгічным плане ў вайне 1812 года. Падчас яе будаўніцтва быў праяўлены не меншы патрыятызм беларускіх людзей, чым у іншыя перыяды нашай гісторыі. Гэта таксама быў і вельмі складаны перыяд у лёсе беларусаў, якія пасля апошняга падзелу Рэчы Паспалітай апынуліся перад складаным выбарам. А выбар, як вядома, рабіць нялёгка ва ўсе часы. Самае галоўнае — не памыліцца: заставацца верным сабе і сваім прынцыпам.

У бліжэйшых планах напісаць кнігу аб беларускіх разведчыках у перадваенны перыяд Другой сусветнай вайны. Над унікальнымі матэрыяламі ўжо пачала працаваць у архівах, рыхтую праект аб падзеях у Смаргоні перыяду Першай сусветнай вайны. Хочацца расказаць чытачу аб яшчэ нераскрытых старонках нашай гісторыі. Планаў шмат. Галоўнае — усё паспець.

**Надзея ДРЫЛА.**

## ЗАЛАТЫ ДУБЛЬ БЕЛАРУСКІХ ВЕСЛЯРОЎ

***(Пачатак тэмы на 1-й стар.)***

Правальнае выступленне Рыты Туравай у спартыўнай хадзе на 20 км нашы пастараліся хутка забыць. Хоць кітайскае тэлебачанне на адным са спартыўных каналаў раз-пораз паўтарала сцэну, калі беларуска прама на дыстанцыі засоўвала два пальцы ў рот, імкнучыся такім чынам ачысціць страўнік. На шчасце, гэтая сцэна не знайшла адпаведнага месца на старонках ужо вядомай спартыўнай укладкі OLYMPIA нацыянальнай штотыднёвай газеты на англійскай мове CHINA DAILY, дзе побач з матэрыяламі аб чэмпіёнах і прызёрах знаходзяць месца «гарачыя» факты альбо алімпійцы-выскачкі. Так рэдакцыя выдання цэлы газетны разварот фармату A2 прысвяціла беларускай камандзе па баскетболе, якая выбыла з барацьбы за медалі на стадыі чвэрцьфіналу. Асабліва тут смакуецца тэма расійска-грузінскага канфлікту. У інтэрпрэтацыі Алімпійскіх гульняў самай удалай інфармацыйнай падставай для раскруткі гэтай тэмы лічыцца вочны паядынак спартсменаў гэтых краін. Апошнім з такіх была паўфінальная схватка барцоў-вольнікаў (84 кг) паміж грузінам Рэвазі Міндарашвілі і расіянінам Георгіем Катоевым. Прынцыповую перамогу атрымаў грузінскі барэц, які ў выніку стаў алімпійскім чэмпіёнам. Зрэшты, алімпійскія ідэалы і вялікая палітыка тут могуць быць зусім не звязаны. Дастаткова ўспомніць падзеі двухтыднёвай даўніны: жаночую стральбу з пнеўматычнага пісталета на 10 м, калі на п'едэстале аказаліся кітаянка Веньюн Гуо, расіянка Наталля Падзерына і грузінка Ніно Салуквадзэ. Як замежныя журналісты ні круцілі палітычны момант, каб выцягнуць з грузінкі гнеўныя пасылы ў адрас Расіі, нічога не атрымалася. Бронзавая медалістка Салуквадзэ адрэзала: спартсмены не павінны быць марыянеткамі ці закладнікамі ў руках палітыкаў. Відавочна, што яе словы сталі адлюстраваннем той дружалюбнай атмасферы, якая склалася і ў вёсцы для журналістаў, і ў алімпійскай вёсцы для спартсменаў. Больш за тое, сустрэча славян ці прадстаўнікоў былога Саюза тут заўсёды суправаджаецца калі не моцнымі поціскамі рук, то абавязковым вітаннем і кароткай размовай.

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.**




Беларускі дзесяціборац Андрэй Краўчанка ўзяў серабро ў Пекіне.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### НАТА ЎВОДЗІЦЬ БАЯВЫЯ КАРАБЛІ Ў АКВАТОРЫЮ ЧОРНАГА МОРА



**Два караблі НАТА ўвайшлі ў акваторыю Чорнага мора для «забеспячэння правядзення гуманітарнай акцыі па дастаўцы грузаў Грузіі», паведаміла высокапастаўленая крыніца ў ваенна-марскіх кругах Турцыі.**

«Нямецкі фрэгат «Любек» (на фота) і іспанскі «Адмірал Хуан дэ Барбон», якія ўвайшлі ў акваторыю Чорнага мора, уваходзяць у склад групоўкі караблёў НАТА, якая будзе нарошчвацца ў бліжэйшыя дні», — сказала крыніца. Таксама стала вядома, што ў склад групоўкі караблёў НАТА ў Чорным моры ўвойдзе каля сямі суднаў. У асноўным, гэта ракетныя фрэгаты. Групоўка будзе фарміравацца на працягу бліжэйшых дзён у заходняй частцы Чорнага мора. Акрамя таго, крыніца не выключыла, што для забеспячэння гуманітарнай аперацыі могуць быць прыцягнутыя караблі Балгарыі і Румыніі, а таксама Украіны.

### МІНАБАРОНЫ РФ ЗАКУПЛЯЕ НАДЗІМАНЫЯ ЗЕНІТНЫЯ КОМПЛЕКСЫ



**Адно з НВП выконвае заказ расійскага ваеннага ведамства на пастаўку надзіманых макетаў зенітна-ракетных комплексаў С-300.**

Акрамя закупкі макетаў ЗРК Мінабароны РФ працягвае фінансаваць даследча-канструктарскія працы НВП па стварэнні іншых перспектыўных узораў маскіравальнай тэхнікі. У прыватнасці, вядзецца распрацоўка надзіманых макетаў танкаў і баявых самалётаў, у тым ліку знішчальніка Су-27.

### КАРСАРЫ ЎСХАДЗІЛІСЯ: ЗАХОПЛЕНА ЧАЦВЁРТАЕ СУДНА ЗА ДВА ДНІ



**Каля ўзбярэжжа Самалі адбыўся яшчэ адзін напад піратаў. Чарговай ахвярай бандытаў стаў нямецкі танкер.**

Гэта ўжо чацвёртае судна, якое стала здабычай самалійскіх піратаў у гэтым раёне Сусветнага акіяна за нейкія два дні. Раней ва ўладзе піратаў таксама апынуліся малайзійскі і японскі танкеры і нямецкі сухагруз. Усяго на чатырох суднах знаходзяцца 97 маракоў.

### УКРАІНСКІЯ ЎЛАДЫ ВЫЯВІЛІ Ў АДЭСЕ ЯКУДЗА

**У Адэсе з'явілася якудза — японская мафія. Аб гэтым, як паведамляюць «Украінскія навіны», заявіў кіраўнік украінскага МУС Юры Луцэнка.**

Колькі чалавек уваходзяць у мафіёзную групоўку, якімі відам і злачыннай дзейнасці яны займаюцца, ён не ўдакладніў. З'яўленне гэтай групоўкі, паводле слоў Луцэнкі, стала следствам «распаўзання нелегальнай міграцыі» ва Украіне.

### ЛАЗЕРНЫ АЛКАТЭСТАР ПАЧУЕ СПІРТНОЕ НАВАТ ПРАЗ ЛАБАВОЕ ШКЛО

**На ўзбраенне ГІБДР Расіі ўжо ў наступным годзе паступіць лазерны алкатэстар.**

Гэты прыбор здольны «пачуць» пах спіртнога ў салоне машыны за сто метраў на хуткасці да 170 кіламетраў у гадзіну.

## Абзац

■ **Налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Беларусі ў ліпені гэтага года склала Br923 тыс. 277. Гэты паказчык у чэрвені складаў Br892 тыс. 423. Налічаная сярэдняя заработная плата рабочых і служачых у ліпені гэтага года склала Br941 тыс. 130 (у чэрвені яна была Br911 тыс. 265).**

■ Польскі дальнабойшчык спрабаваў за 100 еўра падкупіць беларускі памежны нарад. У пункце пропуску «Казловічы» пры афармленні аўтапоезда «Сканія» з прычэпам, які ехаў з Польшчы, у спальным салоне пад коўдрай памежнікі выявілі грамадзянку Беларусі без дакументаў. За недагляд кабіны паляк і прапанаваў грошы. Праводзіцца разбор у дачыненні да парушальніцы мяжы, у дачыненні да вадзіцеля ўзбуджана крымінальная справа.

■ **Следчы камітэт Полацкага РАУС узбудзіў крымінальную справу па факце крадзяжу 150 т калійных угнаенняў службовай асобай аднаго з полацкіх раённых прадпрыемстваў. Падазроны ўзяты пад варту.**

■ Грузін спрабаваў трапіць у Беларусь па нацыянальным пашпарце грамадзяніна Украіны. Чужы пашпарт з уклееным у яго сваім фотаздымкам ён прад'явіў на лініі пашпартнага кантролю ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск».

■ **Супрацоўнікі міліцыі ў Магілёве выявілі больш за 105 тон нелегальнай мінеральнай вады «Нарзан» і «Есентукі» ўкраінскай вытворчасці. Кіраўнік прадпрыемства «Гандлёвы дом мінеральныя воды» набыў іх ва Украіне для рэалізацыі ў гандлёвых пунктах Магілёва. Тавар агульным коштам больш за Br250 млн не меў акцызных марак Беларусі. Не было дазволу на рэалізацыю вады. Вядзецца праверка, у тым ліку і якасці вады.**

## Поўны абзац

■ **Муж і жонка з Вісканcіна выйгралі $1,4 млн, купіўшы адразу 4 латарэйныя білеты. Спачатку кожны з іх выйграў па $350 тыс. адначасова. Яны не адразу заўважылі, што маюць на руках яшчэ два білеты, купленыя напярэдадні. І тыя таксама аказаліся выйгрышнымі. Усе чатыры шчаслівыя білеты былі купленыя ў розных месцах, але мелі адзін і той жа нумар.**

■ Некалькі дзесяткаў маладых чарапашак сталі «наведвальнікамі» рэстарана на поўдні Італіі. Чарапашкі толькі што нарадзіліся на ўзбярэжжы ў Калабрыі і збіліся са шляху: прыцягнутыя яркім святлом, яны пайшлі не ў мора, а проста пад ногі здзіўленых наведвальнікаў установы. Звычайна святло, адбіваючыся ў вадзе, дапамагае чарапашкам не збіцца са шляху і знайсці дарогу да мора. Але бываюць выпадкі, калі яны ідуць на святло аўтамабільных фараў ці іншыя яркія плямы і ў выніку гінуць ад стомы і абязводжання. На гэты раз людзі прыйшлі на дапамогу і аднеслі нечаканых наведвальнікаў у мора.

■ **Дэвід Хейс з амерыканскага штата Паўночная Караліна злавіў 10-кілаграмовага сома на цацачную вудачку сваёй пяцігадовай унучкі. Маленькую вуду ён падарыў дзяўчынцы зімой, яна паспела самастойна злавіць некалькі акунёў у невялікім азярцы, а затым прапанавала вуду дзядулю. Нечакана на яе клюнула рыбіна. Хейсу спатрэбілася паўгадзіны, каб выцягнуць здабычу. Гэта быў самы вялікі сом, злоўлены за ўсю гісторыю штата.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

## Доктар адкажа
## Ёсць пытанні? Тэлефануйце...

**На будучым тыдні дзяжурыць на тэлефоннай «гарачай лініі» Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:**

**25 жніўня** — галоўны ўрач Мінскага абласнога радзільнага дома Пётр Леанідавіч МАСЬКО.

**26 жніўня** — намеснік галоўнага ўрача Рэспубліканскага клінічнага шпіталя інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны Сяргей Рыгоравіч ГУСЕЎ.

**27 жніўня** — галоўны спецыяліст упраўлення па ліцэнзаванні Міністэрства аховы здароўя Генадзь Мікалаевіч РЭЎНОЎ.

**28 жніўня** — намеснік начальніка аддзела медыцынскай тэхнікі Міністэрства аховы здароўя Андрэй Гедэмінавіч ПЯТРОВІЧ.

**29 жніўня** — галоўны спецыяліст аддзела арганізацыі медыцынскай аховы пры надзвычайных сітуацыях Міністэрства аховы здароўя Уладзімір Міхайлавіч БУДЗЬКО.

У графіку магчымыя змяненні.

## «Гарачая лінія» Упраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (017) 220 20 25

**26 жніўня:**

9.00—12.00 — намеснік галоўнага ўрача Мінскага абласнога процітуберкулёзнага дыспансэра Вольга Леанідаўна ГАРЭНЮК.

14.00—17.00 — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Ігар Віктаравіч ЛАЗАРЧЫК.

**2 верасня:**

9.00—12.00 — загадчык арганізацыйна-метадычнага, кансультацыйнага аддзела Мінскага абласнога наркалагічнага дыспансэра Вячаслаў Уладзіміравіч САЛАДУХА.

14.00—17.00 — загадчык кансультацыйна-метадычнага аддзялення Мінскага абласнога скурна-венералагічнага дыспансэра Вячаслаў Іванавіч РОСЛІК.

### Здароўе на талерцы
## Тапінамбур — сябар дыябетыка

Гэту расліну яшчэ называюць «земляной грушай», бо яе клубні па форме нагадваюць ігрушу. У тапінамбуры шмат вітамінаў і мінеральных соляў (солі калію, цынку, жалеза, крэмнію). Акрамя таго, яго клубні змяшчаюць бялкі, цукры, пекцінавыя рэчывы, арганічныя кіслоты, і, што асабліва каштоўна, раслінны аналаг інсуліну — полісахарыд інулін. Апошні зніжае ўзровень цукру ў крыві, таму тапінамбур выкарыстоўваецца для лячэння і прафілактыкі цукровага дыябету. Рэкамендуецца «земляная груша» пры гіпертаніі і атэрасклерозе, анеміі і тахікардыі, дрэнным зроку і гастрыце, бранхіце і ларынгіце, цыстыце і туберкулёзе, мочакаменнай хваробе і падагры. Рэгулярнае ўжыванне тапінамбуру садзейнічае вываду таксічных рэчываў з арганізма, зніжэнню вагі пры атлусценні, аднаўленню сілаў пры стомленасці. Сок расліны змяшчае шмат кальцыю, таму ён карысны для дзяцей і дарослых, якія пакутуюць ад разбурэння касцей і зубоў.

**АЛАДКІ З ТАПІНАМБУРУ І МОРКВЫ**

*Вам спатрэбіцца: 700 г тапінамбуру, 300 г морквы, 2 яйкі, 100 г мукі, 100 г алею, соль.* Тапінамбур і моркву ачысціць ад лупіны, надзерці на тарцы, дабавіць яйкі, муку, соль. Усё перамяшаць. Выкладваючы атрыманую масу сталовай лыжкай на разагрэтую патэльню з алеем, абсмажваць аладкі з двух бакоў.

**САЛАТА «БАДЗЁРАСЦЬ»**

Свежую капусту нашаткаваць, перацерці з соллю, дадаць моркву і тапінамбур (надзёртыя на буйной тарцы), соль. Усё перамяшаць, заправіць маянэзам. На дзве часткі свежай капусты ўзяць па адной частцы морквы і тапінамбуру.

**ДЫЕТЫЧНАЯ КАВА З ТАПІНАМБУРУ**

Тонка здробненыя клубні заліваюць на 2—3 хвіліны кіпенем, затым ваду зліваюць і прасушваюць тапінамбур сурвэткай, падсмажваюць у духоўцы да густога румянца. Атрыманую масу раздрабняюць у кавамолцы або ў ступцы. Заварваюць і п'юць як звычайную каву.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

## КАПУСТА І РАДЫСКА — ПАБОЛЕЙ І ЧАСЦЕЙ

Японскія даследчыкі сцвярджаюць, што актыўнае ўжыванне садавіны і гародніны, асабліва капусты і радыскі, спрыяе меншай схільнасці да развіцця раку стрававальных органаў.

Медыкі Японіі адсочвалі стан здароўя 39 тысяч мужчын ва ўзросце ад 45 да 74 гадоў на працягу васьмі гадоў. Выявілася, што рызыка ўзнікнення ракавых захворванняў у стрававальнай сістэме зніжаецца на 10 працэнтаў пры павелічэнні штодзённага расліннага рацыёну на 100 грамаў. У мужчын, якія кураць і злоўжываюць алкаголем, і уваходзяць па гэтай прычыне ў групу рызыку па развіцці раку дадзенай лакалізацыі, ужыванне садавіны-гародніны зніжае рызыку ўзнікнення паталогіі на трэць.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ОАО «Минский приборостроительный завод»
### ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже недвижимости, расположенной в г. Минске по пр. Независимости, 58: комплекса зданий корпусов №№ 19, 19а, 40, общей площадью 7 045,3 кв. м.

Начальная цена продажи — **21 058 920 000** рублей РБ с НДС.

Задаток в размере 2 % от начальной цены объекта перечисляется на расчетный счет ОАО «Минский приборостроительный завод» № 3012000620011 в филиале ОАО «БПС-Банк» г. Минск, код 334, УНП 100363840.

Порядок проведения торгов оговорен в условиях проведения аукциона.

**Аукцион состоится 29 августа 2008 года в 13.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 58.** Заявления и необходимые документы принимаются до 17.00 28 августа 2008 г. по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 58, ком. 603.

**Справки по тел. 8 017 293 94 40, факс 8 017 331 41 97.**

# «БЕРАГ ЛЕВЫ, БЕРАГ ПРАВЫ...»



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Усё добра, толькі вось альтанкі не хапае, — уздыхае бабуля, якая прыехала з суседняга раёна ў Дзісну ў паліклініку. — Душна, няма дзе схавацца людзям ад суровага сонца. Здаецца, каб было дзе прысесці, дык з радасцю. А то пакуль датупала з горада, стамілася. Ледзьве ногі валаку, а тут яшчэ трэба стаяць, пакуль транспарт прыплыве.

— Не толькі ад сонца схавацца, але і дождж перачакаць няма дзе, — падтрымлівае яе жанчына, якая стаіць непадалёк. — Не заўсёды ж парасон з сабой носіш...

Паром прычаліў. Загула тэхніка, пакідаючы паром. Людзі сышлі на зямлю. Наступны рэйс праз 30 хвілін, таму жанчыны засталіся чакаць, а я паднялася на паром, дзе мяне гасцінна сустрэлі яго гаспадары: старэйшы матарыст Віктар Пяткоў, матарыст Станіслаў Мышко і матрос па паромнай пераправе Уладзімір Семянюра.

***— Як плацяць? Ці хапае? — цікаўлюся.***

— Не скардзімся. Зарабляем нямнога-нямала, каля 400 тысяч рублёў. У мясцовых гаспадарках зарабляюць і таго менш. Таму ў вёсках людзей становіцца з кожным годам усё менш. Моладзь з'язджае, не хоча тут заставацца.

***— А вы ж не з'ехалі? — цікаўлюся ва Уладзіміра, якому, па выгляду, не больш за 25 гадоў.***

— Я проста люблю Дзвіну, паром. Бацька мой працаваў паромшчыкам, дзядзька. Усё дзяцінства прайшло тут.

Працоўны дзень паромшчыкаў пачынаецца з 7 гадзін раніцы.

— Перавозім людзей з аднаго берага на другі па раскладзе. А вось машыны хуткай дапамогі, міліцыі, пажарных пераплаўляем праз Дзвіну ў любы час сутак. Здаецца, што ламаецца паром. Але самае складанае ў нашай працы не паломкі, а работа з людзьмі. Бо ўсім ніколі не дагодзіш. Некаторыя прыходзяць да берага і патрабуюць: «Паехалі раней!» Добра, адказваю, але што ты сам скажаш, калі прыйдзеш у час, а паром ужо паплыў без цябе. Адным словам, прызвычайваюцца людзі да таго, што мы ходзім па графіку, з цяжкасцю.

— Безумоўна, усе мы людзі: часта здараецца, што чалавеку вельмі неабходна пераправіцца на той бок ракі, спазняецца на рэйсавы аўтобус ці жонка вось-вось нарадзіць павінна. Як не дапамажаш? Перавозім. Акрамя таго, у Дзісне па нядзелях ладзяцца «свінныя» кірмашы, якія працуюць з пяці да сямі гадзін раніцы. Як людзям з суседняга раёна набыць сабе парсючка? Ёсць два варыянты: можна даехаць да Дзісны праз Полацк ці Верхнядзвінск. Але 40 кіламетраў толькі ў адзін бок, згадзіцеся, немаленькая адлегласць, тым больш, калі няма свайго аўтамабіля. Пастаянныя пасажыры ўжо ведаюць нумар мабільнага тэлефона кожнага паромшчыка, і калі ўзнікае неабходнасць, выклікаюць на дапамогу. Так што працуем мы і днём і ноччу.

***— А якая пад'ёмнасць у вашай «машыны»?***

— Дзісненскі паром можа пераправіць з аднаго берага на другі ажно 12 легкавых аўтамабіляў.

Акрамя машын і людзей пасажырамі судна бываюць і жывёлы.

— Пастаянна катаюцца па Дзвіне каты, сабакі. Не раз перавозілі коней, кароў. Але тут да гаспадароў свойскай жывёлы адно патрабаванне: абавязкова мець з сабой венік, шуфель і вядро. Здараецца, што забываюцца ўзяць. І ў гэтай сітуацыі мы прыходзім на дапамогу — арандуем уласны інвентар. Засмечваць сродак перапраўы шалупіннем ад семачак маюць моду і студэнты, якіх мы ў пятніцу вечарам дастаўляем дадому (недалёка ад горада знаходзіцца Борквайскае вучылішча). Не выпускаем, пакуль не прыбяруць.

Зімой паром адпачывае — стаіць на захаванні. Людзі ж самі пракладваюць снежную дарогу па рацэ. Але апошнім часам еўрапейскія зімы прымушаюць запасацца лодкамі.

— Вунь, бачыце, на тэрыторыі Верхнядзвінскага раёна ля берага знаходзіцца Луначарскі псіхаэнеўралагічны дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў. Я там працую, а разам са мной яшчэ амаль сто чалавек, якія жывуць на супрацьлеглым баку ракі, — расказвае адзін з пасажыраў парома. — Вось кіраўніцтва ўстановы і было вымушана купіць лодку, на якой мы тады, калі паром «сыходзіць у сезонны адпачынак», дабіраемся на работу. Але і зімой бывае такое, што па лёдзе немагчыма ні прайсці, ні праплысці на лодцы, і людзі перашкаджаюць. Вось і даводзіцца намотваць кіламетры праз Полацк. Туды і назад — прыкладна 70 кіламетраў набіраецца. Шмат не наездзішся. Радуе, што падыходзіць да канца будаўніцтва моста ва Узмёнах (вёска, якая знаходзіцца на тэрыторыі Міёрскага раёна). Новы мост, думаю, зблізіць раёны.

— Нядрэнна было б, каб і ў нас тут мост узвялі, — гаворыць на развітанне заядлая ягадніца і грыбніца Аліна Аляксандраўна, спускаючыся са сваім веласіпедам на зямлю. — Бо зімой паром не ходзіць, а бывае і ў снег можна праваліцца і ў вадзе акунуцца, пакуль па тонкім лёдзе ад берага да берага дойдзеш.

**Надзея ДРЫЛА,**
**фота аўтара.**

Здыму аднапакаёвую кватэру. Нядорага.
Тэл. 8-0296-685921

# БЕЛАРУСКАЕ ВЯСЕЛЛЕ З ІНШАЗЕМНЫМ УХІЛАМ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Мено не першы раз ў Лепельскім раёне. Вельмі зачараваў яго мясцовы абрад «Жаніцьба Цярэшкі». Прызнаўся: і не думаў, што ў выніку сам «ажэніцца». Але папрасіў гэтага сам. Напэўна, сапраўднае вяселле і яго вельмі здзівіла. Які ж тут ужо абрад? Яго цяпер ужо «сапраўдная» жонка ў нашай краіне ўпершыню.

Яны — удзельнікі міжнароднага веласіпеднага туру. Дарэчы, старэйшаму з веласіпедыстаў каля 70 гадоў! Едуць на веласіпедах, гавораць з мясцовымі жыхарамі. Адным іншаземцам падабаецца гаварыць на тэму гісторыі, іншым пра другое, напрыклад, пра навакольнае асяроддзе. А хто лепш за месцічаў пра ўсё гэта раскажа? У якасці перакладчыкаў добраахвотна працуюць валанцёры: студэнты і іншыя нашы землякі, якім падабаецца мець зносіны з носьбітамі замежнай мовы. Жывуць госці ў дамах, дзе прымаюць турыстаў. І харчаванне натуральнае, і дарогі без асфальту — усё ім «у кайф»...

Па дзяўчыну прыйшлі яе «сяброўкі». Па маладога — «сябры». Падчас дзейства бабулькі спявалі. Пераапранулі іншаземных нявесту і жаніха ў традыцыйнае беларускае адзенне. Праўда, чамусьці жаніх застаўся ў джынсах. Добрая рэклама для вытворцы? Госці і прадстаўнік «Звязды», які патрабуецца абрадам, кінулі зерне пад ногі маладых. Потым ён і яна селі на каня. Пад'ехалі да дуба. І папрасілі яны і мы таксама ў прыгожага, магутнага дрэва шчасця для закаханых. А далей накіраваліся да вады. Пасаджаны бацька кінуў сімвалічны замок у возера. Далей галоўныя героі абраду прайшлі «выпрабаванне агнём». Усталі ў цэнтры круга, а вакол агонь гарыць... «Дас іст фантасціш» — што яшчэ можна напісаць?

Пасля ўсяго гэтага жаніх, нявеста і госці селі за святочны стол. Маладыя журналістам адказвалі, што такога за мяжой, у прыватнасці, у Францыі, няма. Асабліва ім падабаецца, як спяваюць простыя мясцовыя жанчыны. Шчыра, так, што хочацца плакаць. Беларусь, паводле іх слоў, выклікае вялікі інтарэс для аматараў аўтэнтычнай культуры.

Хочаце верце, хочаце — не. Калі пачынаўся абрад, ішоў дождж. Потым раптам скончыўся. Пайшлі маладыя да вады — свяціла сонейка. Падчас «выпрабавання агнём» зноў пайшоў дождж. І знік. Як толькі селі за стол — зноў дождж. На шчасце!

Перад абрадам, за два дні да яго пачатку, кабыла нарадзіла жарабя. А авечка потым трох ягнятак! Чым не напамін біблейскай гісторыі?

Больш за тое, пасля завяршэння галоўных падзей абраду з'явілася на небе вясёлка!

Кіраўнік рэгіянальнага аддзялення грамадскага аб'яднання «Адпачынак у вёсцы» Вольга Маханенка правяла свята з дасканалым веданнем нашых беларускіх традыцый.

— Гэта не гульня! — падкрэслівае яна. — Мы хочам працягваць традыцыі нашых продкаў, жыць так, як жылі яны, у гармоніі з прыродай і сабой. Ішлі да гэтага некалькі гадоў. Напэўна, гэта зрабілі ўпершыню ў краіне.

Як адзначыла спадарыня Маханенка, паралельна ўжо звярнуўся да яе наш суайчыннік з просьбай правесці для яго і яго каханай такі ж абрад.

— А ці не будуць супраць вашы бацькі? Гэта вельмі важна! — запытала Вольга.

У адказ пачула, што не.

Праўда, на пытанне карэспандэнта «Звязды»: «А колькі можа каштаваць заказ ажыццяўлення такога абраду? — засталося, на жаль, без адказу.

— Галоўнае для нас — адраджэнне традыцый. А грошы... Нікому не адмовім!

Безумоўна, такія акцыі — добры спосаб прыцягнуць замежных турыстаў. Ды і нашы паедуць, каб стаць героямі, сведкамі таго, што мы маглі б страціць, калі б не энтузіясты. І навошта траціць грошы ў Турцыі і г.д., калі побач ёсць такое, пра што большасць з нас, напэўна, і не ведае. Не патрэбны нам бераг турэцкі...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*Лепельскі раён.*

# УРАДЖАЙ РЭКОРДНЫ, АЛЕ ГЭТА ЯШЧЭ НЕ МЯЖА

**На 21 жніўня ў Гродзенскім раёне было абмалочана 97 працэнтаў плошчаў, валавы збор збожжа склаў амаль 240 тысяч тон пры рэкорднай сярэдняй ураджайнасці — 74,5 цэнтнера з гектара. А ў СВК «Прагрэс-Верцялішкі» — 102,1, у сельгаскааператывах «Абухава», «Кастрычнік-Гродна», «Свіслач», імя Дзеншчыкова — больш за 80 цэнтнераў з гектара. З улікам кукурузы, якая цяпер нармальна развіваецца, у раёне разлічваюць атрымаць не менш за 300 тысяч тон збожжа.**

**З просьбай вызначыць асноўныя складнікі небывалага ўраджаю карэспандэнт «Звязды» звярнуўся да першага намесніка старшыні Гродзенскага райвыканкама Івана АЛІЗАРОВІЧА.**

— Уборка была даволі складанай, паколькі ў сувязі са шквальным ветрам прыкладна на трэці плошчаў утварылася моцная палегліца хлябоў. Аднак дзякуючы магутнаму камбайнаваму парку ўдалося ўзяць добра сфарміраваны ўраджай і не дапусціць стратаў. А паколькі ў некаторых гаспадарках яшчэ ёсць праблемы з зернесушыльнымі комплексамі, то аператыўна вырашаліся пытанні з дапрацоўкай збожжа. Задзейнічалі, так бы мовіць, усё, што можа сушыць, у тым ліку чатыры агрэгаты на мясцовых відах паліва.

План продажу збожжа дзяржаве ў бліжэйшы час будзе выкананы. Дарэчы, рэкордны ўраджай выявіў вельмі важную праблему, якую трэба, не марудзячы, вырашаць. Маю на ўвазе будаўніцтва сучасных зернясховішчаў, паколькі тых, што сёння ёсць на камбінатах і ў гаспадарках, ужо недастаткова, яны перагружаны. А час настаў такі, што ўраджайнасць хоць і можа вагацца ў залежнасці ад умоў надвор'я, але ўсё роўна будзе блізкай да сёлетняга ўзроўню.

***— Ці паўплываюць рэкордныя ўраджаі на ўмацаванне эканомікі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў?***

— Безумоўна, паколькі затраты на ўраджай акупяцца тым, што сёння жывёлагадоўля раёна не толькі цалкам забяспечана ўласным зернефуражом, але і маецца рэальная магчымасць яго продажу.

***— Якая задача будзе на будучыню?***

— Мяжы ўдасканаленню няма. У нас яшчэ дастаткова рэзерваў, выкарыстанне якіх будзе садзейнічаць далейшаму росту ўраджайнасці. Так, у кожнай гаспадаркі — свой узровень, і вынікі таго ж СВК «Прагрэс-Верцялішкі» па сілах не ўсім. Аднак усе паступова рухаюцца ў гэтым напрамку. Да прыкладу, калі ў сельгаскааператыве «Пагранічны» шэсць гадоў таму атрымлівалі 30 цэнтнераў з гектара, то сёлета ўжо 77 цэнтнераў. Зямля засталася нязменнай, але яна стала лепш апрацоўвацца, даюць аддачу інтэнсіўныя фактары аховы раслін, сучасная тэхніка. Адсюль і вынік.

І, безумоўна, галоўны фактар поспеху — у нашых спецыялістах, механізатарах, якія ўмела працуюць з новымі тэхналогіямі, гатункамі сельгаскультур, здольнымі даваць ураджай больш за 100 цэнтнераў з гектара. Работа ў гэтым накірунку павінна весціся пастаянна, бо той, хто спазніцца, іншых ужо не дагоніць.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# Атручэнне на сметніку

**Пяць чалавек у Бабруйскім раёне памерлі ад атручэння невядомай, верагодна — алкагольнай, вадкасцю.**

20 жніўня бліжэй да ночы на палігоне бытавых адходаў паблізу вёскі Бабіна Бабруйскага раёна знайшлі ў стане непрытомнасці трох мужчын і дзвюх жанчын. Усе яны — жыхары Бабруйска і навакольных вёсак, беспрацоўныя. Узрост — ад 24 да 48 гадоў.

Побач з імі была знойдзена 5-літровая пластыкавая каністра з рэштамі невядомай вадкасці. Магчыма, кампанія піла нейкі алкагольны сурагат.

Брыгада «хуткай дапамогі» даставіла атручаных у бабруйскую бальніцу. Аднак выратаваць іх не ўдалося — усе пяць чалавек на наступны дзень памерлі, не прыходзячы ў прытомнасць.

На гэтым тыдні «Звязда» паведамляла аб падобным выпадку ў Бялыніцкім раёне. Там людзі, якія атруціліся, выжылі. Нагадаем, што 18 жніўня з вёскі Буднікі былі дастаўлены ў раённую бальніцу тры мужчыны. Як высветлілася, прама на вуліцы яны знайшлі пластыкавую бутэльку з невядомай вадкасцю, якая па колеры і паху нагадала мужчынам алкагольны напой. Яны выпілі па 50 грамаў, адчулі сябе дрэнна і самі пабеглі да медыкаў. Праз суткі пацыентаў выпісалі з бальніцы. Урачы мяркуюць, што вяскоўцы атруціліся тармазной вадкасцю.

**Алена КАЗЛОВА.**

Рэха публікацыі

# ІШЛА КАРОВА ПА АСФАЛЬЦЕ...

**У артыкуле «Па вёсцы конь імчаўся» («Звязда», 09.08.2008 г.) найперш уздымалася пытанне страхавання аўтатранспарту, але мінчанка Лідзія Асавец убачыла і яшчэ адну праблему.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— На лета мы выязджаем у Столінскі раён і да восені жывём у хаце бацькоў, якія ўжо даўно памерлі. Наша вёска ці, як цяпер называюць, аграгарадок, вялікая і прыгожая. Вуліцы заасфальтаваныя, а абапал цэнтральнай — пафарбаваныя агароджы. Але каб вы бачылі, што робіцца на тым асфальце, калі па вуліцы прагоняць статак кароў... і гэта ж гоняць чатыры разы на дзень... толькі вычысцілі вуліцу, як зноў трэба браць шуфель у рукі. А гэта ж ненармальна. Жывём быццам бы ў гарадку, а ён так загаджаны, — расказала чытачка пра набалелае.

Дарэчы, узнятая праблема актуальная.

Сапраўды, іншым разам праехаць праз наш населены пункт няпроста. Як ні круці руль, а аўтамашыну затым адмыць цяжка.

Але гэтая праблема звязана з укладам нашага вясковага жыцця. Напрыклад, у немцаў яе няма, бо ў тамтэйшых «Dorf» кароў па вуліцах не гоняць: мясцовае насельніцтва іх не трымае — там іншы падыход да жыцця.

Неяк давялося пабываць у фермера з Бярозаўскага раёна. Чалавек трымаў трыццаць кароў, але жыве ў вёсцы і ферма тут жа — пры хаце. Падчас размовы фермер паскардзіўся, што суседзі да яго ставяцца непрыязна, маўляў, зайздросцяць. Нічога, здавалася б, у гэтым дзіўнага няма, бо з зайздрасцю хто не знаёмы.

Але неўзабаве сітуацыя праяснілася. Фермерскі статак прыгналі на даенне, і пакуль гаспадар упраўляўся з каровамі, я пайшоў прагуляцца па вёсцы. Праз некалькі хат убачыў мужчыну, які, даведаўшыся, што я з газеты, пачаў абурацца, што фермер сваімі каровамі спаганіў жыццё ўсёй вуліцы.

— Мы купілі тут хату, а цяпер хоць збывай, за браму не выйсці — усё зас... , — скардзіўся чалавек, — а ён толькі пасмейваецца.

І ў суседа была падстава для гэтага, бо каровы вытапталі сцежкі ўздоўж агароджы, а пра асфальт ужо і гаварыць не прыходзіцца — загаджаны.

Такога непарадку ўвогуле не павінна быць. Праблема ў тым, што загаджаная вуліца заўсёды для нас была звыклым малюнкам. Толькі апошнім часам у людзей пачалі мяняцца погляды, бо мяняецца жыццё. А для старэйшага пакалення гэтая праблема ніколі не была істотнай. Найперш таму, што таго асфальту ніхто не бачыў, а брук ляжаў толькі ў гарадках ды зрэдку ў нейкім мястэчку.

Спрадвеку вясковы чалавек быў прывязаны да каровы і ўсе працэсы, звязаныя з ёю, былі натуральныя, і яму ў галаву не магло прыйсці, што можа быць нешта інакш. Часта хлеў і хата знаходзіліся пад адной страхой і карова мыкала за сцяной. А калі зімой парасілася свіння, то яе забіралі ў хату, а каб у курэй не адмерзлі грэбні, іх трымалі пад печчу...

Знаёмы франтавік расказваў, што падчас вайны яго найбольш уразіла тое, што ў нямецкіх хлявах была электрычнасць.

Але вернемся да кароў і асфальту.

Праблема тыповая для ўсіх населеных пунктаў, дзе людзі трымаюць кароў, але яна не такая ўжо і вялікая. Ва ўсякім разе, вырашыць яе можна даволі проста.

У Навасёлках Ляхавіцкага раёна вуліцы чыстыя. Цэнтральная частка аграгарадка забудавана адміністрацыйнымі будынкамі, магазінамі... усё абкладзена сайдынгам і пад металачарапіцай, але кароў праз цэнтр гоняць, бо прыватны сектар параскіданы па ўсіх вуліцах. Калі статак ідзе па вуліцы, то следам за ім з тачкай прасоўваецца асенізатар (такую пасаду далі чалавеку) і ўсё падбірае.

Раніцай, у абед і з абеду ды вечарам ён павінен прайсці за каровамі па вуліцы. За гэта кожны гаспадар са сваёй каровы плаціць асенізатару 5 тысяч у месяц, а яшчэ 85 тыс. рублёў яму даплачвае мясцовы СВК «Шлях новы». Пра гэты факт некалькі гадоў таму ўжо даводзілася пісаць. Калі я патэлефанаваў у сельгаскааператыў, то высветлілася, што адладжаны працэс збояў не дае па сёння.

Магчыма, нешта падобнае ёсць і ў іншых населеных пунктах, але пра такія факты чуць не даводзілася. Хоць пераймаць станоўчы вопыт, напэўна, неабходна ўсім. А можа, ёсць і іншы?

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Карэспандэнт высвятляў сітуацыю

# ХАЦЕЛІ БЫЦЬ ПЕРШЫМІ ВЫПУСКНІКАМІ, АЛЕ...

**«Звязда» атрымала ліст ад бацькоў студэнтаў 1-га курса Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны, якія атрымліваюць вышэйшую адукацыю па спецыяльнасці ветэрынарная медыцына.**

*«Сутнасць нашай праблемы ў тым, што летась пры правядзенні ўступнай кампаніі на сайце акадэміі і ў СМІ была змешчана інфармацыя аб тым, што плануецца адкрыццё факультэта ветэрынарна-санітарнай экспертызы. Гэтую інфармацыю агучвалі і работнікі акадэміі (члены прыёмнай камісіі) пры прыёме дакументаў. Прычым падрабязна гаварылася аб тым, дзе будуць працаваць будучыя ветэрынарна-санітарныя ўрачы.*

*У час вучобы выкладчыкі інфармавалі студэнтаў аб тым, што яны будуць першымі выпускнікамі новага факультэта, і ў другім семестры будуць збіраць заявы ад студэнтаў на новы факультэт. Ішла гаворка аб здачы дадаткова пяці іспытаў. Потым размовы спыніліся. І нарэшце ў ліпені з тэлефоннай размовы з дэканам факультэта ветэрынарнай медыцыны мы даведаліся, што трапіць на новы факультэт у студэнтаў 1-га курса няма ніякіх магчымасцяў. Паколькі трэба здаваць 7 — 10 экзаменаў. Тры месяцы таму было прынятае рашэнне зверху (?), якое забараняе набіраць 2-гі курс. І за тое, што адбывалася падчас уступнай кампаніі 2007 года, дэкан адказнасці не нясе, паколькі ён новы чалавек.*

*Узнікаюць пытанні да тых, хто «зверху», на якія хочацца атрымаць адказ праз вашу газету. Чаму падчас уступнай кампаніі 2007 года была выкарыстана інфармацыя, якая не датычылася абітурыентаў 2007 года? Гэта адыграла сваю ролю (ёсць розніца паміж ветэрынарным урачом і ветэрынарна-санітарным урачом): прахадны бал на гэтую спецыяльнасць на бюджэтную форму навучання быў 292. Не кожная ВНУ магла пахваліцца такімі падрыхтаванымі абітурыентамі. Чаму, калі рашэнне было прынятае тры месяцы таму, аб ім своечасова не былі інфармаваныя студэнты? У іх (некаторых з іх) была яшчэ магчымасць выкарыстаць шанц удзельнічаць ва ўступнай кампаніі 2008 года, каб трапіць на тую спецыяльнасць, якую яны выбіралі. Чаму б кіраўніцтву акадэміі не вырашыць праблему ў інтарэсах нашых дзяцей? А праблема ёсць: спецыяльна ці не, але абітурыенты 2007 года былі ўведзены ў зман, быў выкарыстаны не зусім прыгожы прыём прыцягнення абітурыентаў у сваю ВНУ рэкламай факультэта, адкрыццё якога на той момант не было вырашана.*

*Дапамажыце, калі ласка! Гэта праблема не 2—3 дзяцей, а ў дзесяткі разоў больш».*

Вось такая скарга. Па каментарый віцебскі карэспандэнт «Звязды» звярнуўся да кіраўніцтва ВНУ.

**Першы прарэктар, доктар ветэрынарных навук, прафесар Расціслаў КУЗЬМІЧ пастараўся падрабязна растлумачыць сітуацыю.**

— Цяпер на 400 мясакамбінатах і іншых перапрацоўчых прадпрыемствах кантроль за якасцю прадуктаў ажыццяўляюць больш за 800 урачоў ветэрынарнай медыцыны. Практычна ўсе яны — выпускнікі Віцебскай ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны (да 1994 года Віцебскага ветэрынарнага інстытута), — расказвае прафесар. — З мэтай паляпшэння падрыхтоўкі спецыялістаў па забеспячэнні вытворчасці якаснага малака, мяса і іншых прадуктаў харчавання ў акадэміі з 1995 года ўведзена спецыялізацыя па ветэрынарна-санітарнай экспертызе. У 2006 годзе пачата перападрыхтоўка ветэрынарных урачоў па ветэрынарна-санітарнай экспертызе. Навучанне ажыццяўляецца на працягу двух гадоў з выдачай па заканчэнні адпаведнага дыплома дзяржаўнага ўзору. Для перапрацоўчых прадпрыемстваў, лабараторый і іншых устаноў, якія забяспечваюць якасць прадуктаў, ужо падрыхтаваны больш за 200 спецыялістаў. Вопыт навучання, работы на вытворчасці ва ўмовах павялічаных патрабаванняў да прадуктаў пры іх экспарце паказаў, што патрабуецца ўдасканальванне адукацыйнай дзейнасці ў гэтым накірунку. Узнікла неабходнасць падрыхтоўкі ўрачоў па новай спецыяльнасці — «ветэрынарная санітарыя і экспертыза» з прысваеннем выпускнікам кваліфікацыі «ветэрынарна-санітарны ўрач». Гэтая спецыяльнасць адкрыта ў акадэміі сёлета. Для гэтага быў распрацаваны і зацверджаны новы адукацыйны стандарт, які ўведзены пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь у маі 2008 года. Ён адлюстроўвае ўсе неабходныя сучасныя патрабаванні да падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, устанаўлівае мэты і задачы прафесійнай дзейнасці ветэрынарна-санітарнага ўрача ў інтарэсах дзяржавы.

Пры гэтым новы стандарт значна адрозніваецца ад ранейшага, паколькі той быў арыентаваны выключна на падрыхтоўку спецыялістаў па лячэнні жывёлы. У стандарце прынцыпова змяніліся колькасныя суадносіны вучэбных дысцыплін. Упершыню ў вучэбныя планы ўключаны такія прадметы, як санітарная мікрабіялогія, вытворчы ветэрынарна-санітарны кантроль, дзяржаўны санітарны нагляд і іншыя. Гэта дазволіць даць выпускнікам неабходныя веды па кантролі за якасцю прадуктаў харчавання...

Адкрыццё новай спецыяльнасці і далейшае развіццё перападрыхтоўкі ўрачоў ветэрынарнай медыцыны ў галіне забеспячэння якасці харчавання будзе ўдакладняцца ў некалькіх накірунках. Праз 2 — 3 гады плануецца стварэнне самастойнага факультэта. Тэрміны яго адкрыцця залежаць ад колькасці студэнтаў, наяўнасці неабходнай матэрыяльна-тэхнічнай базы і навукова-метадычнага забеспячэння вучэбнага працэсу. У акадэміі ўжо адкрыта лабараторыя маніторынгу якасці прадуктаў харчавання. Цяпер яна аснашчаецца самым сучасным, у многім унікальным абсталяваннем і прыборамі, кошт якіх складае каля двух мільярдаў рублёў...

На першы курс акадэміі па спецыяльнасці ветэрынарная санітарыя і экспертыза ў 2008 годзе прыняты 74 студэнты, з якіх 49 — на платнай аснове. Колькасць тых, хто паступае ў наступныя гады, будзе ўзрастаць. Разам з тым да сваёй непасрэднай прафесійнай дзейнасці першыя ветэрынарна-санітарныя ўрачы прыступяць не раней чым у 2012 годзе. Да гэтага года перапрацоўчыя і сельскагаспадарчыя прадпрыемствы будуць камплектавацца таксама выпускнікамі акадэміі, якія навучаюцца на 2—5 курсах па спецыяльнасці «ветэрынарная медыцына» са спецыялізацыяй ветэрынарна-санітарная экспертыза. Іх зараз вучыцца ў акадэміі каля 200 чалавек. Перавесці іх на новую спецыяльнасць няма магчымасці, паколькі гэта не прадугледжана нарматыўнымі дакументамі вышэйшай школы. Таксама неабходна адзначыць, што нават на 1-м курсе дысцыпліны, якія вывучаюцца, па спецыялізацыі «ветэрынарная медыцына» і «ветэрынарная санітарыя і экспертыза» значна адрозніваюцца. Маецца вялікая розніца ў аб'ёме вывучаемых прадметаў. Так, напрыклад, па хіміі ён складае не менш за 50 гадзін, па асновах жывёлагадоўлі — больш за 60...

У бліжэйшыя гады кантроль за якасцю і бяспекай прадукцыі жывёльнага паходжання маюць права і будуць ажыццяўляць спецыялісты, якія атрымаюць дыплом урача ветэрынарнай медыцыны.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Стыль

# МОДНЫЯ ШТАНЫ: ад экстрэмальна вузкіх да шырокіх мужчынскіх

**Каб штаны былі не толькі камфортнымі, але і моднымі, прадстаўляем новыя тэндэнцыі сезона восень-зіма 2008/2009.**

## Укарочаныя штаны

У новым сезоне дызайнеры ўносяць папраўкі ў традыцыйныя прапорцыі сілуэтаў жаночых штаноў. Уся ўвага факусуецца на даўжыні: ніжні край мадэляў завяршаецца крыху вышэй за ладыжку. А некаторыя дызайнеры прапанавалі яшчэ больш укарочаныя мадэлі даўжынёй крыху ніжэй за калена. Цалкам верагодна, што такія капры з высокімі боцікамі будуць не рэдкасцю ў зімовым гардэробе. Асноўныя колеры: усе модныя яркія колеры сезона, а таксама шэры. Асноўныя матэрыялы: цвід, лёгкая фланэль, вельвет.

## Расклёшаныя штаны

Стыль 70-х аказаў вялікі ўплыў на дызайн штаноў, і мы з упэўненасцю можам чакаць вяртання доўгага сілуэту, лёгкі клёш якога дазваляе штанам крыху прыкрываць абутак. Нягледзячы на некаторую непрактычнасць падобнай даўжыні, модныя эксперты прадказваюць мадэлям найбольшую папулярнасць. Яны ўжо заваёўваюць рынак джынсавага адзення і прэтэндуюць на званне самай запатрабаванай рэчы ў рознічным гандлі. У каляровых адносінах перавага аддаецца модным адценням сезона і чорнаму. Асноўныя матэрыялы: дэнім цёмнага колеру, аксаміт, вельвет, тканіны на эластычнай аснове.

## Манжэты і драпіроўка

Для стварэння гэтых мадэляў дызайнеры запазычылі форму арабскіх шараварaў, у выніку чаго з'явіўся акруглы сілуэт з лёгкім аб'ёмам, які пяшчотна ахутвае ногі ад сцягна да ладыжкі, дзе штаны завяршае мяккая і зручная манжэтка. Бадай, гэта адна з самых камфортных і яркіх формаў сезона. Асноўныя колеры: халодныя цёмныя колеры, шэры. Асноўныя матэрыялы: мяккая шэрсць, джэрсі.

## Шырокія штаны ў мужчынскім стылі

Свабодныя, шырокія штаны мужчынскага крою, выкананыя з мяккага цвіду, а часам нават клятчатай тканіны, ідэальна камбінуюцца з модным у гэтым сезоне адзеннем у стылі кантры. Відаць, многія дызайнеры дагэтуль лічаць, што жанчыны мараць апранацца ў мужчынскае адзенне. Асаблівасці сілуэту — высокая талія, максімальна магчымая даўжыня, лёгкая драпіроўка. Асноўныя колеры: халодныя белы, шэры і чорны. Асноўныя матэрыялы: цвід, лёгкая фланэль, аксаміт.

## Камбінезоны

Даволі доўга камбінезон заставаўся на другасных ролях, але цяпер гэта адна з ключавых формаў ужо некалькі сезонаў. Гэта практычныя камбінезоны ў паўсядзённым стылі, выкананыя з шыкоўных матэрыялаў, такіх, як аксаміт ці атлас. Асноўныя колеры: сіні, шэры, чорны. Асноўныя матэрыялы: шоўк, атлас, джэрсі, лёгкая фланэль.

## У абцяжку

І ў заканчэнні спынімся на сілуэтах, якія шчыльна аблягаюць. Ці будуць такія штаны па-ранейшаму актуальныя наступнай зімой? Міжнародныя паказы сведчаць на карысць гэтага накірунку: мадэлі ў абцяжку асабліва ўдала спалучаюцца з жакетамі ў мужчынскім стылі, ствараючы рэзкі, энергічны вобраз. Асноўныя колеры: чорны, чырвоны ў клятчатай расфарбоўцы. Асноўныя матэрыялы: скура ці яе імітацыя, эластычныя матэрыялы.

**Алена КРАВЕЦ.**



*УО «Вилейский государственный сельскохозяйственный профессиональный лицей»*
**ПРОВОДИТ НАБОР НА ПЛАТНОЕ ОБУЧЕНИЕ**
по подготовке водителей механических транспортных средств с ручным управлением категории «В» (инвалидов).
***Имеется общежитие, столовая.***
**Справки по телефонам: 8 01771 3 51 72, 3 51 38.**

# КАЛІ МЕТАДЫ ВЫХАВАННЯ РОЗНЫЯ




***Мы з мужам жывём асобна. Заяву аб скасаванні шлюбу яшчэ не падавалі, але, напэўна, хутка справа да гэтага дойдзе. Ад шлюбу ў нас ёсць дзіця чатырох гадоў і мы часта спрачаемся аб метадах яго выхавання. Я не супраць добрых зносінаў дзіцяці з бацькам, але мне не падабаецца, калі я не ведаю, куды яны пайшлі, не падабаецца, калі пры гэтых сустрэчах дзіцяці патураюць ва ўсіх яго капрызах, а маці затым становіцца ў яго вачах кепскаю і ў выніку мне доўга даводзіцца наводзіць мір у нашых з ім адносінах. Куды нам звярнуцца, каб вырашыць гэтыя спрэчныя пытанні?***

**В. Зеніна,** *г. Віцебск*

Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і ўстаноўлена, што бацька і маці маюць роўныя правы і абавязкі ў дачыненні да сваіх дзяцей. Бацька, які жыве асобна ад дзіцяці, мае права на зносіны з ім і абавязаны прымаць удзел у яго выхаванні. Маці, з якой жыве дзіця, не мае права перашкаджаць бацьку ў яго зносінах з дзіцем і ўдзеле ў яго выхаванні.

Усе пытанні, што адносяцца да выхавання дзяцей, маці і бацька павінны вырашаць па ўзаемнай згодзе. Аднак бываюць выпадкі, калі бацькі не змаглі дасягнуць згоды паміж сабою. У гэтай сітуацыі, згодна з часткай другой артыкула 75 Кодэкса, спрэчкі паміж бацькамі вырашаюцца органам апекі і папячыцельства (упраўленнем (аддзелам) адукацыі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа) з удзелам бацькоў. Рашэнне гэтага органа можа быць абскарджана ў суд.

Пры скасаванні шлюбу бацькі могуць заключыць паміж сабою пагадненне аб дзецях, у якім маюць права вызначыць месца пражывання дзіцяці, памер аліментаў на яго, парадак зносінаў з дзіцем бацькі, які жыве асобна, і іншыя ўмовы жыцця і выхавання дзіцяці. Калі ж бацькі не дасягнулі згоды і не заключылі такое пагадненне, спрэчкі па гэтых пытаннях вырашаюцца судом, які ў сваім рашэнні па справе вызначае парадак удзелу бацькі, які жыве асобна, у выхаванні дзіцяці, перыядычнасць і колькасць сустрэч у месяц або нядзелю, ці па выхадных, у якім месцы (у доме маці, у школе або дзіцячым садку), на працягу якога часу (некалькі часоў, дзень, суткі, на перыяд водпуску маці і да т.п.). Пры гэтым да ўвагі прымаецца ўзрост дзіцяці, стан здароўя, прыхільнасць да кожнага з бацькоў і іншыя абставіны, якія могуць уздзейнічаць на яго фізічнае і псіхічнае здароўе, маральнае развіццё.

У выпадках, калі зносіны дзіцяці з бацькам, які жыве асобна, могуць нанесці шкоду дзіцяці, суд мае права абмежаваць яго ў зносінах з дзіцем, прывёўшы матывы такога рашэння. Аналагічнае рашэнне суд можа прыняць, калі хтосьці з бацькоў парушае заключанае пагадненне аб дзецях або рашэнне суда, чыніць перашкоды ў зносінах з дзіцем таму з бацькоў, які жыве асобна, або калі іх зносіны абмяжоўваюць правы і законныя інтарэсы дзіцяці. Тэрмін абмежавання ўстанаўліваецца судом у залежнасці ад характару парушэнняў.

По спрэчках, звязаных з выхаваннем дзяцей, у судовых пасяджэннях абавязкова бяруць удзел органы апекі і папячыцельства.

А на мой погляд...

# МАРЫ ПРА АДПАЧЫНАК СПРАЎДЖВАЮЦЦА І... ГРЭЮЦЬ СВАЁЙ ПЕРСПЕКТЫВАЙ

**Лета набліжаецца да свайго каляндарнага завяршэння, хоць па цяперашніх умовах надвор'я гэтага, на радасць многім, і не скажаш — і пазагараць яшчэ можна, і пакупацца. Словам, добра адпачыць нават пасля працоўнага дня ці ў выхадныя. Ну, а хто яшчэ ці ўжо ў водпуску ці толькі збіраецца, шанцаў і магчымасцяў на прыемнае баўленне часу маюць яшчэ больш. Зрэшты, многія па аб'ектыўных ці суб'ектыўных прычынах плануюць свой адпачынак не толькі на лета.**

**Ці спраўдзіліся вашы мары, планы пра добры водпуск, адпачынак сёлета? Ці ў вас яшчэ ўсё наперадзе? Што асабіста для вас азначае добра адпачыць, расслабіцца?**

***Ірына ЗАПОЛЬСКАЯ, старшыня Бабаўнянскага сельскага Савета Капыльскага раёна:***

— Ведаеце, я летам у водпуск не хаджу ўжо гадоў 20. Раней гэта было звязана са спецыфікай маёй працы землеўпарадчыка. Апошнія 6 гадоў, калі пачала працаваць старшынёй сельскага Савета, лета — таксама не лепшы час для ўласнага адпачынку: гарачая пара ў вёсцы, самі ведаеце... У водпуск я звычайна іду ў лістападзе—снежні. Сёлета таксама планую адпачыць у гэты час. Як? Я ўжо двойчы была ў санаторыі «Прыазёрны», спадабалася, лячэнне там вельмі добрае. Вось планую патрапіць у санаторый і сёлета.

***Галіна САДОЎСКАЯ, начальнік аддзела рознічнага бізнэсу філіяла № 422 ААТ «ААБ Беларусбанк» г. Слоніма:***

— Не была я ў адпачынку сёлета, таму і мары мае не спраўдзіліся. Не, сам водпуск быў, але я вучуся, таму і пайшоў ён на сесію. Ды і дачка ўступала ў шлюб, таму ўвесь вольны час ішоў на падрыхтоўку да гэтай важнай і значнай для нас падзеі.

Вядома ж, я мару пра адпачынак — у наступным годзе (*смяецца*). Каб паляжаць, зняць стрэс...

***Віктар ДУБАРЭНКА, намеснік дырэктара па якасці Мінскага домабудаўнічага камбіната:***

— Быў, усё споўнілася, было вельмі добра! Мы з жонкай планавалі паехаць у Турцыю, і ўсё атрымалася. Было нават лепш, чым мы сабе ўяўлялі! Дарэчы, у Турцыі мы былі ўпершыню. Запомніліся экскурсіі ў Памукале, старажытную крэпасць... Ды ўсё запомнілася! Безумоўна (*смяецца*), пасля такой прыемнай вандроўкі, добрых уражанняў, зноў ёсць жаданне патрапіць у гэтую краіну.

***Аляксандр БЕЛЬСКІ, майстар па кінаабсталяванні кінастудыі «Беларусьфільм»:***

— Задумкі і планы, вядома ж, былі, але, на жаль, яны не спраўдзіліся: было шмат працы, трэба было завяршаць пачатае. У водпуск я планую пайсці ў верасні і правесці яго вельмі актыўна — на ўласным падворку ў вёсцы. Кожны год я перакрываю чаротам дах нашай альтанкі — вось вам ужо занятак. Трэба зрабіць слупы для веснічак з камянёў. Планую, нарэшце, зрабіць на ўчастку і фантан. Ну, і праца ў садзе, на агародзе.

***Таццяна ЛОГМАН, знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці, вёска Слабада-Кучынка Капыльскага раёна:***

— Нават і не ведаю, што вам адказаць... На лета мы нічога не планавалі, бо муж працуе ў гаспадарцы: які ў яго адпачынак у гэты час?! Уласная гаспадарка, дзіця малое... Зімой, хіба, нейкі адпачынак будзе. Вось, скажам, плануем на час з'ездзіць у госці да сваякоў, родных.

***Аксана САЙКО, эканаміст Лунінецкага раённага спажывецкага таварыства:***

— Водпуску не было, пойдзе ўвесь на сесію. Вось якраз у верасні пачнецца. Вучуся я на шостым курсе Палескага ўніверсітэта, так што няшмат мне засталося. А мары мае (*смяецца*), безумоўна, пра мора. Вось, можа, пасля заканчэння вучобы ў наступным годзе атрымаецца...

***Ларыса ЗАХАРАВА, пенсіянерка, г. Маладзечна:***

— Я ў душы — падарожніца. Раней з дзецьмі, і без іх рэгулярна адпачываць у Крым ездзілі, з калегамі па працы — на Нарач. Сёлета планавалі наведаць родных у Варонежы, але не атрымалася: рамантавалі дачу, ды і дажджы падарожжу не садзейнічалі. Такі вось «працоўны адпачынак» атрымаўся (*смяецца*). Ды і ў нашым узросце ўжо больш пасіўны адпачынак, а не актыўны, падыходзіць. Вось мы любім у лес выбірацца. Дарэчы, сёлета пайшлі ў маліны, дык сустрэлі дзіка! Так спужаліся, як ён з шумам праімчаў (*смяецца*). Вось вам і незабыўнае ўражанне пра адпачынак!

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

# Добрыя хлопцы і зайздросныя халасцякі Багдановічы

**Пасёлак Ялізава, малая радзіма новых алімпійскіх чэмпіёнаў, святкуе «золата» весляроў.**

Маці Аляксандра і Андрэя Багдановічаў Людміла Альбінаўна глядзела трансляцыю з Пенкіна, перажывала і нават плакала.

— Так хацелася, каб мае хлопчыкі перамаглі! — не хавае яна пачуццяў. — Я амаль штодня тэлефанавала ім у Пекін і заклікала імкнуцца і трымацца. Казала, што ўсё Ялізава за іх хварэе!

Сям'я Багдановічаў жыве ў пасёлку Ялізава, што ў Асіповіцкім раёне. Бацькі чэмпіёнаў працуюць на мясцовым шклозаводзе. Людміла Альбінаўна — начальнік участка, Віктар Іванавіч — фармоўшчык.

Аляксандр стаў займацца спортам з 13 гадоў. У веславанне яго пацягнуў зямляк, які займаўся гэтым відам спорту і адчуў, што ў хлопца павінна атрымацца. Так і адбылося: у Бабруйску Аляксандр стаў паказваць добрыя вынікі.

Далей старэйшы брат загітаваў малодшага, і ўрэшце іх паставілі ў пару. Бацькі не перашкаджалі сынам пайсці ў вялікі спорт, тым больш што сама Людміла Альбінаўна — спартсменка-аматарка, займалася валейболам.

Цяпер браты Багдановічы жывуць у Бабруйску, і пакуль 26-гадовы Аляксандр і 22-гадовы Андрэй — зайздросныя халасцякі. Маці адкрыла сакрэт, што ў старэйшага сына ёсць дзяўчына, таму, можа, і вяселле не за гарамі. Пакуль жа Людміла Альбінаўна з мужам рыхтуюцца да прыезду ў бацькоўскі дом залатых чэмпіёнаў і шпарка робяць рамонт у кватэры.

Адразу пасля пераможнага выступлення братоў у гэтай кватэры сабралася шмат народу: сваякі, сябры, суседзі. Зразумела, тэлефанаванні без перапынку: з алімпійскай перамогай віншуюць усе знаёмыя ялізаўцы, журналісты, прадстаўнікі ўлады.

— Калі шчыра, то я спадзявалася на медалі, — гаворыць маці. — Праўда, наконт «золата»... Вельмі ўжо сур'ёзныя ў іх былі сапернікі. Але атрымалася! Што далей зменіцца ў жыцці сыноў? Будуць працаваць і далей працягваць радаваць Беларусь сваімі перамогамі. Я іх толькі заўсёды папярэджваю, каб не закружыліся іх галовы ад поспехаў і не напаткала «зорная» хвароба. Але яны, добрыя хлопцы і працаўнікі з самага дзяцінства, адолеюць усё. Мы віншуем іх з перамогай!

— Так, увесь пасёлак віншуе бацькоў Багдановічаў! — пацвердзіў старшыня Ялізаўскага пасялковага Савета Рыгор Александровіч. — І мы ім рукі пацiснем. Параімся з кіраўніцтвам шклозавода, як адзначыць такую падзею. Але пачакайце яшчэ: сёння будзем хварэць за Багдановічаў на 500-мятроўцы. Павінны нашы выступіць дастойна!

**Ілона ІВАНОВА.**

# БЕЛТЭХАГЛЯД РАІЦЬ ВАДЗІЦЕЛЯМ НЕ ЗЛОЎЖЫВАЦЬ ЦЮНІНГАМ АЎТАМАБІЛЯЎ

**Вадзіцелям, якія збіраюцца зрабіць цюнінг сваіх аўтамабіляў, варта памятаць аб тым, што з некаторымі «паляпшэннямі» будзе немагчыма прайсці дзяржаўны тэхнічны агляд. Аб гэтым заявіў начальнік упраўлення арганізацыі дзяржаўнага тэхнічнага агляду УП «Белтэхагляд» Аляксандр Кудраўцаў.**

У прыватнасці, ён праінфармаваў, што катэгарычна забаронены допуск да ўдзелу ў дарожным руху аўтамабіляў з нанесенымі на кузаў малюнкамі, у тым ліку аэраграфіяй, а таксама з наклейкамі на кузаве. Выключэнне складаюць толькі наклейкі аб прыналежнасці да краіны — «BY», наклейкі аб допуску да ўдзелу ў дарожным руху, якія выдаюцца пасля праходжання тэхагляду, а таксама належным чынам аформленая рэклама.

Таксама не пройдзе дзяржаўны тэхнічны агляд уладальнік няпоўнапрываднога аўтамабіля, на якім наперадзе капота ўстаноўлены металічныя дугі — так званы «кенгуратнік». Гэта забарона звязана з павышанай траўманебяспекай для пешаходаў. Устанаўліваць «кенгуратнікі» дазваляецца толькі на пазадарожніку.

Да ўдзелу ў дарожным руху дапускаюцца аўтамабілі, абсталяваныя так званым антыкрылом заводскага вырабу, за выключэннем металічных антыкрылаў, якія высока падняты над багажнікам.

Не ўзнікне праблем, калі аўтамабіль абсталяваны спартыўным рулём і дэкаратыўнымі абвесамі і накладкамі. Аднак пры выкарыстанні гэтых элементаў не павінна ўносіцца змяненняў у канструкцыю аўтамабіля.

**Кар. БЕЛТА.**

Здарэнне

# УРУКАПАШНУЮ НА ВАЎЧЫЦУ. ШАЛЁНУЮ

**Нядаўна ў Жлобінскім раёне адбыўся такі выпадак. Жыхарка вёскі Кароткавічы была ўстрывожана тым, што вячэрняе неба (было каля 22 гадзін) пачалі паласаваць зігзагі маланак, і пайшоў дождж, які мог намачыць у агародзе сена. Каб накрыць яго, яна выйшла з хаты, і тут на яе накінуўся нейкі звер і ўчапіўся ў нагу.**

Жанчына залямантавала, і на яе крык выбег гаспадар, які пайшоў у наступленне на звера. Гэта была, як высветлілася пасля, мацёрая ваўчыца. Завязалася барацьба. Мужчына спрабаваў (гэта было правільнае рашэнне) запусціць руку ў пашчу звера або здавіць яго горла, што не ўдавалася зрабіць да канца. Дапамога прыйшла з боку пацярпелай, якая ўзброілася гаспадарчымі віламі, і суседа, які прыхапіў з сабой нож.

Утраіх яны справіліся са зверам. Мужчына атрымаў некалькі сур'ёзных укусаў і звярнуўся да ўрачоў, а ваўчыца была прызнана работнікамі ветэрынарнай лабараторыі шалёнай. Пацярпелыя зараз праходзяць лячэнне.

Як паведамілі нам у Гомельскім абласным цэнтры гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, гэта, на жаль, далёка не адзіны выпадак «прагулак» шалёных звяроў па населеных пунктах. Так, у вёсцы Церахоўка Добрушскага раёна сёлета зімой раніцай вандравала ліса, якую забіў паляўнічы. Наведваліся патрыкееўны і ў дачныя кааператывы, у населеныя пункты Чачэрскага, Петрыкаўскага, Нараўлянскага, Буда-Кашалёўскага і іншых раёнаў.

— У сярэднім за год, — расказала нам работніца вышэйпамянёнага цэнтра Таццяна Навуменка, — па медыцынскую дапамогу ў вобласці звяртаюцца да чатырох тысяч чалавек, якіх пакусалі дзікія звяры і свойскія жывёлы. Сёлета за першае паўгоддзе такіх было 2030 чалавек. У 367 выпадках людзям давялося пралячыцца.

— А ці былі выпадкі, каб шаленства перадалося пацярпелым? — спытаў я.

— За апошнія 30 гадоў яны зафіксаваны не былі, аднак гэта не прычына для самазаспакаення, —адказала Таццяна Віктараўна.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

Бяседныя песні

# БЫВАЙЦЕ ЗДАРОВЫ

**З усялякай нагоды збіраецца люд на застолле. Каб адзначыць, вырашыць, паразумецца... І характар бяседы па-рознаму выяўляецца, але яе заўсёды ўраўнаважвае песня.**

**Як бы ні вёўся рэй, а рана ці позна ён мусіць закончыцца. І гаспадары падаюць таму знак: ставяць на стол звар (кампот) ці квас, а мяшчане — гарадскія жыхары — прапаноўваюць гасцям чай, каву.**

**Але ж і госці павінны ведаць меру, адчуваць час (улічыць дарогу дамоў і гаспадарскі клопат на ўпарадкаванне пасля застолля). А каб бяседная хата ласкава прыняла ў наступны раз, трэба развітацца з ёй: самім адчыніць дзверы (патрымацца за дзвярную ручку), не чакаць, пакуль гэта зробяць гаспадары...**

**І тут гучала песня — «Бывайце здаровы». Госці паведамлялі пра час развітання. Гаспадары, падтрымліваючы далікатнасць бяседы, прапаноўвалі апошнюю чарку. Яе называлі па-рознаму: расхадуха (пара разыходзіцца), адыходная і ад'язная, аглаблёвая (пры запраганні коней). Ад расіян перанялі «на пасашок» (час даставаць кій перад адыходам). «Бывайце здаровы» гучала і за сталом як апошняя песня, і пры развітанні. З ёй і ад'язджалі госці, разыходзіліся па хатах...**

**Песня «Бывайце здаровы» была надзвычай папулярная ў сярэдзіне мінулага стагоддзя. Пасля перакладу яе тэксту Міхаілам Ісакоўскім стала і рускай народнай песняй. Бытуе ў варыянтах. Аднак энцыклапедычныя выданні называюць яе аўтараў — паэт Адам Русак і кампазітар Ісак Любан.**

**БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ ПЕСНЯ**

*Бывайце здаровы,*
*Жывіце багата,*
*Ужо мы паедзем*
*Дадому, дахаты.*
*Ў зялёнай дуброве*
*Мы начаваць будзем.*
*Эх! Вашае ласкі*
*Вавек не забудзем.*
*У вашым калгасе*
*Шырокае поле,*
*Няхай жа на шчасце*
*Цвіце ваша доля.*
*На рэчках на вашых*
*Бурлілі бы воды,*
*Каб плавалі з крыкам*
*Гусей карагоды.*
*Каб жыта у полі*
*Трубою вілося,*
*Каб сала у хаце*
*Кублами вялося.*
*Штодзень у капусце*
*Каб плавала шкварка,*
*А к скварцы часінай*
*Вялася б і чарка.*
*Яшчэ вам жадаем*
*Прыбытку у хаце:*
*Не мала, не многа —*
*Штогод па дзіцяці.*
*Не будзе вам крыўды*
*Яшчэ і за тое,*
*Калі пашанцуе —*
*На год і па двое.*
*Бывайце здаровы,*
*Жывіце багата,*
*А мы ад'язджаем*
*Дадому, дахаты.*

**Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.**

На конкурс апавяданняў

***Анатоль Бігайдараў — журналіст. З самага распаўсюджанага і, што таіцца, не заўсёды ацэненага племені рупліўцаў пяра, племені журналістаў раённых газет. Ціха і непрыкметна піша прозу — прозу не толькі палёў і будоўляў. Гэта, спадзяюся, вы адчуеце па яго новым апавяданні, якое Анатоль, ужо лаўрэат нашага конкурсу, нядаўна даслаў у «Звязду».***

**Віктар КАЗЬКО.**

## Анатоль БІГАЙДАРАЎ

# ЁЛКІ-ПАЛКІ

— Каркаў-каркаў і, дзякуй табе, накаркаў!... Шчэ і, блін, за суткі да Новага года!.. — замест прывітання зласліва прабубнеў мой сусед Васіль Банцэўкін, саракапяцігадовы міліцыянер, ахоўнік аднаго з камерцыйных банкаў.

Зайшлі ў кабіну ліфта. Ад такога «дзячання» адчуваю сябе няёмка, аднак моўчкі торкаю руку ў вобласць Васілёва чэрава-гарбузякі, ручкаемся, так, без узаемнасці, нязвыкла вяла, як малазнаёмцы. Быццам і не пражылі дзверы ў дзверы, душа ў душу шаснаццаць гадкоў.

«А ты, сынок, менш журыся: пераржылі вайну — пераржывём і манеўры!» — узгадалася любімая прымаўка бацькі, і я энергічна ціскаю кнопку з адзінкай. Едзем.

Каму баліць, той і лямантуе:

— Шчэ й, блін, на маім дзяжурстве!.. Шчэ й за два месяцы да «дэмбеля»... Рапарт на тым тыдні аднёс камандзіру... Дазвольце, пішу-кугічу, таварыш падпалкоўнік, беднаму прапаршчыку міліцыі хоць паўгода пераслужыць... Трэба ж перад выхадам на пенсію работу годную знайсці — не ў грузчыкі ж!..

Я «не ў тэме», таму і не ўлажу, ківаю галавой і спачувальна падкрэктваю без пяці хвілін пенсіянеру. А сам думаю: «Няма такога зла, каб з яго камусь не выйшла дабро. Мабыць, надоечы, рабанулі-такі Васькаў банк!.. А ён, ёлупень, усё рапартуе!.. Яму, бачце, у сорак пяць на пенсію не хочацца... Работу добрую, чырвонагаловік, яшчэ не нагледзеў... Ты на скрут галавы бяжы ў бліжэйшую царкву — стаў па свечцы кожнаму святому, што ўратаваўся!...»

Прыйшлі на прыпынак. Ні аднаго аўтобуса! І так штораніцы — круглы год. Няма тае хусты, каб завязаць людзям вусны: маўляў, калі тут жыў «ікарусны тата» — дырэктар аўтапарка, — то машын хапала. І гэта чыстая праўда! «Хай бы ўжо наш «аўтобусны каралёк» нікуды адсюль і не з'язджаў, — слушна зазначалі найбольш практычныя пасажыры. — Грошай нямерана — будуй свой трохпавярховы катэдж тут, на беразе нашага возера. Што, збаяўся? А дарэмна, не ён першы, не ён апошні. З гэтага хоць карысць была б».

Мароз і ветрык з возера прабралі да касцей, калі, натужна пыхкаючы чорным смуродам, падрулiў брудна-жоўты аўтобус з «гармошкай».

У ягонае прамерзлае нутро прабіваемся толькі дзякуючы Васілёвым формам — фізічнай і міліцэйскай. Заадно і сагрэліся.

Разам ехаць хвілін трыццаць, да цэнтра горада: мне — прама на работу, а суседу — кругаля: яшчэ па пісталет, «паганялку» і ўказанні айцоў-камандзіраў.

За ўвесь рабочы дзень з Банцэўкіным стыкуемся разы тры. Часцей у сталоўцы, радзей — у разлікова-касавым аддзеле, куды звяртаюся па рабоце, ці ля ліфта. Банк займае амаль увесь першы паверх, а наша фірмачка — два пакойчыкі на дзявятым, апошнім.

— Ну хай бы ўкралі... адну... меншую... — ужо цішэй, больш памяркоўна, быццам аналізуючы версію, дудукае Вася. — Тады я хоць нешта магу змікіціць... Скажам, нейкі мужык прапівае «чырык», які жонка дала на набыццё навагодняй ёлкі... Дадому паражнячком не вернешся?.. Вось ён... у стане лёгкага ап'янення... і адважыўся...

А ў нашым выпадку? Крадуць не адну, а адразу тры яліны! Кожная — пад чатыры метры, шчэ й блакітная... Ясны дзень — дрэвы чыкнулі пад заказ. На рынку такія не выставіш — замятуць нашы!..

Злодзеяў, факт, было не менш як тры: адзін — на шухеры, а заадно і за рулём, двое — з пілою... Каб ім і іх наймітам рукі паадсыхалі па самыя плечы!..

Зараней, блін, разведалі, усё дэталёва абмеркавалі!.. А тады ноччу на мікрааўтобусе... машыну загналі пад самы банк, на спецпляцоўку, дзе ўдзень паркуе «шкоду» кіраўнік...

— А ты што, спаў?.. У акно ж усё бачна... — зусім ненапіраючы на слова «спаў», звяртаюся да Банцэўкіна. Цяпер і я ў тэме. Да мяне нарэшце дайшло, што яго так моцна ўзрушыла. Між тым, толькі сёлета я на поўным сур'ёзе двойчы папярэджваў: «Хоць меншым ялінам паскручвай цішком вярхушкі!.. Сорам вочы выесць, калі ёлкі пакрадуць! Ды які дурань палезе на ражон: ліхтар, пражэктар, круглясутачная ахова, на ганку — відэакамера!»

Выйшла ж па-мойму. Васіль, бачце, і закрыўдаваў: маўляў, гэта я накаркаў...

— Якое там «спаў»! — і зімою рабаваты твар Васіля запунсавеў ад абурэння. — Ды нас камандзіры «адведваюць» часцей дыхання!.. А шчэ й тэлефоны, рацыя!.. А рассядаць перад акном міліцыянеру забарона, да ўсяго на акне — ралеты, жалюзі... Зрэшты, блін, за падворак і вуліцу мы не ў адказе! Для таго ёсць вартаўнікі, гарадскі патруль, участковы...

— Тады чаму ты зранку душу шманаеш, чаму так шаршнееш? — кажу я, хоць разумею: кідаецца «блінамі» Васіль не без падставы. Яму, відаць, ужо нагарэла ад камандзіра аддзялення. Нагарыць яшчэ і сёння. Мно-о-га больш. Да пахі даб'юць не банкаўскія, а ўзводны, ротны і камбат...

Пасажыраў у салоне ўсё меншае і меншае: у цэнтры працуюць нямногія, а на дарагі тутэйшы рынак у будні нашы людзі не ездзяць.

Цяжка пасопваючы, сусед ладкуе ямчэй на плячы лямку чорнай сумкі, затым лезе ў бакавую кішэню курткі, дастае бэзавага колеру насоўку і трэ ёю па ўзмакрэлым твары, затым здымае шапку і паспешліва працірае лысіну. Праз хвіліну, азірнуўшыся, Васіль займае край даўно пуставаўшага сядзення і соўгаецца бліжэй да акна, пачынае па-дзіцячаму хукаць на мерзлае шкло. Я стаю побач. Суседа мне шкада.

А міліцыянер роўна хукаў на шкло і думаў, думаў:

«Добра, калі да нашага ўпраўлення гэтая гісторыя пра ёлкі дойдзе не сёння-заўтра, а, скажам, праз тыдзень... Хоць што з таго: на смерць няма зёлак... Пагоны, лічы, на нітцы вісяць!.. Ды што пагоны, і сама пенсія — на сухі лес!»

— Наступны прыпынак «Завод Кірава», — бадзёра абвяшчае вадзіцель.

— Васіль Леанідавіч, выходзім?

— Каб ты ведаў, як мне не хочацца сёння ісці на развод!.. Там жа, блін, сотня нашых «жарабцоў» — усе вочы праглядзелі! — Васю чакаюць, каб парваць кішкі з рогату!

— Кінь дурное, адкуль ім што вядома?

— Адкуль? Ды з нашай жа дзяжуркі!.. Думаеш, ніхто з маладых дасюль не рассарочыў такую навіну па батальёне?.. Эт, сусед, шкада, што з «дзядоў» у аддзяленні засталіся толькі Віцька-камандзір ды я... «Дзяды» сваіх на смех выстаўлялі!..

...Да месца работы я дабег хутка: тратуары з ночы былі шчодра «падпясочаны». Цікава, чаму гэта дворнікі ў цэнтры працуюць намнога спрытней і якасней, чымсьці іх калегі са «спальных» мікрараёнаў? Можа, «цэнтравым» што даплачваюць, так бы мовіць, адмэрваюць?

Мінуўшы наш, галоўны, ганак — стары, з пабітымі бетоннымі прыступкамі, я спакваля падыходжу да суседняга, банкаўскага, — мармуровага, з бліскучымі, пад золата, парэнчамі. Хачу няспешна, дэталёва агледзець месца Васілёвай ганьбы. Дзіўна, але ні сінякі, ні цавінкі — нічога такога не прыкмячаю. Вяртаюся, зварочваю на спецпляцоўку, на якой ужо стаіць знаёмая іншамарка (і багатым не спіцца). А дзе ж сляды крадзяжу? Ні пянькоў, ні пілавіння, ні галінак ці хоць іголак... Гурбы снегу і тыя не парушаны...

Стаяць і яліны. Стаяць годна, вольна, пацвельваючы сінічак-жаўтлячкоў купкамі шышак-сасулек... Але стоп! Нештачкі хохліць вока. Ага!.. Наш ельнік і сапраўды нехта «прарадзіў»! Пятнаццацімятровыя елкі засталіся, а чатырохмятровых, тых, што цягнулі свае колкія і ліпкія лапы ў акно дзяжуркі, не стала.

Звезлі іх і, зразумела, яшчэ ўчора рэалізавалі «белым людзям Белай Русі», тым, у каго столі ў катэджах пад пяць метраў...

Я зірнуў на гадзіннік — роўна восем. Увішна слізгаю на работу: мой шэф з маладых, але ранні. І ў прамым сэнсе.

Сеўшы за пісьмовы стол, «пераварваю» ўсё ўбачанае.

«Ёлкі ўкрала добра арганізаваная група», — канстатаваў раніцай Васіль..

Што ж, з гэтай яго тэзай нельга не пагадзіцца. Але відавочна і іншае: аператыўна ліквідавалі сляды начнога злачынства не менш вопытныя таварышы, якія вокамгненна, хітра-мудра правялі такую маскіроўку. А дзе такія хлопцы — дэсантура, пагранцы?

Упэўнены на ўсе сто: дарэмна прапаршчык Банцэўкін грашыў на моладзь свайго аддзялення! Сон на заўтра адкладзі, а справу сёння давядзі... Гэта ж яны ўсё і падчысцілі: добра там жывецца, дзе гуртам сеецца і жнецца!

...Пра знікненне трох блакітных ялін з-пад акна ахоўнікаў банка ніхто з тутэйшага начальства не празнаў да самага цяпла. Такое бывае не часта.

У пачатку красавіка, калі, як масла на патэльні, распаўзліся апошнія гурбы заляжалага снегу, удзельнікі традыцыйнага суботніка разам з мінулагодняй ігліцай, шышкамі, іншым смеццем выграблі на свет божы з-пад лапніку адной са старых ялін тры ладныя смалістыя паленцы, а неўзабаве «засвяціліся» і тры пянькі...

З гэтай нагоды асабліва абураўся-пліскаў слінай начальнік службы бяспекі банка, былы палкоўнік міліцыі Макар Эдмундавіч Драч.

Драч шкадаваў не ёлак, пярун іх калядны спалі. Яго свая ржа тачыла: «Эттта... паччаму... ніхто не далажыў!»

Цікава, што сталыя фінансісты навіну нават не абмяркоўвалі. Яны эмацыянальна больш устойлівыя, і зусім ніякія гурткоўцы, калектывісты. Вы паспрабуйце, дзеля смеху, узгадаць хоць бы аднаго банкіра-агітатара, банкіра-рэвалюцыянера! Юрысты, настаўнікі, інжынеры, афіцэры былі, салдаты, матросы, рабочыя і нават сяляне былі... А банкіраў не было.

Дробныя «каменьчыкі», кшталту «толькі і ўмеюць, што па сто разоў на дзень дакументы правяраць», раз-пораз кідалі ў бок «банкаўскіх міліцыянераў» самыя юныя фінансісты — унукі і ўнучкі былых партыйна-камсамольскіх функцыянераў. Яны, гімназісты-аднакласнікі і студэнты-аднакурснікі, пакуль яшчэ кучкаваліся.

...Суботняя знаходка, гвалт, узняты кіраўніком службы бяспекі банка, гарантавалі абавязковую «разборку палётаў» у кабінеце кіраўніка. Апошні, набыўшы без адрыву ад вытворчасці ажно шэсць постсавецкіх дыпломаў, заставаўся інтэлігентам у першым пакаленні, таму размаўляў з тымі, «хто ніжэйшы ростам», без паўзаў і не прасейваючы слоў са свайго лексікону.

...Загадчык гаспадаркі банка Антон Казіміравіч Няпруха, які за савецкім часам выкладаў родную мову ва ўніверсітэце, быў першым і адзіным, хто не толькі адразу заўважыў адсутнасць ёлак, але і асабіста дапамагаў маскіраваць месца злачынства. Спачатку Васілю а шостай раніцы, а затым і маладому зменшчыку Мішу, і камандзіру аддзялення Віктару.

Няпруха вёў складаную гаспадарку банка трэці год, дбайна, асцярожна, нават насцярожана, «даючы Богу шанц падмагчы мне ў новай прафесіі». Банкіраў, хай і новых, 55-гадовы кандыдат філалогіі, мякка кажучы, пакуль не палюбваў, дакладней, любіў іх на парадак менш, чымсьці, скажам, міліцыянераў.

А таму свайму босу, земляку і аднакласніку, за якога з восьмага класа пісаў сачыненні, загадчык гаспадаркі банка Няпруха «на разборцы палётаў» — пачціва і на «вы» — абвясціў наступнае:

— Мікалай Васільевіч, ніякага крадзяжу ялін не было. Толькі рарытэтныя тупні палезуць з пілою пад міліцэйскае акно. Дзе дрэвы? Паспільваў. Чаму ноччу? А так спакайней. У прыватнасці, не трэба кожнаму тлумачыць, што аперацыя «ёлкі-палкі» — рэалізацыя вашай дырэктывы. Не памятаеце? Тым летам ладная шышка мінскаму аўдытару па галаве трэмкнула!.. Тады вы і загадалі: «Усё жывое ў радыусе пяці метраў па перыметры стаянкі маёй «шкоды» — пад сякеру». Цяпер — парадак. Вечарам ваш «даішнік» спецзнак падвязе — установім. Слуп я ўжо ўкапаў».

* * *

...Абласное міліцэйскае начальства пра тое прыкрае перадвнавагоднняе здарэнне так нічога і не даведалася — ніхто не далажыў. Чаго не хочацца самому — не рабі другому. Лагічна.

Мой сусед Банцэўкін, як жадаў, яшчэ амаль тры гады пасля законных дваццаці пяці без прыгод прасядзеў дзяжурным, вартаваў камерцыйны банк. Сёння Васіль Леанідавіч атрымлівае добрую — «нерабочасялянскую» пенсію і, блін, працуе. У ахове мясакамбіната. Як кажа мая цешча, хто на што вучыўся.

*г. Гомель.*



## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ 24.09.2008 г.

**Фонд «Минскгоримущество» (Продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (Организатор аукциона) проводят открытый аукцион по продаже объектов коммунальной собственности г. Минска**

| | Лот № | 1 | 2 |
|---|---|---|---|
| 1 | **Наименование и местонахождение объекта, тип и характеристика помещения** | Не завершенный строительством объект — «Магазин промышленных товаров в жилом доме № 2 по генплану со встроенными помещениями. Жилой район Дружба. Микрорайон Дружба-3 (1-я очередь строительства)» | Не завершенный строительством объект — «Магазин продовольственных товаров в многоквартирном крупнопанельном жилом доме по генплану № 18 со встроенными помещениями в застройке микрорайона «Сухарево-4» (2-я очередь строительства)» |
| 2 | **Общая площадь* (м.кв.)** | 1203,60 | 735,30 |
| 3 | **Начальная цена продажи (руб.)** | 1 700 000 000 | 530 000 000 |
| 4 | **Сумма задатка (руб.)** | 170 000 000 | 53 000 000 |
| 5 | **Сроки оплаты объекта** | Оплата за объект производится в течение 30 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи. | Оплата за объект производится в течение 30 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи. |
| 6 | **Характеристика строения** | Фундаменты – сборные железобетонные; стены наружные – из блоков керамических крупноразмерных поризованных; стены внутренние – из кирпича КРПУ – 150/15/СТБ 1160-99; перегородки – из кирпича полнотелого КРПУ; перекрытие – плиты шифр 0-312; полы – бетонные, линолеум, керамическая неглазурованная плитка. Степень готовности объекта по состоянию на 01.05.2008 г. – 63 %. | Фундаменты – свайные из забивных железобетонных свай с монолитными железобетонными ростверками под стены; стены наружные – трехслойные: наружный слой – кладка из блоков «Бессер», внутренний слой – кладка из кирпича КРПУ, утеплитель – плиты пенополистерольные; стены внутренние – из эффективного кирпича КРПУ; перекрытие – плиты шифр 0-312; ; полы – бетонные, линолеум, керамическая неглазурованная плитка. Степень готовности объекта по состоянию на 01.05.2008 г. – 24 %. |
| 7 | **Условия продажи объекта** | Сохранить функциональное назначение объекта. Возместить сверх цены продажи затраты в течение 30 календарных дней с момента подписания акта приема-передачи объекта стоимости дополнительных проектно-изыскательских, строительно-монтажных и прочих затрат, понесенных заказчиком (УП «УКС Мингорисполкома») по строительству объекта после даты оценки до даты подписания акта приема-передачи. Возместить сверх цены продажи затраты в течение 30 календарных дней с момента подписания акта приема-передачи объекта стоимости дополнительных проектно-изыскательских, строительно-монтажных и прочих работ по инженерным сетям, благоустройству и озеленению по состоянию на 01.05.2008 в сумме 214 703 270 руб. – по лоту № 1, 104 066 940 руб. – по лоту № 2, проиндексированных на дату их перечисления по индексам изменения стоимости строительно-монтажных работ по элементам затрат по г. Минску по ресурсно-сметным нормам (для работ, не освобождаемых от налога на добавленную стоимость). Компенсировать УП «УКС Мингорисполкома» затраты по выплате земельного налога с момента принятия объекта по акту приема-передачи до оформления правоустанавливающих документов на земельный участок. | |

* *Сведения о площадях объектов, не завершенных строительством, даются на основании проектно-сметной документации.*

1). Аукцион состоится **24 сентября 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

2). Для участия в аукционе необходимо представить в адрес УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы: заявление на участие в аукционе по установленной форме;

юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность;

представителям физических лиц – резидентов Республики Беларусь – нотариально заверенную доверенность;

юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

- документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иным финансово-кредитным учреждением, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

- представители юридических и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

При подаче документов на участие в аукционе представитель юридического лица должен представить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а также документы, подтверждающие его полномочия на участие в аукционе и на подписание документов:

- руководитель юридического лица – документ о его назначении или избрании, а при необходимости – документ о его полномочиях, согласно уставу юридического лица;

- иные представители – доверенность, оформленную согласно учредительным документам юридического лица.

Физическое лицо (или его представитель, участвующий в аукционе по доверенности, удостоверенной нотариально) должно представить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

соглашение о правах и обязанностях сторон;

заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение: а) задатка в сумме 10 % начальной цены;

б) платы за участие в аукционе в размере 4-х базовых величин. Денежные средства перечисляются на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов по каждому лоту признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается в течение 10-ти рабочих дней с даты проведения аукциона. Оформление акта землепользования производится Покупателем.

Победитель аукциона обязан произвести оплату организатору аукциона за подготовку и проведение аукциона в размере 4 процентов от начальной цены продаваемого объекта и 5 процентов от суммы превышения цены продажи над начальной.

Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **23 сентября 2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок: 227 40 22. Интернет: www.mgcn.by** УНП 190398583

# ТРАДЫЦЫІ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ ДОЎЖАЦЦА І РАЗВІВАЮЦЦА

## Пра гэта аргументавана расказаў карэспандэнту «Звязды» намеснік міністра інфармацыі Ігар ЛАПЦЁНАК

**Акурат гэтымі днямі завяршальную стадыю праходзяць падрыхтоўчыя мерапрыемствы да юбілейнага XV Дня беларускага пісьменства, які адбудзецца 7 верасня ў Барысаве.**

**Мы гутарылі не толькі пра асаблівасці сёлетняга свята, але і пра непасрэдных прадаўжальнікаў Скарыны — паліграфістаў, і іх справы. Ігар Мікалаевіч паспрабаваў зрабіць і асцярожныя прагнозы адносна будучыні кнігадрукавання...**

***— Дзень беларускага пісьменства — свята ўсеагульнае. І ўсё ж, па вялікім рахунку, вытокі свята пачынаюцца ад кніг Францыска Скарыны, а значыць...***

— Сапраўды, не будзе памылкаю сказаць, што гэта асноўнае свята кнігавыдаўцоў, паліграфістаў і кнігараспаўсюджвальнікаў. Хоць, як вядома, доўгі час лічылася, што 5 мая, Дзень друку, — агульнае свята і журналістаў, і паліграфістаў, друкароў, выдаўцоў. Аднак напрамак гэтых прафесій адрозніваецца. Адна справа — аператыўная журналістыка, і зусім іншая — падрыхтоўка грунтоўнага, сталага, трывалага, на доўгія гады выдання. Кніга жыве не дзень і не год, а многія гады і нават стагоддзі.

У нас вельмі цікавая кнігавыдавецкая гісторыя, якая каранямі ідзе ў сівую даўніну. І чаму пра гэта было не сказаць на ўвесь голас?

***— Ужо стала добрай традыцыяй — праводзіць свята ў першую нядзелю верасня...***

— Скажу шчыра: напачатку планавалі наладжваць свята беларускага пісьменства ў пачатку жніўня — менавіта ў гэты час у далёкім 1517 годзе выйшла першая кніга Францыска Скарыны. Аднак вырашылі, што падыходзіць да гэтага найважнейшага мерапрыемства па выключна фармальных крытэрыях будзе няправільна.

Бо жнівень — гэта і ўборка ўраджаю, і разгар водпускаў, і канікулы ў школьнікаў і студэнтаў. Таму і пазначана ва ўсіх календарах: першая нядзеля верасня — Дзень беларускага пісьменства.

***— І лагічна, і дыялектычна!***

— Прычым увесь час нам шчасціла з надвор'ем, вельмі прыгожыя дні былі. Самі нябёсы, сілы прыроды спрыяюць святу!

Дзень беларускага пісьменства праводзіцца, каб засведчыць, што ў нас ёсць даўнія культурныя набыткі, ёсць постаці, на прыкладзе якіх варта выхоўваць і адукоўваць моладзь, што нам ёсць чым ганарыцца.

***— У свята няма пастаяннай «прапіскі»?***

— Гэта было вырашана адразу, паколькі многія беларускія гарады маюць цікавую гісторыю.

Свята беларускага пісьменства праводзіцца з 1994 года. Першае адбылося ў старажытным Полацку. Сталіцамі Дня беларускага пісьменства станавіліся таксама Тураў, Навагрудак, Нясвіж, Орша, Пінск, Заслаўе, Мсціслаў, Мір, Камянец, Паставы, Шклоў.

Асаблівасцю юбілейнага Дня беларускага пісьменства стане Фестываль гарадоў, якія ўжо прымалі свята. Гэта гістарычныя цэнтры культуры, навукі, літаратуры і кнігадрукавання.

Традыцыйна свята пачынаецца з навукова-асветніцкай экспедыцыі «Дарога да святыняў». Яна пачынаецца прыкладна за тыдзень да цырымоніі адкрыцця, у ёй удзельнічаюць навукоўцы, святары, дзеячы культуры і мастацтва. Шлях асвятляе лампада ад Труны Гасподняй. Агонь дастаўляецца на самалёце з Іерусаліма ў Беларусь. Падчас экспедыцыі праводзіцца шырокая асветніцкая праца.

***— Барысаў прыгажэе на вачах!***

— Горад сур'ёзна рыхтуецца да свята. Добраўпарадкоўваецца і рамантуецца. Прыводзяцца ў парадак дарогі. Развіваецца прыдарожны сэрвіс: госці свята не павінны мець аніякіх побытавых праблем. Тым больш што ў іх будзе магчымасць павітацца з Францыскам Скарынам, Міколам Гусоўскім, Кірылам Тураўскім, іншымі вядомымі гістарычнымі асобамі. І з сучаснымі!

Канцэрты, віктарыны, атракцыёны, гульні, святочны феерверк...

Будзе некалькі экспазіцыйных палатак: старажытнае друкаванне і сучаснае. Будуць прадстаўлены ўсе цэнтральныя сродкі масавай інфармацыі сваімі пляцовачкамі і мясцовая рэгіянальная прэса, маладзёжная. Уладкуецца і Горад Майстроў, дзе ўсе ахвотныя змогуць набыць арыгінальныя вырабы.

Паспрабуем паказаць і новы напрамак паліграфічнай вытворчасці — стварэнне электроннай кнігі і перш за ўсё падручніка. Пакуль што гэта своеасаблівае суправаджэнне кнігі на электронным носьбіце. Але з цягам часу мы павінны выйсці на сапраўдны электронны падручнік, дзе на дыску будзе ўсё: і тэкст падручніка, і практыкаванні, і тэсты з праверачнымі «ключамі». Выдавецтва «Вышэйшая школа» стварае спецыяльны ўчастак — усё будзе!

У рамках Дня беларускага пісьменства апошнім часам абавязкова адкрываецца і помнік, звязаны з нацыянальна-культурнымі набыткамі нашага народа.

***— Гэта ўжо таксама добрая традыцыя свята!***

— А калі памятаеце, у Шклове адкрылі адразу два помнікі — Зорычу і Агурку. Таксама цікава: не забываемся пра мінуўшчыну і ствараем новыя арыгінальныя традыцыі!

***— А які помнік адкрыецца ў Барысаве?***

— Хочацца, каб гэта было сюрпрызам: мы ж запрашаем усіх чытачоў 7 верасня ў Барысаў!

Скажу толькі, што помнік адкрыецца ў адным з гарадскіх паркаў. Ён адлюструе гісторыю Дня беларускага пісьменства.


Фота БЕЛТА.

***— А можа, у Барысаве паспеюць і другі помнік падрыхтаваць — першаму алімпійскаму чэмпіёну-2008 Андрэю Арамнаву, ён жа таксама барысаўчанін!***

— Думаю, многія не былі б супраць (*смяецца*). Ведаеце, мы доўга думалі-шукалі «разыначку», характэрную толькі для Барысава. Гучала нават прапанова зрабіць помнік запалцы — але ж гэта не вельмі звязана з пісьменствам...

Андрэй Арамнаў будзе, безумоўна, ганаровым удзельнікам свята.

А ўвогуле мы запрашаем шмат гасцей. Чакаецца, што будуць прадстаўнікі больш як 30 краін свету. І перш за ўсё дэлегацыі славянскіх народаў з Расіі, Украіны, Славеніі, Славакіі, Польшчы, Сербіі... Карані нашых народаў цесна пераплятаюцца, ёсць шмат агульных тэмаў для абмеркавання.

Будуць абвешчаны вынікі 47-га Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі». За лепшае выданне статуэткі «Залаты фаліянт» атрымаюць пераможцы ў 12 намінацыях.

Другі год у рамках свята будзе праходзіць уручэнне літаратурных прэмій і статуэтак «Залаты Купідон». Калі летась уручалася толькі тры прэміі, то сёлета будуць уручаны прэміі творцам больш чым па 10 намінацыях.

***— Ігар Мікалаевіч, пераможцы ўжо, пэўна, вызначаны? Хто з літаратараў 7 верасня будзе прымаць віншаванні?***

— Мікалай Чаргінец, старшыня Саюза пісьменнікаў, вельмі строга папярэдзіў мяне: гэтага ніхто не павінен ведаць загадзя! Вы ж разумейце: губляецца інтрыга, няма ніякіх сюрпрызаў. А ў Барысаве ўсё будзе нечакана — а таму яшчэ больш цікава!

***— У такім выпадку, Ігар Мікалаевіч, калі адмовіліся даваць гэту інфармацыю «Звяздзе» — дазвольце ўзяць з вас слова, што іншыя газеты загадзя таксама не даведаюцца пра імёны пераможцаў?***

— Абяцаю! Супрацоўнікі Мінінфарма дамовіліся, што афіцыйна будзе абвешчана гэта інфармацыя толькі ў Барысаве.

Дадамо, што ў Дні беларускага пісьменства возьмуць удзел каля 120 членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі.

І яшчэ добрая навіна: рыхтуецца да выхаду беларуска-расійскі 50-томнік: па 25 тамоў ад краіны. Сёлета будзе канчаткова зацверджаны спіс аўтараў, а ў 2009-м пачнецца выданне.

***— Ігар Мікалаевіч, які б аспект Дзён пісьменства не закраналі, а размова ўсё роўна вяртаецца да «нашчадкаў Скарыны». У сувязі з гэтым — ці не змяншаецца ў нас вытворчасць «папяровых» кніг?***

— У мінулым годзе выдадзена 12 565 назваў агульным тыражом 49,5 млн экзэмпляраў.

***— І ў тым ліку на беларускай мове...***

— ...каля 8 працэнтаў: і па назвах, і па тыражу.

***— Каб уявіць тэндэнцыю — якая сітуацыя гэтага года?***

— За 6 месяцаў 2008 года выйшла 6762 кнігі тыражом 26,58 млн экзэмпляраў. Калі захаваецца гэты рытм, дык за 2008 год увогуле будзе павелічэнне і па назвах, і па тыражу.

***— Не за гарамі новы навучальны год...***

— Адразу скажу, што сёлета агульная замова на падручнікі крыху скарацілася. У працы цяпер 91 назва падручнікаў і дапаможнікаў, у тым ліку 34 назвы — для спецыяльных устаноў адукацыі. 80 назваў падручнікаў будуць выпушчаны ўжо да 1 верасня.

А ўвогуле за першае паўгоддзе 2008 года выдадзена 1480 назваў вучэбнай літаратуры агульным тыражом 5,7 млн экзэмпляраў — у тым ліку трыма выдавецтвамі сістэмы Мінінфарма («Народная асвета», «Вышэйшая школа», «Мастацкая літаратура») — 125 назваў агульным тыражом 1,852 млн экзэмпляраў.

***— Амаль 4 гады таму я прасіла вас зрабіць прагноз наконт таго, ці не знікне друкаваная кніга. Ваш прагноз быў тады аптымістычным. А цяпер?***

— І цяпер — таксама. Я аптыміст па жыцці. Нягледзячы на зручнасці найноўшых камп'ютарных тэхналогій, у іх маецца нямала і недахопаў. Да прыкладу, у мяне пытанне: а колькі часу на электронных носьбітах захаваецца інфармацыя? Кажуць: інфармацыя на дыску — 50 ці нават 100 гадоў можа захоўвацца. Але ж ніхто яшчэ не пражыў столькі, не бачыў, не пераканаўся! Дый увесь час трэба быць прывязаным да сілкавання. Да таго ж камп'ютар нярэдка «глючыць»... А на пляжы, на сонцы і ўвогуле нічога не ўбачыш на экране...

Кніга застанецца назаўсёды. А што да модных тэндэнцый — гэта ўжо шмат разоў было. Памятаеце размовы: «Са з'яўленнем тэлевізіі знікне кіно» і г.д. Нічога не знікла, кожны феномен цывілізацыі займае сваю нішу.

***— Нам, Ігар Мікалаевіч, застаецца пражыць усяго 50 ці 100 гадоў, каб пераканацца, што ёсць больш грунтоўныя інфармацыйныя носьбіты, чым кніга!..***

***Шчыра дзякую за цікавую гутарку.***

**Таццяна ПАДАЛЯК.**

Рассакрэчаны архіў

# ПАДРЫЎ РЭЖЫМУ: НЕЗАВЕРШАНАЯ СПРОБА

**Многія савецкія людзі слухалі ў 60-я «свабодныя» перадачы замежных радыёстанцый, дакладней, абрыўкі фраз, якія не поўнасцю глушыла шматмятровая вышка радыёстанцыі № 3... Многія савецкія людзі ненавідзелі тагачасны рэжым... Але адкрыта і нават са зброяй у руках процістаяць сацыялістычнай сістэме спрабавалі адзінкі. Такая «адзінка» і была «абясшкоджана» ў маі 1963 года ў Мінску.**

Дзяцінства Сяргея прайшло ў Магаданскай вобласці. Бацька трапіў у пекла ГУЛАГа яшчэ да вайны, а калі выйшаў са зняволення, пасяліўся, як і многія іншыя, каму пашанцавала выжыць, тут жа — у адным з Магаданскіх пасёлкаў. Магчымасць пакінуць злашчасны край і пераехаць у Беларусь Сяргеева сям'я атрымала, зразумела, толькі пасля смерці Сталіна. Хлопчыку на той момант было трынаццаць. У Мінску ён скончыў школу, паступіў у Беларускі політэхнічны інстытут. Абзавёўся і своеасаблівым хобі: лавіў гукі «Бі-бі-сі» і «Голасу Амерыкі». Слухаў, разважаў, запісваў найбольш важныя, на яго думку, фразы замежных аналітыкаў і рэпарцёраў. І, напэўна, пачутае знаходзіла своеасаблівае адлюстраванне ў душы чалавека, дзяцінства якога прайшло сярод людзей з паламаным зняволеннем лёсам...

Сяргееў план барацьбы з ненавіснай сацыялістычнай ідэалогіяй уключаў у сябе дзве задачы: вынішчэнне злашчаснай радыёвышкі-«глушылкі» і падрыў урадавай трыбуны падчас святочнай дэманстрацыі. План здаваўся не такім ужо і нерэальным. Па-першае, на ваеннай кафедры інстытута, дзе вучыўся Сяргей, навучалі акурат ваенна-інжынернай, а прасцей кажучы, сапёрнай справе. Аднак акрамя стараннага азнаямлення з патрэбнай літаратурай, Сяргей прыступіў да практычных дзеянняў. Памераў тэрыторыю радыёстанцыі, таўшчыню апор, разлічыў колькасць выбуховага рэчыва... Дарэчы, дзе можна было ўзяць апошняе? Усё аказалася не так і складана.

Неяк падчас практыкі студэнты знайшлі ля дарогі колькі артылерыйскіх снарадаў часоў Вялікай Айчыннай. Небяспечныя боепрыпасы захавалі тады ў глыбіні лесу. Цяпер Сяргей успомніў пра іх...

Адшукаўся і памочнік. У ліку аднадумцаў аказаўся Віктар, студэнт таго ж «палітэха». Удваіх яны знайшлі непадалёк ад горада Глыбокае сем артылерыйскіх снарадаў. Распілавалі іх на часткі, дасталі выбуховае рэчыва і паступова пачалі перавозіць арсенал у Мінск.

У хуткім часе да таварышаў далучыўся трэці кампаньён — Георгій, некалі асуджаны па адной крымінальнай справе. З гэтым вадзіцелем хлопцы пазнаёміліся на адным вяселлі. Несправядліва пакараны, якім ён сам сябе лічыў, Георгій намеціў пашырэнне і паглыбленне студэнцкага плана. У прыватнасці, змяненне палітычнай сістэмы шляхам дыверсійна-тэрарыстычных актаў і распаўсюджвання лістовак. Для здзяйснення такой шырокай мэты патрабавалася шырокае кола прыхільнікаў. І Сяргей з дапамогай малодшага брата раздабылі неяк на заднім двары друкарні... шэсць кілаграмаў рассыпнога шрыфту, які меркавалася прымяніць для друкавання лістовак.

Далей група падумала аб неабходнасці ўзбраення.



*Уратаваная вышка радыёстанцыі.*





*Снарады і шрыфты, адабраныя ў рассакрэчаных «падрыўнікоў».*

Хлопцам «трапіўся» не толькі ствол ад малакалібернага пісталета, але і чалавек, які браўся вырабіць зброю. Але ж не за «дзякуй», з-за чаго Георгій нават прапанаваў напад на аддзяленне міліцыі ці проста міліцыянера... Праўда, ад гэтай часткі плана было вырашана адмовіцца.

Усе намаганні сканцэнтраваліся на падрыхтоўцы выбухаў. У рэшце рэшт групе ўдалося авалодаць дзевяццю артылерыйскімі снарадамі, дзвюма мінамётнымі мінамі ды капсюлямі-дэтанатарамі. Захоўвалася ўсё гэта багацце ў студэнцкім інтэрнаце і на кватэры сяброўкі Сяргея.

На той момант, калі змагарам з сістэмай засталося толькі прызначыць дзень і час першага выбуху, Сяргей ужо знаходзіўся пад пільным наглядам супрацоўнікаў дзяржбяспекі...

Раніцай 27 мая 1963 года Сяргей быў затрыманы падчас перавозкі чарговага снарада. У той жа дзень арыштавалі Віктара, на наступны — Георгія. Следства працягвалася паўтара года. «Падрыўнікі» не адмаўляліся ад сваіх планаў, выдалі і выбуховае рэчыва, і снарады, і шрыфты. Сяргей і Георгій атрымалі па дзесяць гадоў зняволення, Віктар — восем.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
**Фота з архіва КДБ.**

## ГАЗМАНАЎ УЗНАЧАЛЬНІЦЬ «ЗАЛАТЫ ШЛЯГЕР»?

**Вядомы расійскі спявак можа стаць мастацкім кіраўніком міжнароднага музычнага фестывалю «Залаты шлягер», які праходзіць у Магілёве. Перамовы з Алегам Газманавым на гэты конт вядзе ўпраўленне культуры Магілёўскага аблвыканкама.**

Арганізатары фестывалю расказалі, што ў Газманава ёсць цікавыя прапановы і ідэі для правядзення «Залатога шлягера-2009». Яны будуць абмеркаваны бліжэйшым часам на сустрэчы са спеваком і яго творчай камандай.

«Гэта тым больш прыемна, што карані Алега Міхайлавіча паходзяць з Магілёўшчыны», — адзначыў начальнік абласнога ўпраўлення культуры Анатоль Сінкавец.

Сёлета ў межах «Залатога шлягера» на другую палову кастрычніка запланавана сольнае выступленне Газманава ў Магілёве. Публіку чакаюць таксама вялікі дзіцячы канцэрт і конкурс вакальна-інструментальных ансамбляў імя Уладзіміра Мулявіна.

**Ілона ІВАНОВА.**

*Совместное белорусско-британское предприятие «Кровля»*
*открытое акционерное общество*

*Могилевская область, г. Осиповичи, ул. Чапаева, 11*

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о созыве и проведении**
**внеочередного общего собрания акционеров**

Внеочередное общее собрание акционеров СП ОАО «Кровля» (далее — Собрание) состоится 5 сентября 2008 года в 14.00 по адресу: Могилевская область, г. Осиповичи, ул. Чапаева, 11, Дом культуры СП ОАО «Кровля».

Собрание проводится в очной форме.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в Собрании, будет осуществляться в день проведения Собрания по месту (адресу) проведения Собрания. Время начала регистрации: 11 часов 45 минут. Время окончания регистрации: 13 часов 45 минут.

Для регистрации участнику Собрания необходимо предъявить документ, удостоверяющий личность, а также, если необходимо, документы, подтверждающие его полномочия: доверенность и/или другие документы в соответствии с действующим законодательством.

Дата формирования реестра владельцев акций Общества для составления списка лиц, имеющих право на участие в Собрании: 1 сентября 2008 года.

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Об уменьшении Уставного фонда СП ОАО «Кровля».
2. О внесении изменений в Устав СП ОАО «Кровля».
3. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.

Ознакомление лиц, имеющих право на участие в Собрании, с информацией (документами), предоставляемыми при подготовке к проведению Собрания, осуществляется с 27 августа 2008 года по адресу: Могилевская область, г. Осиповичи, ул. Чапаева, 11, административный корпус, 2-й этаж, в рабочие дни с 9 до 16 часов, а в день проведения Собрания — во время и в месте проведения Собрания.

**Контактный телефон 22190.**

УНП 700078647 **Совет директоров СП ОАО «Кровля».**

36,6⁰

## «ЦІХАЕ» ПАЛЯВАННЕ на «гучны» цэзій

**Інакш і не назавеш паводзіны грыбнікоў, якія адпраўляюцца ў лясныя масівы Гомельшчыны, як кажуць, не ведаючы броду. Бо, напэўна, думаюць, што радыяцыя не для іх: памыем лясныя дары, паварым і — будзь здароў, таварыш радыенуклід. У сэнсе — капут яму.**

Але скажыце, калі ласка, як пазбавіцца ад гэтай нечысці ў тых жа баравіках, якія былі сабраны жыхарамі вёскі Абухаўшчына Калінкавіцкага раёна, калі ў іх рэспубліканскія дапушчальныя ўзроўні (нарматывы па цэзію) былі перавышаны амаль ў 11,5 раза! Або ў лісічках, правераных работнікамі санстанцый, — у чатыры разы. Іх сабралі жыхары пяці вёсак таго ж самага раёна і шасці — Веткаўскага, дзе перавышэнне РДУ яшчэ большае.

Дарэчы, спецыялісты абласнога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі ў мінулым месяцы ўзялі 1295 проб малака з прыватнага сектара, рыбы, грыбоў, ягад і г.д. на ўтрыманне тых радыенуклідаў, і ў 155 іх была процьма. А прыборы больш за ўсё зашкалілі, калі правяралася мяса дзікоў, упаляваных у лясах Ельскага, Добрушскага, Чачэрскага і Калінкавіцкага раёнаў.

Тое ж самае і з чарніцамі, сабранымі ў лясах паблізу вёсак Юркавічы Добрушскага і Сяльцы Веткаўскага раёнаў. РДУ там былі перавышаны адпаведна ў 31 і 17 разоў. І як тут павернецца язык сказаць: ешце на здароўе?

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## ПРЫТУЛІЛА МУРКА БОБІКАЎ

**Яна пасялілася ў пажарнай аварыйна-выратавальнай часці горада Рэчыцы і нарадзіла там кацяня. А тут без маці засталіся два шчанюкі.**

Вось іх і прынеслі Мурцы. Ці прыме? Прыняла. Лашчыць, корміць. Наперакор той прымаўцы: жывуць, як кот з сабакам?

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

Прамая лінія

ЗВЯЗДА — Беларускае радыё

# ДТЗ З УДЗЕЛАМ ДЗЯЦЕЙ БЫЦЬ НЕ ПАВІННА!

**Сёння каля паловы ДТЗ адбываецца па віне саміх пешаходаў. Але калі дарослыя свядома ідуць на парушэнне правілаў дарожнага руху, то дзеці робяць гэта, напэўна, з-за адсутнасці вопыту. Пік ДТЗ з удзелам дзяцей прыходзіцца на канец жніўня—пачатак верасня. Менавіта ў гэты час у школах пачынаецца новы навучальны год. Часцей за ўсё аварыі бываюць па віне саміх дзяцей, яны парушаюць правілы дарожнага руху. Але ёсць і іншая статыстыка: дзесьці ў палове трагічных выпадкаў дзеці былі проста пасажырамі транспартных сродкаў, яны сталі ахвярамі няўмелых дзеянняў дарослых. Як засцерагчы дзяцей ад здарэнняў на дарогах? Ці існуюць нейкія кардынальныя спосабы зніжэння ДТЗ з удзелам няпоўнагадовых? Што рабіць бацькам, каб іх дзеці не трапілі ў падобную сітуацыю? На гэтыя і іншыя пытанні на традыцыйнай «прамой лініі» Беларускага радыё адказала начальнік аддзялення агітацыі і прапаганды сталічнай Дзяржаўтаінспекцыі, маёр міліцыі Жанна Трайно. Як заўсёды, вёў праграму ў прамым эфіры радыёжурналіст Максім УГЛЯНІЦА. На гэты раз яму дапамагаў карэспандэнт «Звязды» Сяргей ДЗЕВЯТОЎСКІ.**

***— Жанна, колькі сёлета ДТЗ з удзелам дзяцей адбылося? Ці вядзецца наогул падобная статыстыка?***

— За сем месяцаў гэтага года ў Мінску адбылося 65 здарэнняў з удзелам дзяцей. На жаль, двое дзяцей загінулі, а яшчэ 64 атрымалі раненні. Для параўнання, летась за гэты ж прамежак часу ў ДТЗ загінула адно дзіця. А вось колькасць параненых дзяцей скарацілася. Нягледзячы на тое, што лічбы гавораць аб нейкай станоўчай тэндэнцыі, нас такая сітуацыя не радуе. Праца па прафілактыцы дзіцячага траўматызму ў выпадках ДТЗ вядзецца незалежна ад часу года.

***— Ці праўда, што ў апошні час колькасць здарэнняў павялічваецца, а вось колькасць загінулых дзяцей у ДТЗ памяншаецца? Гэта адпавядае рэчаіснасці? Або з году ў год сітуацыя мяняецца?***

— У Мінску зніжэнне агульнай аварыйнасці па ўсіх паказчыках. Зніжаецца колькасць саміх здарэнняў, а таксама загінулых і параненых людзей. Праўда, сёлета загінула два дзіцяці ў выніку ДТЗ. Гэта вельмі сумная статыстыка. Тут шмат фактараў і прычын. Думаю, што следства ўжо назвала вінаватых у гэтых здарэннях. Сталічная ж Дзяржаўтаінспекцыя ў сваю чаргу робіць усё магчымае для таго, каб прадухіляць няшчасныя выпадкі на дарогах.

***— А ці вядзецца статыстыка ўліку ДТЗ, у якіх вінаватыя самі дзеці?***

— У Мінску, можна сказаць, мы ўжо навучылі дзяцей правілам паводзінаў на дарогах. Хутчэй за ўсё, менавіта таму большасць здарэнняў на дарогах адбываецца па віне дарослых. Сёлета ў сталіцы склалася такая сітуацыя, што з 65 ДТЗ, у якіх удзельнічалі дзеці, 43 дзіцяці пацярпела ў якасці пешаходаў, 16 — як пасажыры і два — як веласіпедысты. Зразумела, што дзеці-пасажыры пацярпелі не па сваёй віне. Часцей за ўсё падобныя здарэнні адбываюцца з-за таго, што вадзіцелі парушалі правілы перавозкі дзяцей, не выкарыстоўвалі аўтамабільныя дзіцячыя крэслы. Нядаўна сталічная Дзяржаўтаінспекцыя праводзіла акцыю «Дзеці-пасажыры» для прапаганды выкарыстання дзіцячых аўтамабільных крэслаў. У Еўропе, у Расіі выкарыстанне падобных крэслаў абавязковае, мы ж пакуль што можам толькі рэкамендаваць іх.

***— Жанна, у якіх месяцах часцей за ўсё адбываюцца здарэнні на дарогах з удзелам дзяцей? Ці ёсць наогул нейкая спецыфіка падобных ДТЗ у сталіцы?***

— Большасць здарэнняў адбываецца на пешаходных пераходах. Дзеці ўжо ведаюць, дзе трэба пераходзіць дарогу. Менавіта вадзіцелі часцей за ўсё вінаватыя ў здарэннях з удзелам дзяцей. Гэта адбываецца з-за элементарных парушэнняў правілаў дарожнага руху. У выніку здараюцца наезды на пешаходаў, часта на дзяцей.

***— Якімі павінны быць паводзіны вадзіцеляў, якія вязуць у аўтамабілі дзяцей?***

— Абавязкова неабходна выкарыстоўваць рамяні бяспекі або дзіцячыя аўтамабільныя крэслы. Калі вадзіцель знаходзіцца за рулём і перавозіць дзіця, то ён павінен быць утрая больш уважлівым і выконваць усе правілы дарожнага руху. Варта і лішні раз перастрахавацца. Напрыклад, пры дапушчальнай хуткасці 50 км можна ехаць і больш павольна. Варта адмовіцца ад лішніх манеўраў, абгонаў. Лепш перастрахавацца, бо на дарозе можа ўсякае здарыцца. Да таго ж на нашых дарогах ёсць не толькі тыя вадзіцелі, якія выконваюць правілы дарожнага руху, але і тыя, якія іх парушаюць. Заўсёды трэба быць асабліва асцярожным і прадбачлівым. Ніколі не трэба трымаць дзіця на руках. Для гэтага існуюць крэслы, якія каштуюць не так ужо і дорага.

***— Скажыце, а як засцерагчы дзяцей-веласіпедыстаў ад небяспечных сітуацый на дарогах?***

— Дзеці могуць выязджаць на дарожную частку толькі з дванаццаці гадоў. Да гэтага часу яны павінны катацца ў дварах, у парках. Цяпер светлавы дзень пачынае змяншацца, таму нагадаю, што ў цёмны час сутак усе пешаходы і веласіпедысты павінны пазначаць сябе святлоадбівальнымі элементамі.

***— Не так даўно з'явілася інфармацыя наконт таго, што ў хуткім часе будзе абавязковай сертыфікацыя святлоадбівальных элементаў. Гэта праўда?***

— Так, сапраўды, з першага верасня сертыфікацыя святлоадбівальных элементаў стане абавязковай. Усім трэба ведаць, што не ўсё, што блішчыць, лічыцца флікерам. Зараз улічваецца якасць. Літаральна год таму Дзяржаўтаінспекцыя правяла эксперымент, у выніку якога прыйшлі да высновы, што многія флікеры вельмі дрэнна бачныя ў цемры. Менавіта таму паўстала пытанне наконт абавязковай сертыфікацыі святлоадбівальных элементаў. Трэба пераходзіць ад колькасці да якасці.

***— Што раіць Дзяржаўтаінспекцыя дзецям-пешаходам? Як трэба паводзіць сябе на праезнай частцы дарогі?***

— Правілы дарожнага руху вучыць дзіці павінны вывучаць з самага ранняга ўзросту. Дзяржаўтаінспекцыя далучаецца да гэтага працэсу крыху пазней, з дзіцячага садка або школы. Таму асноўная роля ў выхаванні ў дзяцей культуры паводзінаў на дарогах ляжыць на бацьках. Маленькаму дзіцяці трэба тлумачыць, як пераходзіць дарогу, што такое зебра. Трэба пастаянна паўтараць і тлумачыць дзецям, што дарога небяспечнае месца. Паклапаціцеся аб тым, каб вашы дзеці ніколі не размаўлялі па мабільным тэлефоне, калі пераходзяць дарогу.

***— А наколькі дзейсна вывучэнне правілаў дарожнага руху ў школе? Ці сур'ёзна ставяцца дзеці да падобных заняткаў? Ёсць нават такая прапанова, каб увесці абавязковы іспыт на веданне правілаў дарожнага руху ў школах. Як да гэтай ідэі ставіцца Дзяржаўтаінспекцыя?***

— Толькі станоўча! У школах ёсць сёння такі прадмет, як «Забеспячэнне бяспекі і жыццядзейнасці». І вось у рамках гэтага курса школьнікі вывучаюць правілы дарожнага руху. ДАІ са свайго боку ўсяляк будзе аказваць дапамогу. Мы будзем праводзіць віктарыны, конкурсы. А наконт прапановы, каб увесці іспыт, то гэта залежыць не ад нас. Праўда, Дзяржаўтаінспекцыя выступае за падобнае наваўвядзенне.

***— Жанна, скажыце, сёння ў сталіцы няма такой праблемы, як недахоп пешаходных пераходаў у патэнцыяльна небяспечных месцах?***

— Не. Калі будуецца новы мікраён, то дарогі абсталёўваюцца адразу ж. А тое, што датычыцца школ і іншых дзіцячых устаноў, то заўсёды перад пачаткам новага навучальнага года правяраюцца ўсе патэнцыяльна небяспечныя месцы. Глядзім, каб каля школ, іншых дзіцячых устаноў была разметка, ярка вылучаныя пешаходныя пераходы. Але ў любым выпадку Дзяржаўтаінспекцыя разгледзіць усе прапановы з нагоды размяшчэння новых пешаходных пераходаў у нейкіх небяспечных месцах.

***— Жанна, як вы ставіцеся да такога спосабу зніжэння колькасці ДТЗ з удзелам дзяцей, як павелічэнне велічыні штрафаў за парушэнне ПДР? Можа, у нас не настолькі вялікія штрафы?***

— Летась быў уведзены новы Кодэкс аб адміністрацыйных парушэннях. У выніку мера адказнасці за парушэнне ПДР стала больш жорсткай. Аднак зніжэння колькасці парушэнняў не назіраецца. Мабыць, трэба дзейнічаць не толькі матэрыяльнымі метадамі. Многія, пэўна, ужо ведаюць, што хутка будзе ўведзеная бальная сістэма. Такі комплексны падыход і дазволіць скараціць колькасць ДТЗ.

**Сяргей ДЗЕВЯТОЎСКІ.**

## ЮБІЛЕЙ ЯЎГЕНІІ ЯНІШЧЫЦ ЗБІРАЮЦЦА АДЗНАЧЫЦЬ НА ПІНШЧЫНЕ

Восенню, калі споўніцца 60 гадоў з дня нараджэння беларускай паэтэсы Яўгеніі Янішчыц, на яе радзіме пройдзе юбілейнае мерапрыемства. Аб гэтым дамовіліся ўдзельнікі спецыяльнага арганізацыйнага камітэта. У Пінску імя паэтэсы носіць вуліца і цэнтральная раённая бібліятэка. А з Парэчанскай базавай школы, дзе ў свой час вучылася Яўгенія, паступіў зварот у мясцовыя органы ўлады з прапановай надаць імя зямлячкі школе. Цяпер у школе дзейнічае музей паэтэсы, у ім сабраны многія ўнікальныя экспанаты. Аргкамітэт прыняў рашэнне таксама прывесці ў парадак сядзібу, дзе нарадзілася Яўгенія Янішчыц, у вёсцы Рудка.

**Яна СВЕТАВА.**

# ЖНІВЕНЬСКІ ЧАС





Час хуткацечны, а ў жніўні — асабліва. Напрыканцы месяца адыход лета заўважны ў кожным імгненні. Але жнівеньская спёка быццам бы не ведае часу — паранейшаму «дапякае» за ўсе халаднаватыя дні сёлетняга календара. Гэтыя фотаздымкі зроблены заўчора ў Шчучыне, дзе гадзіннік старой вежы стомлена адлічваў апошнія гарачыя дні. У цэні шукалі прахалоды ўсе віды транспарту і іх кіроўцы, а хлебны квас карыстаўся асаблівым попытам.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**

## ДАБРАЧЫННАСЦЬ — РЫСА ЯПОНСКАЯ



Японскі прадпрымальнік, прэзідэнт фармацэўтычнай фірмы «Белмач» Нобуфумі Канда ўжо не першы год падчас адпачынку прыязджае ў Беларусь. Яму падабаюцца нашы прасторы, наша лагодная, маляўнічая прырода, эстэтыка нашых гарадоў і дагледжанасць палёў.

Аднак спадар Нобу-сан прыязджае не толькі адпачыць, палюбавацца беларускімі краявідамі (дарэчы, ён пабываў ужо і ў Белавежскай пушчы, і на Браслаўскіх азёрах, і ў Нясвіжы, і ў Міры), але і з дабрачыннымі мэтамі. Летась, напрыклад, японскі бізнэсмен аказаў матэрыяльную дапамогу ў рамонце інтэрната для дзяцей-сірот, што ў Докшыцкім раёне. Сёлета ім перададзена для дзіцячага хірургічнага аддзялення 1-й клінічнай бальніцы г. Мінска ўнікальнае медыцынскае абсталяванне, якое дазваляе праводзіць самыя складаныя аперацыі.

Акрамя таго, Нобу-сан трымае цесную сувязь з Чарнобыльскім фондам Беларусі і штогод прывозіць значную колькасць лякарстваў, якія выводзяць з арганізма радыяцыю.

Днямі спадар Нобу-сан быў госцем нашай рэдакцыі. Ён расказаў пра сістэму аховы здароўя і сацыяльнага забеспячэння ў Японіі. Цікава, што з гэтага года жыхары Краіны ўзыходзячага сонца будуць выходзіць на пенсію ва ўзросце 65 гадоў, як мужчыны, так і жанчыны. Госць патлумачыў, што гэта выклікана імклівым старэннем японскага грамадства.

На заканчэнне Нобу-сан выказаў задавальненне тымі пазітыўнымі зменамі, якія рэальна бачацца, адчуваюцца ў нашай рэспубліцы на кожным кроку.

**Змітрок ПАЛЕСКІ.**

## АЛІМПІЙСКАЕ ВАР'ЯЦТВА

**Урад Кітайскай Рэспублікі звярнуўся да свайго народа з просьбай падтрымаць Алімпійскія гульні ў Пекіне, аднак, па ўсёй верагоднасці, кітайскія балельшчыкі ўспрынялі ініцыятыву занадта блізка да сэрца.**



Паведамленні аб розных формах кітайскага патрыятызму сталі паступаць у рэдакцыі мясцовых газет і вэб-сайтаў з моманту пачатку Алімпійскіх гульняў. Фігурнае выгаленне 5 алімпійскіх кольцаў на галаве — гэта яшчэ самая бяскрыўдная забаўка. У большасці выпадкаў перакана违 фанаты, якія гуляюць па Пекіне або побач з алімпійскай вёскай, паводзяць сябе значна больш эксцэнтрычна. Так Ліу Сіанхой праехаў больш за 13 кіламетраў да Пекіна, везучы на велакэбе (кітайскім ровары з калёсамі) сваю 98-гадовую маці, якая ўсё жыццё марыла пабываць на Алімпіядзе. А 59-гадовы доктар традыцыйнай кітайскай медыцыны Уэн Шэнгчу ўторкнуў сабе ў галаву 200 акупунктурных іголачак са сцяжкамі краін — удзельніц Алімпіяды. 62-гадовы Хуанг Джунд зрабіў алімпійскія сімвалы з 1860 значкоў з малюнкам былога лідара камуністычнага Кітая Мао Цзэдуна.

У Пекіне, уважліва назіраючы за людзьмі на вуліцах, можна здзіўляцца амаль кожную хвіліну. Возьмем, скажам, мужчыну, які ідзе ўніз па вуліцы ў накірунку да стадыёна «Птушынае гняздо», — у яго чырвоны гарнітур і высокія абцасы, а на галаве карона з пальмавага лісця і кітайскіх сцяжкоў, якія спадаюць на плечы. Іншы наведвальнік стадыёна проста пабудаваў у сябе на галаве муляж птушынага гнязда. 72-гадовы Сан Шыджэ з правінцыі Хебей вырасціў святое Дрэва Пяці Алімпійскіх Кольцаў. Мужчына доўгі час працаваў над галінкамі выгадаванага падуба, старанна падстрыгаў і падвязваў іх такім чынам, каб крона сапраўды стала падобная на кольцы. За 16 дзён вучань сярэдняй школы Янг Йіджые праехаў на роліках 2300 кіламетраў з горада Гуанджоў у правінцыі Гуанджонг да Пекіна, па дарозе запісваючы імёны ўсіх алімпійскіх прыхільнікаў і актывістаў. 67-гадовы пенсіянер Ху Уеньюан упрыгожыў свой матацыкл з каляскай налепкамі з алімпійскай сімволікай, ператварыўшы яго ў «рухомую» рэкламу Алімпійскіх гульняў-2008. Асабліва шмат налепак з кольцамі і з алімпійскімі слоганамі, як «Адзін свет — адна мара». «Я ўкладваю, я ўдзельнічаю, я проста шчаслівы», — запэўнівае Ху, усміхаючыся да вушэй. Акрамя таго, па словах старога, Алімпіяда — гэта эліксір супраць старэння. Ён верыць, што задавальненне, якое ён атрымлівае ад паездак на сваім «алімпійскім» матацыкле, падоўжыць яму жыццё на некалькі гадоў.

## ЧАТЫРЫ ВУХІ З ЧЫПАМ

**У адной з брытанскіх сем'яў жыве незвычайны гадаванец — кот з двума парамі вушэй на галаве. 65-гадовая Валеры і яе муж Тэд знайшлі жывёлу два гады таму ў адным з бараў у Чыкага.**



Гаспадар бара прапаноўваў наведвальнікам забраць некалькіх кацянят да сябе дадому. Аднаго з іх — з чатырма вушамі — перадавалі па крузе, пакуль ён не патрапіў у рукі мужа Валеры. Пара вырашыла назваць свайго новага гадаванца ў гонар аднаго з герояў фільма «Зорныя войны» — джэдая Ёды. На стварэнне гэтага персанажа рэжысёра Джорджа Лукаса натхніў яго кот. Гаспадыня Ёды, баючыся, што яе ўнікальнага гадаванца могуць выкрасці, перастала выпускаць яго з хаты. Да ката таксама далучылі спецыяльны чып, на выпадак, калі той згубіцца. Некаторыя знаёмыя раілі гаспадарам Ёды правесці аперацыю, каб пакінуць кату толькі адну пару вушэй. Аднак Валеры ўпэўненая, што гэта лішняе. Ёда — абсалютна нармальны кот, які любіць сваіх гаспадароў і жыва цікавіцца навакольным светам. Ён чуе гэтак жа, як і астатнія каты, і ўсё ж у Ёды ёсць адна цікавая асаблівасць: калі ён вуркоча, яго не чуваць. Вуркатанне можна толькі адчуць, калі пакласці палец на яго горла. Кот таксама не адрозніваецца гучным голасам, калі мяўкае.

**В целях популяризации агроэкотуризма в Республике Беларусь, в соответствии с Программой участия ОАО «Белагропромбанк» в развитии агроэкотуризма в Республике Беларусь, ОАО «Белагропромбанк» и БОО «Отдых в деревне» объявляют условия конкурса «Лучшая агроэкоусадьба года».**

белагропромбанк
традиции будущего

# УСЛОВИЯ КОНКУРСА «ЛУЧШАЯ АГРОЭКОУСАДЬБА ГОДА»

### *1. Общие положения*

**1.1. Сфера применения данных Условий**

Настоящие Условия применяются при проведении конкурса «Лучшая агроэкоусадьба года» (далее конкурс).

**1.2. Организаторы конкурса (оргкомитет)**

• ОАО «Белагропромбанк»
• БОО «Отдых в деревне»

**1.3 Генеральный информационный партнер**

• газета «Звязда»

**1.4. Основные цели и задачи проведения конкурса**

• популяризация агроэкотуризма в Республике Беларусь, формирование благоприятных условий для его развития;
• стимулирование деловой активности субъектов агроэкотуризма;
• совершенствование качества предоставляемых услуг субъектами агроэкотуризма.

**1.5. Основные принципы проведения конкурса**

• равенство участников;
• гласность;
• открытость процедур.

**1.6. Основные понятия, используемые данными Условиями**

В настоящих Условиях используются следующие основные понятия:

• Сайты конкурса — интернет-страница, расположенная по адресу:
- www.ruralbelarus.by;
- www.belapb.by.

• Участник — субъект агроэкотуризма (физическое лицо, крестьянское (фермерское) хозяйство), заявка которого на участие в конкурсе принята отборочной комиссией оргкомитета;
• Претенденты на победу в конкурсе – участники конкурса, набравшие наибольшее количество баллов по общим критериям оценки участников конкурса, используемые оргкомитетом для единообразного сравнения конкурсантов;
• Жюри — группа лиц, осуществляющая оценку претендентов на победу в конкурсе, на выявление победителя;
• Партнеры конкурса — организации, оказывающие материальную или информационную поддержку мероприятию;
• СМИ – средства массовой информации.

**1.7. Оргкомитет**

Контактный адрес оргкомитета:

• БОО «Отдых в деревне»,
220012, г. Минск, ул. Дунина-Марцинкевича, 6.
тел: +375(17) 251 00 76
+375(17) 252 27 81

• ОАО «Белагропромбанк»,
220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3.
тел: +375(17) 218 56 21
+375(17) 218 56 61

### *2. Условия участия в конкурсе*

**2.1. Требование к претендентам на участие в конкурсе**

Претендовать на участие в конкурсе может субъект агроэкотуризма Республики Беларусь, осуществляющий деятельность по оказанию услуг в сфере агроэкотуризма в порядке и на условиях, определенных Указом Президента Республики Беларусь от 02.06.2006 г. № 372 «О мерах по развитию агроэкотуризма в Республике Беларусь».

**2.2. Подача заявки на участие в конкурсе и присвоение статуса участника**

Заявки на участие в конкурсе принимаются:

с 1 сентября 2008 года по 15 ноября 2008 года включительно.

Для участия в конкурсе претенденту необходимо направить по почте на адреса оргкомитета заполненную анкету (Приложение 1) и материал указанный в п. 2.3. настоящих Условий.

Отборочная комиссия, по результатам поступивших материалов, с учетом требования п. 2.1., субъекту агроэкотуризма присваивает статус участника конкурса.

**2.3. Материалы, представляемые участником конкурса**

• документы, подтверждающие количественные (информацию по установленной форме о договорах на оказание услуг в сфере агроэкотуризма, заключенных в 2008 году, с отметкой налогового органа*) и качественные (материально-техническое обеспечение, качество предоставляемых услуг) показатели деятельности в сфере агроэкотуризма;
• дипломы, грамоты, благодарности;
• перечень предоставляемых туристских услуг;
• сведения о профессиональной подготовке (участие в семинарах, тренингах, стажировках по агроэкотуризму и др.);
• рекламные проспекты, каталоги;
• фотоальбомы, раскрывающие деятельность субъекта в сфере агроэкотуризма;
• иные материалы.

* информацию по установленной форме о договорах на оказание услуг в сфере агроэкотуризма, заключенных в 2008 году, с отметкой налогового органа участникам конкурса необходимо представить в оргкомитет не позднее 15.01.2009 года.

**2.4. Плата за участие в конкурсе**

Плата за участие в конкурсе не взимается.

### *3. Информационный обмен между оргкомитетом и участниками конкурса*

Информационный обмен между оргкомитетом и участниками конкурса осуществляется путем переписки по электронной почте.

Контактный адрес оргкомитета:
1) БОО «Отдых в деревне»:
info@ruralbelarus.by
2) ОАО «Белагропромбанк»:
konkurs.lag@belapb.by

### *4. Общение на страницах комментариев*

Во время проведения конкурса посетители форума сайтов конкурса могут оставлять свои отзывы о субъектах агроэкотуризма, используя страницу комментариев — специальное web-приложение, созданное для общения пользователей сайта.

### *5. Освещение хода проведения конкурса*

Ход и результаты конкурса освещаются на сайтах конкурса, информационных партнеров и других СМИ.

### *6. Использование материалов участника конкурса*

Участник конкурса на безгонорарной бессрочной исключительной основе предоставляет организаторам конкурса следующие права в отношении присланных им материалов:

• Право на бессрочное использование в целях освещения конкурса в различных СМИ любого формата и интернет-сайтах оргкомитета;
• Право использовать в рекламных материалах организатора с указанием объекта субъекта агроэкотуризма.
• Присланные на конкурс материалы возврату не подлежат.

### *7. Критерии и порядок оценки результатов деятельности участников конкурса*

**7.1. Общие критерии оценки участников конкурса**

Оргкомитет для единообразного сравнения конкурсантов использует следующие общие критерии оценки:

• информация по установленной форме о договорах на оказание услуг в сфере агроэкотуризма, заключенных в 2008 году, с отметкой налогового органа;
• уровень обслуживания (гостеприимство);
• количество (разнообразие) предлагаемых услуг;
• рекламное обеспечение туристов необходимой информацией о достопримечательностях региона;
• вклад в сохранение и интерпретацию культурно-материального наследия;
• эффективность использования природных ресурсов (воды и энергии);
• наличие и состояние приусадебного хозяйства (уровень, размер, разнообразие);
• наличие стиля в оформлении агроэкоусадьбы;
• реализация новых идей за последний год (что придумано, сделано, построено).

Оргкомитет по результатам обобщения поступивших материалов определяет трех претендентов на победу в каждой номинации конкурса, имеющих лучшие показатели по общим критериям деятельности в сфере агроэкотуризма.

**7.2. Критерии оценки претендентов на победу в номинациях**

Материал по претендентам на победу в номинациях конкурса оргкомитет представляет членам жюри для дальнейшей оценки по критериям в пяти номинациях:

**1. Сохранение белорусских традиций:**

• владение белорусским языком;
• сохранение традиционной архитектуры;
• возрождение народных обрядов, других элементов фольклора и использование их в программе приема агроэкотуристов;
• поддержка народного ремесла (например, знакомство с местными мастерами и обеспечение спроса на их изделия);
• знание местных легенд и сказаний, умение рассказать туристам известные и мало известные факты из истории края, наличие интересного и удобного маршрута, связанного с этими приданиями;
• отображение выдержанного в национальных традициях уклада жизни в данной местности.

**2. Здоровый образ жизни:**

• предоставление гостям дополнительных оздоровительных услуг (купание, массаж, фиточаи, пешие прогулки и пр.);
• наличие в усадьбе бани, как обязательного элемента оздоровления и отдыха (баня должна быть построена с использованием экологически чистых материалов, отвечать требованиям гигиены, приветствуется оригинальность оформления и стиль);
• наличие уникальных оздоровительных услуг (хозяева могут представить свой, отличный от других, рецепт красоты, приветствуется оригинальность подачи);
• агроэкоусадьба уделяет особое внимание здоровому образу жизни – организуются велопробеги, путешествия на байдарках, лодках, походы, лыжи и т.д.

**3. Гостеприимство:**

• наличие специальных (разнообразных) программ пребывания туристов;
• качество и разнообразие предлагаемых блюд;
• наличие постоянных клиентов (как показатель высокого сервиса);
• наличие положительных отзывов о хозяевах на форумах туристических порталов (за 2008 год);
• количество и качество предоставляемых дополнительных услуг.

**4. Зеленая усадьба:**

• поддержание экологически дружелюбного сельского хозяйства (неиспользование пестицидов и минеральных удобрений, содержание домашних животных в естественной среде, обеспечение туристов продуктами собственного подворья и т.д.);
• зеленая политика в строительстве (использование экологически чистых материалов и традиционных технологий);
• обеспечение гостей информацией о местной природе, местной культуре, органическом сельском хозяйстве (с помощью листовок, путеводителей, туров);
• использование воды и энергии должно быть бережным, эффективным и рациональным (в усадьбе не должно быть утечки воды, поощряется использование возобновляемых источников энергии);
• в агроэкоусадьбе предлагаются дружественные по отношению к окружающей среде экскурсии (велосипеды, пешие прогулки, верховая езда, катание на лодках и т.п.);
• хозяева агроэкоусадьбы должны пытаться внести вклад в местную экономику и демонстрировать желание приобретать товары в местных магазинах и сотрудничать с местными производителями;
• хозяева агроэкоусадьбы должны демонстрировать бережное отношение к природе и не поддерживать мероприятия, которые причиняют вред местной флоре и фауне.

**5. Стиль и гармония:**

• функциональная и эстетическая согласованность всех элементов усадьбы (постройки, интерьер, благоустройство территории и т.д.);
• гармоничное включение усадьбы в природное окружение;
• согласованность усадьбы со сложившейся социальной и градостроительной средой;
• наличие элементов местной культуры и их умелое использование для усиления познавательной функции отдыха;
• проявление высокого профессионального уровня хозяев усадеб (умение общаться, навыки обслуживания туристов, индивидуальный подход, знание местной культуры, истории, особенностей природной среды).

### *8. Состав членов жюри конкурса*

**Председатель жюри:**

Шульга Ч.К. – заместитель Министра спорта и туризма Республики Беларусь.

**Члены жюри:**

Подковыров В.И. – Первый заместитель Председателя Правления ОАО «Белагропромбанк»;

Клицунова В.А. – Председатель Правления БОО «Отдых в деревне»;

Сергачев С.А. – доктор архитектуры, заведующий кафедрой БПА – (эксперт по архитектуре, интерьеру, внешнему оформлению);

Сахута Е.М. – доктор искусствоведения, Председатель Правления Белорусского союза мастеров народного творчества – (эксперт по использованию и сохранению традиционных ремесел);

Лозка А.Ю. – доцент БГПУ имени М.Танка, фольклорист – (эксперт по использованию и сохранению народных обычаев и обрядов, устного и музыкального творчества);

Новогородский Т.А. – доцент кафедры этнологии БГУ – (эксперт по традиционной кухне).

### *9. Определение победителей конкурса*

Победителей конкурса определяет жюри конкурса.

Материал с оценками претендентов на победу члены жюри передают в оргкомитет. Оргкомитет суммирует количество баллов, выставленных членами жюри, вследствие чего, определяются победители в каждой номинации.

В случае, если участники конкурса набрали равное количество баллов в соответствующей номинации, победителя определяет председатель жюри.

Оценка членов жюри по критериям проводится тайно, т.е. участники конкурса никогда не узнают, какую оценку поставил тот или иной член жюри. Однако общие результаты конкурса являются гласными.

### *10. Порядок награждения победителей конкурса*

Подведение итогов, определение победителей конкурса осуществляется не позднее 10 февраля 2009 года.

Награждение победителей конкурса состоится на организуемой ОАО «Белагропромбанк» специализированной конференции по вопросам развития агроэкотуризма в Республике Беларусь не позднее 15 марта 2009.

Победители конкурса награждаются дипломами и ценными призами от организаторов и партнеров конкурса.

Иные участники конкурса поощряются отличительными знаками и призами от организаторов и партнеров конкурса.

*Приложение 1*

**ЗАЯВКА НА УЧАСТИЕ В КОНКУРСЕ «ЛУЧШАЯ АГРОЭКОУСАДЬБА ГОДА»**

1. Полное наименование субъекта агроэкотуризма, название агроэкоусадьбы
______________________________
______________________________

2. Местонахождение объекта агроэкотуризма
адрес ______________________________
______________________________
тел. ______________ факс ______________ E-mail ______________

3. Место и дата регистрации субъекта агроэкотуризма
______________________________
(наименование регистрирующего органа (Совет депутатов, налоговый орган))

4. Основные виды деятельности в сфере агроэкотуризма
______________________________
______________________________
______________________________

5. Дополнительные виды деятельности в сфере агроэкотуризма
______________________________
______________________________

Субъект агроэкотуризма ______________ (подпись) ______________ (дата)

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136
время работы 8.00–20.00 без выходных и праздничных дней:
звонок со стационарного телефона - бесплатно на территории РБ;
звонок с мобильного телефона (БеСТ, Velcom, МТС) - по тарифам операторов мобильной связи.
www.belapb.by
*Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ от 27.10.2006 г. № 2. УНП 100693551.*

## У ТЭХАСЕ І Ў ШКОЛУ З «КОЛЬТАМ»

**Настаўнікам і супрацоўнікам школ школьнай акругі Харалд у штаце Тэхас дазволілі насіць зброю на ўрокі для самаабароны ў выпадку пачатку страляніны.**

Каб атрымаць магчымасць браць з сабой зброю, настаўнікі павінны мець дазвол на яе нашэнне і прайсці курс дзеянняў у крызіснай сітуацыі. Акрамя таго, яны павінны выкарыстоўваць спецыяльныя патроны, каб звесці да мінімуму рызыку рыкашэту. Па словах кіраўніка



акругі Дэвіда Твета, службоўцам спатрэбіўся год, каб зацвердзіць прапанову аб дазволе зброі ў школах. Твет лічыць, што іншых спосабаў абараніцца настаўнікі яго акругі не маюць, а небяспека ўзнікнення страляніны ёсць заўсёды. Як адзначаюць у іншых амерыканскіх школьных арганізацыях, тэхаскі дазвол стаў беспрэцэдэнтным. У ЗША, у тым ліку і ў Тэхасе, зброя ў школах забаронена.

## АМЕРЫКАНЦЫ ПАДАРВУЦЬ МЕСЯЦ?



**Спецыялісты ЗША хочуць нанесці ўдар па Месяцы. З дапамогай моцнага выбуху Нацыянальнае ўпраўленне ЗША па аэранаўтыцы і даследаванні касмічнай прасторы вырашыла праверыць, ці ёсць там вада.**

Ідэя нарадзілася пасля таго, як для запуску амерыканскага касмічнага робата «Месяцавы арбітальны разведчык», прызначанага на пачатак 2009 года, вырашана было выкарыстаць больш магутную ракету-носьбіт. Гэта дазваляла значна павялічыць карысную нагрузку, і за яе выкарыстанне адразу разгарнулася барацьба ідэй. Каліфарнійцы з даследчага цэнтра імя Эймса паблізу Сан-Хасэ прапанавалі праект «Сіні лёд», якому і была аддадзена перавага перад 18 іншымі конкурснымі заяўкамі. Паводле публікацыі, ваду на Месяцы NASA задумала шукаць з-за таго, што плануецца праз 12 гадоў зноў высадзіць там людзей і пачаць падрыхтоўку да стварэння месяцавай базы для наступных касмічных даследаванняў. Раней у спецыялістаў з'явіліся падставы лічыць, што ў месяцавых кратэрах могуць прысутнічаць украпванні замерзлай вады, магчыма, занесенай туды каметамі і метэорамі.

## НЕ ЗЛУЙЦЕ СВЯТУЮ ЖЫВЁЛІНУ

**Кракадзіл, які жыве пры храме Хан Джахан Алі (на фота) у Бангладэш, разарваў і з'еў маладога паломніка, які спецыяльна зайшоў у сажалку, каб спытаць у святой жывёліны благаславення.**

25-гадовы Рубель Шэйх прыйшоў у храм здалёк разам са сваёй маці. Калі ён зайшоў у сажалку, адзін з пяці кракадзілаў, якія жывуць там, нечакана кінуўся на яго і пацягнуў на глыбіню. Пасля інцыдэнту каля 25 чалавек нырнулі ў сажалку ў надзеі адшукаць цела, аднак усе іх намаганні былі дарэмнымі. Труп паломніка, амаль цалкам з'едзены, праз некаторы час знайшлі на беразе. Для паліцыі гэтае здарэнне стала поўнай нечаканасцю. Па словах інспектара Хумаюна Кабіра, штодня храм наведваюць сотні людзей, якія прыносяць кракадзілам у дарунак курэй і коз і рэгулярна здзяйсняюць рытуальныя абмыванні ў сажалцы. Кракадзілы заўсёды былі вельмі прыязныя і дагэтуль ні на кога не нападалі.

**Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.**



## ТАНЕЦ СМЕРЦІ



**Кожны год у Бішнупуры, што за 200 кіламетраў ад Калькуты, праходзіць фестываль заклінальнікаў змей.**

Заклінальнік змей, або «бедэ» па-бенгальску, — адна з найстаражытнейшых прафесій у Індыі. Яны заўсёды жылі на ўскраінах гарадоў, дзе з пакалення ў пакаленне перадавалі сваё старажытнае мастацтва. Часцей за ўсё заклінальнікі выкарыстоўвалі кобраў, але сустракаліся таксама гадзюкі і ўдавы. Навучанне заклінальнікі праходзілі спачатку на бясшкодных рэптыліях, потым на драўняных змеях, хоць і ядавітых, але тыя рэдка кусаюць людзей, або на пітонах. Ужо потым, апрануўшыся ў ахоўнае адзенне, якое нагадвае дрэсіроўшчыкаў сабак, яны займаліся з дзікімі ядавітымі змеямі. Заклінальнік змей звычайна выкарыстоўвае для сваёй працы флейту, пад гукі якой змяя «танцуе», нібыта пад гіпнозам. Але змеі практычна глухія. Інакш кажучы, рэптылія не чуе флейту, а калыхаецца, гледзячы на рухі флейты. Ёсць і іншая тэорыя — падчас дрэсіроўкі змей часта б'юць флейтамі, таму насамрэч змяя не рухаецца ўслед за ёй, а наадварот — спрабуе ўхіліцца ад удару, так што гэта заклінальнік змей імітуе рухі змяі, ствараючы ілюзію танца пад музыку.

Нават у самыя лепшыя часы гэта была далёка не самая высокааплатная прафесія, а тым больш цяпер, калі ўступіла ў сілу забарона на паляванне і лоўлю змей. Заклінальнікам даводзіцца адначасова рабіць якую-небудзь іншую працу, каб выжыць. Многія з іх цяпер працуюць у заалагічных цэнтрах і арганізацыях, якія займаюцца лясной гаспадаркай, і расказваюць наведвальнікам аб сваіх рэптыліях. Раней заклінальнікі былі таксама і лекарамі, якія ўмелі лячыць укушаных, іх часта клікалі на дапамогу, калі змеі залазілі ў хату.



Карысная парада

# «ЗМАГАЦЦА» ДА АПОШНЯЙ КРОПЛІ...

**У пазамінулым годзе, калі памятаеце, быў багаты ўраджай яблыкаў. Мы неяк позна спахапіліся і, каб запасціся сокам, давялося пазычаць сокавыціскалку, бо сваёй не было. Летась пытанне яе набыцця адпала само па сабе. Сёлета ж багаты ўраджай абяцае зноў паўтарыцца, але на гэты раз яшчэ ёсць час сустрэць яго ў «поўным узбраенні». Такім чынам тэма нашай сённяшняй рубрыкі — сокавыціскалкі.**

**КОЖНАМУ — СВАЕ**

Сок, вядома, можа быць не толькі яблычным, таму і наша даследаванне рынку гэтых карысных бытавых электрапрыбораў будзе больш пашыраным. Так, пэўныя ягады, з якіх таксама можна ў хатніх умовах выціскаць сок, ужо адышлі. Але на падыходзе — іншыя, ды і на рынках цяпер пік сезона на многае з прывазной садавіны. Вось у залежнасці ад таго, які сок і ў якіх аб'ёмах вы збіраецеся «здабываць», і пачнём наш аповед. Бо ад гэтых дзвюх умоў залежыць выбар тыпу сокавыціскалкі. А іх тры: для цытрусавых, шнэкавыя і ўніверсальныя.

**ЦЫТРУС ПАД «ПРЭСАМ»**

Цытрусавыя сокавыціскалкі (іх яшчэ часта называюць цытрус-прэсамі) прызначаны, як можна здагадацца, для выціскання соку з апельсінаў, мандарынаў, грэйпфрутаў, лімонаў. Прынцып іх дзеяння некалі мы маглі назіраць выключна ў замежных фільмах: герой ці гераіня наразае папалам тыя ж апельсіны, прыціскае палавінкі па чарзе да конусападобнай насадкі з выступамі — і свежавыціснуты сок сцякае ў празрыстую ёмістасць пад памянёнай насадкай або прама ў кубак.





Такія прыборы даволі кампактныя, звычайна маюць магутнасць 20—80 Вт. Дарэчы, аб'ём ёмістасці звычайна не перавышае аднаго літра, што невыпадкова: свежавыціснуты сок з цытрусавых вельмі хутка страчвае свае карысныя якасці, спажываць яго лепш адразу пасля «прыгатавання». Цана ўбачаных прыбораў у гандлі вагалася ад 60 да 90 тысяч рублёў. Вытворцы — усе замежныя.

Пры выбары цытрус-прэса варта звярнуць увагу на наяўнасць дадатковых насадак з рознымі па памерах выступамі (для розных па памерах цытрусавых) і шчылінамі ў іх (можна будзе «гатаваць» сок «густым» або больш вадкім). Карыснай будзе і наяўнасць функцыі рэверса (зваротнага ходу): калі насадка круціцца ў розныя бакі, больш шанцаў выціснуць сок да апошняй кроплі. Такія насадкі ў якасці дадатковых могуць уваходзіць у камплект універсальных кухонных камбайнаў.

Дарэчы, цытрус-прэс можна набыць і за... 3,5—4 тысячы рублёў. Праўда, цалкам «механічны» пластыкавы, расійскай вытворчасці. Гэта ёмістасць з насадкай, дзе адсутнічае электрарухавік, сок давядзецца здабываць у прамым сэнсе ўласнымі рукамі, варочаючы садавіну ўзад-уперад на насадцы. Прадаюцца ў гаспадарчых аддзелах буйных магазінаў.

**«МЯСАРУБКА» ДЛЯ САДАВІНЫ**

Шнэкавыя сокавыціскалкі на нашым рынку таксама прысутнічаюць. Вытворчасць — пераважна Кітай. Хоць мне ўдалося знайсці і самы «наварочаны» апарат французскага паходжання магутнасцю 700 Вт і коштам амаль 650 тысяч рублёў. Дарэчы, і першая, і другая асаблівасці — магутнасць і цана — з'яўляюцца, можна сказаць, характэрнымі для гэтага тыпу сокавыціскалак.

По канструкцыі і прынцыпе дзеяння яны нагадваюць мясарубку: вал, які круціцца, падштурхоўвае садавіну ці ягады да сіта, ушчыльняе гэту масу і добра адціскае. Сок выцякае з пераду апарата, а адходы вытворчасці выдаляюцца з заду (знешне з-за носіка такая сокавыціскалка нагадала мне чымсьці вялікі чайнік).

Да плюсоў шнэкавых сокавыціскалак можна аднесці тое, што яны дазваляюць выціскаць сок з пладоў з костачкамі. І хоць тэарэтычна прыборы разлічаны на даволі вялікую працягласць працы, мне здалося, што нашы спажыўцы такой магчымасцю не карыстаюцца. Прынамсі, прадавец, пачуўшы пра мае тэарэтычныя «прамысловыя» аб'ёмы будучых нарыхтовак, параіла пашукаць айчынны аналаг. Маўляў, тое, што вы бачыце — для штодзённага карыстання. Памер ёмістасці для збору соку — адзін літр. Дызайн прыбораў даволі прыемны, але да несумненных мінусаў можна аднесці кошт сокавыціскалкі. Бо нават іншыя, з меншай магутнасцю (скажам, 300 Вт) і не такім прывабным дызайнам каштавалі ў сярэднім 300—350 тысяч рублёў.

**ДЛЯ ЎСЯГО ПРЫДАТНЫЯ**

Універсальныя (або цэнтрабежныя) сокавыціскалкі, напэўна, у поўнай меры адпавядаюць гэтай назве. Па-першае, на іх можна атрымаць сок практычна з любых ягад і пладоў без буйных костачак. Іх магутнасць вагаецца ад 200 да 600 Вт, аб'ём ёмістасці — ад 1 да 1,5 літра. Але галоўнае, што яны найбольш падыходзяць для нашых умоў, калі за адзін раз трэба перапрацаваць адносна вялікі аб'ём прадукцыі.

Прынцып дзеяння ўніверсальных сокавыціскалак наступны: вітамінная прадукцыя з дапамогай дыскавай цёркі здрабняецца да стану кашкі, якая потым трапляе ў сепаратар. Ужо там пад уздзеяннем цэнтрабежнай сілы адбываецца выдаленне праз сіта соку.

Яго выхад залежыць ад формы сепаратара: пры цыліндрычнай ён можа складаць да 95 працэнтаў, аднак рэгулярна давядзецца ўручную чысціць сепаратар ад адходаў вытворчасці. Пры канічнай форме сепаратара выхад соку складае 60—70 працэнтаў, але ёсць магчымасць выдалення адходаў.

Гаворачы пра ўніверсальны тып сокавыціскалак, па вышэйназваных прычынах хацелася б спыніцца на айчынных прыборах (у секцыю з якімі мяне і накіравала прадавец). У продажы ёсць толькі некалькі мадэляў коштам ад 130 да 193 тысяч рублёў (адрозніваюцца магутнасцю, наяўнасцю дадатковых дыскаў для шаткавання гародніны), але яны, як кажуць, правераны часам.

Недахопы, думаю, іх вядомыя ўсім, каму з імі даводзілася сутыкацца: вялікі шум, неабходнасць літаральна праз некалькі хвілін пастаяннай працы выдаляць адходы. Бывае, сок выціскаеш па часе столькі ж, колькі чысціш сепаратар і збіраеш-разбіраеш сокавыціскалку. Але, як ужо сказаў, пры даступнай цане і неабходнасці ў хатніх «прамысловых» нарыхтоўках яны часткова кампенсуюцца.



**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Дзве выставы ў адным месцы — знаходка для бацькоў

**Для сталічнага гандлю трэцяя дэкада жніўня — традыцыйна самыя «гарачыя» дні, таму што многія сем'і па традыцыі адкладваюць паход па школьную экіпіроўку на апошнія дні летніх канікулаў.**

Між іншым, напярэдадні новага навучальнага года ў сталіцы арганізуюцца дзве спецыялізаваныя выставы, дзе бацькі ў адным месцы змогуць зрабіць усе карысныя пакупкі. Так, 23 жніўня ў Нацыянальным выставачным цэнтры «БелЭКСПА» на вул. Я. Купалы, 21 адкрыецца выстава-кірмаш «Прывітанне, школа-2008». На ёй будуць прадстаўлены школьныя прылады, падручнікі, спецыялізаваная і мастацкая літаратура, канцылярскія тавары, адзенне, абутак, спартыўныя тавары і музычныя інструменты. Выстава будзе дзейнічаць да 31 жніўня. А 25 жніўня таксама ў павільёне на Я. Купалы, 21 адкрыецца другая міжнародная спецыялізаваная выстава-кірмаш тавараў і паслуг «Нашым дзецям-2008». Вытворцы і імпарцёры плануюць не проста прадаць свой тавар, але і данесці да спажыўцоў інфармацыю аб іх перавагах: высокай якасці, эфектыўнасці, экалагічнасці, прадставіць навінкі, якія з'явіліся апошнім часам у гэтым сектары рынку. У бацькоў школьнікаў і дашкольнікаў будзе магчымасць набыць тавары для творчага, разумовага і фізічнага развіцця дзяцей, выбраць для іх школы ранняга развіцця, творчыя гурткі і спартыўныя секцыі, інфармацыя аб якіх будзе шырока прадстаўлена на выставе. На выставе будуць прадстаўлены як непасрэдна школьныя тавары і адзенне дзелавога стылю, так і дзіцячае харчаванне, цацкі, развіццёвыя і электронныя гульні, дзіцячая мэбля, сучасныя сродкі развіцця, тавары для будучых маці, сродкі і абсталяванне медыцынскага прызначэння для догляду дзяцей, праекты сацыяльнай абароны і падтрымкі дзяцей і сям'і. Выстава «Нашым дзецям» завершыць сваю работу 31 жніўня.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Конкурс лепшых вытворцаў на прасторах СНД

**Другі конкурс на сушуканне Прэміі СНД за дасягненні ў галіне якасці прадукцыі і паслуг аб'яўлены ў краінах—удзельніцах Садружнасці.**

Галоўны крытэрый — пацвярджэнне высокай якасці выпускаемай прадукцыі або аказваемай паслугі на працягу не менш як двух гадоў і ажыццяўленне экспарту не менш чым у дзве дзяржавы СНД. Прэмія прысуджаецца за вытворчасць прадукцыі вытворчага прызначэння, тавараў народнага спажывання і аказанне паслуг. Вынікі конкурсу будуць аб'яўлены напрыканцы 2009 года. Лаўрэатамі і дыпламантамі конкурсу 2006—2007 гадоў прызнаны РУП «Беларускі металургічны завод», ААТ «Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод», ААТ «Савушкін прадукт», СП ЗАТ «Мілавіца» і СП «Брэстгазаапарат» ААТ.

Заявы на ўдзел айчынныя арганізацыі павінны прадставіць да 1 кастрычніка 2008 года ў сакратарыят конкурснай камісіі, сфарміраванай у Дзяржаўным камітэце па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь: г Мінск, Старавіленскі тракт, 93, тэл. (017) 233 28 36. Кансультацыю можна атрымаць па нумарах: (017) 262 52 54 і (017) 262 17 92.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## У МІНСКУ ПАЧАЛІ ФУНКЦЫЯНАВАЦЬ ЧАТЫРЫ МУНІЦЫПАЛЬНЫЯ І ТРЫ ЭКСПРЭСНЫЯ АЎТОБУСНЫЯ МАРШРУТЫ

**Новыя аўтобусныя маршруты з'явіліся ў Мінску. Як паведамілі ў ГУ «Сталічны транспарт і сувязь», у жніўні пачалі функцыянаваць чатыры муніцыпальныя і тры экспрэсныя аўтобусныя маршруты.**

Гэта маршруты грамадскага транспарту № 11 «Сухарава — Вяснянка», № 14 «Аўтавакзал «Усходні» — Сцяпянка», № 136 «Д/С «Карастаянавай» — Аздараўленчы цэнтр «Ждановічы»; № 138 «Д/С «Кунцаўшчына» — прамвузел «Заходні». Пачалі працаваць экспрэсныя маршруты № 1029 «Акадэмія навук — Сухарава-6», № 1043 «Сцяпянка — ГД «Ждановічы» і № 1101 «Сухарава-6 — Д/С «Усходняя».

**Магда КРАПАК, «Мінск—Навіны».**




**Прывітанне, дарагія мае гаспадыні і гаспадары. Мабыць, не памылюся, калі скажу, што ў многіх сем'ях пачаўся час «барацьбы з ураджаем». Пеставалі мы свае гурочкі, памідорчыкі. садавіну-гародніну, ураджай сабралі, а цяпер не ведаем, што з ім рабіць. Таму прапаную пачаць барацьбу з яблыкамі! Усім вядома, якія яны карысныя, але толькі нядаўна даследчыкі выявілі, што ўжыванне 2 яблыкаў у дзень зніжае ўзровень халестэрыну на 16 працэнтаў, а ўжыванне столькі ж яблыкаў, нароўні з маленькай або сярэдняй галоўкай цыбулі і 4 шклянкамі зялёнай гарбаты, зніжае рызыку ўзнікнення сардэчнага прыступу на 31 працэнт. Акрамя таго, яблыкі ўмацоўваюць імунную сістэму і дапамагаюць падтрымліваць пастаянны ўзровень цукру ў крыві.**



**І апошняе. Калі вы хочаце скінуць лішнюю вагу, праводзьце адзін раз на тыдзень яблычныя дні — ешце толькі яблыкі. За гэты дзень вы скінеце мінімум 0,5 кг. Лепш за ўсё ўжываць яблыкі ў сырым выглядзе, але і пасля невялікай тэрмічнай апрацоўкі яны захоўваюць большасць сваіх пажыўных рэчываў. Многія яблыкі пакрытыя зверху воскам, таму саскрабіце яго перад ужываннем.**

**ЯБЛЫЧНЫ ВОЦАТ**

*На 800 г яблыкаў (пажадана антонаўкі) нам спатрэбіцца: 1 л вады, 150—200 г мёду або цукру, 10 г дражджэй або 20 г сухога ржанога хлеба.*

Яблыкі вымыць, выдаліць гнілыя і чарвівыя часткі і надзерці на буйной тарцы разам са стрыжнем. У яблычную кашку ўліць цёплую гатаваную ваду, дадаць мёд або цукар і для паскарэння браджэння — дрожджы або сухі ржаны хлеб.

Атрыманую масу выліць у сасуд з шырокім горлам — чым большая паверхня судакранання вадкасці з паветрам, тым хутчэй пойдзе браджэнне. Маса павінна быць ніжэйшая за верх сасуда на 7—9 см, бо яна пры браджэнні будзе павялічвацца і можа пераліваца праз край. Сасуд павінен быць шкляным, драўляным або гліняным. Адкрыты сасуд з сумессю паставіць у цёмнае месца на 10 дзён, 2—3 разы на дзень перамешваючы кашку драўлянай лыжкай. Праз 10 дзён яблычную масу адціснуць праз марлю, складзеную ў некалькі столак, або праз шчыльную баваўняную тканіну.

На кожны літр атрыманага соку дадаць 50—100 г цукру або мёду і зноў пераліць у сасуд з шырокім горлам. Сасуд завязаць марляй і паставіць у цёплае месца яшчэ на 40—60 дзён. Браджэнне лічыцца закончаным, калі вадкасць перастане бурліць, пасвятлее і перастане быць мутнай. Наверсе воцату можа ўтварацца тоўстая белаватая пеністая плёнка, якую называюць воцатнай маткай або плёнкай дрожджападобных грыбкоў. Лячэбныя ўласцівасці гэтай плёнкі ў тры разы перавышаюць лячэбныя ўласцівасці самога яблычнага воцату. Гатовы воцат прафільтраваць, разліць па бутэльках, шчыльна закрыць іх коркамі. Захоўваць пры тэмпературы 6—8 градусаў. У бутэльках з яблычным воцатам праз некалькі месяцаў можа ўтварыцца асадак — рыжаватыя шматкі.

**РЫБА З ЯБЛЫКАМІ**

*На 1 кг рыбы трэба: 400 г яблыкаў, 3 сталовыя лыжкі сметанковага масла або алею, 2 яйкі, 1 шклянку малака, 1 чайную лыжку мукі, зеляніну на смак.*

Ачышчаную рыбу крыху прыпускаем з маслам на патэльні, выбіраем косці. Бяром форму для запякання, змазваем маслам, кладзём у яе слаямі кавалачкі рыбы, долькі ачышчаных яблыкаў. Заліваем усё гэта ўзбітымі яйкамі, малаком з папярэдне разведзенай у ім мукой. Зверху можна пакласці кавалачкі сметанковага масла. Адпраўляем форму ў духоўку. Перад падачай на стол пасыпаем страву нарэзанай зелянінай.

**«П'ЯНЫЯ ЯБЛЫКІ»**

*Нам спатрэбіцца: 5 яблыкаў, 5 чайных лыжак сметанковага масла, 5 чайных лыжак каньяку, 5 сталовых лыжак здробненых грэцкіх арэхаў, 1 шклянка чорных або чырвоных парэчак, 2 сталовыя лыжкі цукровай пудры, ванілін.*

З яблыкаў акуратна, не пашкодзіўшы дно, дастаем стрыжань. У кожны яблык кладзём кавалачак сметанковага масла, уліваем па лыжачцы каньяку, дадаём ванілін, выкласці парэчкі і арэхі. Запоўненыя яблыкі выкладваем на бляху і запякаць у духоўцы хвілін 30 (можна скарыстацца і мікрахвалевай печчу, толькі тады гатаваць трэба 3 хвіліны пры тэмпературы 100 С). Усе ведаюць, што печаныя яблыкі — гэта смачна. Начыняць можна таксама разынкамі, чарнаслівам, тварагом.

**ДЭСЕРТ «ЯБЛЫЧНЫ КАПТУРОК»**

*Гэтая страва можа быць цяжкаватай для выканання, але вынік, магу вас запэўніць, атрымліваецца вельмі дастойны.*

*На 1 кіслы яблык спатрэбіцца: 2 колцы кансерваванага ананаса, 5 чайных лыжак цукру, кавалачак (1—2 лыжкі) сметанковага масла, 1 ч лыжку соку лімона, 1/3 шклянкі вады.*

Яблык ачысціць ад скуркі, пакінуўшы хвосцік, разрэзаць гарызантальна на дзве часткі — верхняя частка павінна складаць 1/3 вышыні яблыка. Выразаць насенную каробачку з абедзвюх частак яблыка. Ніжнюю частку парэзаць невялікімі кубікамі (1—2 см).

У маленькай каструльцы давесці да кіпення ваду з дзвюма чайнымі лыжкамі цукру і лімонным сокам, пакласці туды верхнюю частку яблыка і адварыць да мяккасці, пераварочваючы з боку на бок.

Ананасныя колцы парэзаць на кубікі, роўныя яблычным. У патэльні на вялікім агні растапіць сметанковае масла і расплавіць да карычневага колеру 3 чайныя лыжкі цукру. Усыпаць кубікі яблыка і патушыць, памешваючы, 1 хвіліну (агонь не змяншаць). Дадаць кубікі ананаса і тушыць яшчэ 1—2 хвіліны. Патэльню зняць з агню.

З фольгі ў некалькі столак звярнуць колца дыяметрам, роўным дыяметру верхняй часткі яблыка. (Божа мой, як гэта мудра гучыць, але, спадзяюся, вы разумееце, што я маю на ўвазе). Калі фольгу зварочваць у руках, то колца атрымліваецца няроўным і ламаным. Трэба палоску фольгі навярнуць на што-небудзь цыліндрычнае, напрыклад, на шклянку. Шклянку дастаць, а кальцо ўцягнуць да патрэбнага дыяметра. Канец колца замацаваць пры дапамозе лейкапластыру або скотча.

Колца паставіць на дошку і выкласці ў яго ананасныя і яблычныя кубікі. Ушчыльніць лыжкай. Зверху пакласці яблычны верх. Верхнюю частку яблыка таксама трэба добра прыціснуць, інакш дэсерт разваліцца на кавалачкі. Але яблык занадта мяккі і калі яго прыціснуць відэльцам або лыжкай, можа дэфармавацца. Таму я накладвала зверху кавалачак поліэтыленавай плёнкі, зрабіўшы для яблычнага хвосціка маленькую дзірачку, і прыціскала яблык кухонным ручнікам (бо яблык жа яшчэ і гарачы).

Перакласці атрыманае збудаванне на талерку пры дапамозе лапаткі (лішняя вадкасць, якая выдзелілася пры гэтым, застанецца на дошцы). Колца з фольгі зняць. Яблык зверху можна пасыпаць парашком кавы або молатай карыцай. На мой погляд, для ўпрыгожвання і надання дадатковага смаку падыдзе плаўлены цукар.

Думаю, мы з вамі значна зменшылі вашы яблычныя запасы. Астатнія яблычкі давайце захаваем на зіму. Ёсць цудоўныя спосабы зрабіць гэта:

**1.** Кожны яблычак абгортваем паперай, складваем у мяшкі і так захоўваем.

**2.** Бяром анучку, змочваем яе гліцэрынай і кожны плод абціраем гэтай анучкай. Такім чынам, яблыкі захоўваюць не толькі сваю свежасць, але і сакавітасць.

**3.** Рыхтуем яблыкі мочаныя — у іх вітаміну С нават больш, чым у свежых.

**Рэцэпт мачэння:** бяром яблыкі, пажадана кіслыя гатункі, прамываем. Дно посуду (кадушка, эмаліраваны посуд, слоік) высцілаем ржаной саломай або лісцем парэчак. Яблыкі складваем хвосцікамі ўверх і заліваем суслам: ржаную муку або 150 г сухога квасу перамешваем з невялікай колькасцю халоднай гатаванай вады. Даводзім раствор да 2 літраў і даём адстаяцца, працэджваем. Дадаём гатаванай вады да 10 літраў і на кожны літр па 2 сталовыя лыжкі солі і сухой гарчыцы. Заліваем растворам яблыкі і кладзём зверху палатно і гнёт. Першы тыдзень трэба будзе даліваць сусла. Тэрмін прыгатавання яблыкаў — 40 дзён.

І памятайце — унутры кожнага яблыка ляжыць агрызак!

## Мінпрыроды прагназуе зніжэнне ў 2009 годзе ўзроўню спажывання вады да 170 л на чалавека ў суткі

**Паводле прагнозаў, у Беларусі ў 2009 годзе спажыванне вады знізіцца да 170 л у суткі на чалавека. Аб гэтым паведаміў начальнік аддзела дзяржкантролю за выкарыстаннем водаў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Уладзімір Панасенка.**

Паводле яго слоў, такі эфект чакаецца ад праведзенай у рэспубліцы работы па ўстаноўцы ў кватэрах лічыльнікаў, давядзенні да прадпрыемстваў тэхнічных нарматываў водакарыстання. «Вынікі ўжо відавочныя. Так, калі ў 2005 годзе ў суткі сярэднестатыстычны беларус выкарыстоўваў 214 л вады, то ўжо ў 2007-м — толькі 184 л, хоць гэты паказчык усё яшчэ вышэйшы за сярэднееўрапейскі — 160—180 л», — адзначыў Уладзімір Панасенка.

Усяго ў 2007 годзе лічыльнікамі было абсталявана 900 тыс. кватэр. Цалкам забяспечыць будынкі прыборамі ўліку вады плануецца сёлета.

У цэлым спецыяліст адзначыў, што за апошнія 10—15 гадоў пры дастаткова высокім тэмпе росту ВУП у 10—12 працэнтаў не адзначаецца павелічэння спажывання вады. Гэта дасягаецца за кошт укаранення бязводных тэхналогій вытворчасці, паўторнага выкарыстання водных рэсурсаў, рэканструкцыі сістэм водазабеспячэння і водаадвядзення.

«Прырода ўзнагародзіла Беларусь такім стратэгічным рэсурсам, як вада. Яе запасаў хопіць, каб задаволіць як сучасныя, так і перспектыўныя патрэбнасці ў ёй. Але гэта не дае нам права выкарыстоўваць ваду бяздумна і марна», — падкрэсліў Уладзімір Панасенка.

**Надзея РАДЫВОН, БЕЛТА.**

## Айчынных натуральных прадуктаў — усё больш

**У Дзяржстандарце адбылася ўрачыстая цырымонія ўручэння айчынным вытворцам харчовай прадукцыі так званых «зялёных» сертыфікатаў, якія даюць права маркіраваць тавары знакам «Натуральны прадукт».**

Нагадаем, што правілы маркіроўкі гэтым знакам харчовай прадукцыі ўступілі ў сілу з пачатку чэрвеня. Як упэўнены распрацоўшчыкі дакумента, які рэгламентуе выкарыстанне знака, правядзенне работ па атрыманні права маркіроўкі ім будзе садзейнічаць з'яўленню на рынку прынцыпова новага класа харчовых прадуктаў.

Ён можа быць нанесены на прадукт, які павінен быць выраблены з натуральнай харчовай сыравіны жывёльнага і (ці) расліннага паходжання і без выкарыстання метадаў геннай інжынерыі.

Сам знак па форме — гэта ярка-зялёны круг, размешчаны ў цэнтры белага круга, што мае зялёную акантоўку і надпіс «Натуральны прадукт. Беларусь». Наносіцца ён можа на спажывецкую тару, этыкетку, ярлык, контрэтыкетку і інш.

На гэты раз пералік беларускіх натуральных прадуктаў папоўнілі асобныя віды малочнай і рыбнай прадукцыі, што вырабляюцца ААТ «Савушкін прадукт» (г. Брэст), ААТ «Гарадскі малочны завод № 2» (г. Мінск), ААТ «Бабуліна крынка» (г. Магілёў), ААТ «Баранавіцкі малочны камбінат» і СП «Санта Брэмар» ТАА (г. Брэст).

Дарэчы, маркіроўка знакам «Натуральны прадукт» носіць добраахвотны характар. Гэта ўжо другое па ліку ўручэнне вытворцам харчовых тавараў «зялёных» сертыфікатаў: месяц таму права маркіроўкі знакам была надзелена вялікая група малочных прадуктаў, пітной і мінеральнай вады.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШАШКІ

*Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА*

**«ПАГОДА Ў ДОМЕ»-5**

Аб'яўляем пяты конкурс на прызы калектыву Свіслацкага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі (кіраўнік Канстанцін Міхайлавіч БАРЭЛЬ) — з нормай першага спартыўнага разраду па шашках.

Будуць адзначаны пераможцы конкурсу, яго суддзя і каардынатар, а таксама лепшая рашальніца. А каб стаць першакласным рашальнікам, трэба быць пільным і не прапусціць выпадкі, калі будуць у пазіцыях пабочныя развязкі альбо якія не развязваюцца. Таму за ўказанне такіх істотных недахопаў налічваюцца прэміяльныя балы. Норма ж другога разраду — рашыць усе заданні, кожнае з якіх ацэньваецца ў адно ачко.

А цяпер падаём першае заданне:



БЕЛЫЯ: d4, e3, e5, f4, g3, g5 (6). ЧОРНЫЯ: b2, b4, c3, c7, e7, h2 (6). Выйгрыш.

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас рэдакцыі газеты «Звязда»: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10-а, рубрыка «Шашкі».

**КЛУБ ВІТОШКІНА**

Як вядома, у футболе існаваў сімвалічны «Клуб Фядотава». Яго членамі былі ігракі, якія здолелі ў чэмпіянатах СССР забіць больш за 100 галоў. Наш жа чытач з Пінска Аляксандр Кагоцька паводле аналогіі пачаў падлічваць заліковыя ачкі, якія атрымалі шашачныя кампазітары ў першынствах Беларусі, пачынаючы з першага (1976 год). Мы паведамлялі ўжо, хто ўвайшоў у «Клуб Шклудава» (праблемы-64).

«Архіварыўс» А. Кагоцька зрабіў рэйтынг-ліст і па мініяцюрах-64. Паколькі гэты жанр уведзены не так даўно, дык у ім яшчэ ніхто не набраў 100 ачкоў, але прэтэндэнты ўжо ёсць. Сярод іх — Васіль Грабенка (Мінск) (58,5 ачка), сам А. Кагоцька (58,25), Леанід Вітошкін (Гомель) (57,25), Іван Наўроцкі (Мінск) (55,75), Аляксандр Сапегін (п/а Усполле Мсціслаўскага раёна) (54,75), Дзмітрый Камчыцкі (Магілёў) (50,54), Мікалай Грушэўскі (Мінск) (43), Пётр Кажаноўскі (в. Кашэвічы Пінскага раёна) (36), Пётр Шклудаў (Наваполацк) (33), Барыс Іваноў (Мінск) (29,5) і інш. Усяго — 24 складальнікі.

А ў «Клуб Вітошкіна» (эцюды-64), апрача самога грасмайстра і трохразовага чэмпіёна СССР Леаніда Вітошкіна, які ў гэтым раздзеле кампазіцыі з'яўляецца безумоўным лідарам (304,75 ачка!), пакуль што трапілі толькі Віктар Дзенісенка з в. Гатава Мінскага раёна (158,5), П. Шклудаў (137,5) і мінчанін Віктар Шульга (127,75). Астатнія 43 эцюдзісты значна адстаюць ад іх: К. Малашкевіч (Ліда) (69,25), Р. Краўцоў (Магілёўская вобласць) (69), Б. Іваноў (63,5), Д. Камчыцкі (55,5), В. Грабенка (53,75), Ю. Куцян (Бабруйск) (51,5), М. Грушэўскі (48), П. Кажаноўскі (38,5), М. Зайцаў (Баранавічы) (35,25), А. Кагоцька (27,75) і інш.

Зараз А. Кагоцька працягвае працу над задачамі-64. Тут з 38 удзельнікаў наперадзе Аляксандр Шурпін (Клімавічы) (250,5 ачка). Хутка мы даведаемся, хто ж стане членам яго клуба.

**ФЕСТЫВАЛЬ «ЕТВЫЗЬ-2008»**

Ён ладзіўся ў Драгічыне ў 17 раз. Яго галоўны турнір атрымаў статус рэспубліканскага значэння. Гэтым разам у ім ўзяў удзел 61 ігрок, а перамаглі мінчане — міжнародны гросмайстар Аркадзь Плакхін, майстры Вячаслаў Палянскі і Канстанцін Кавалеўскі з Расіі. Яны набралі па 14 ачкоў, але ў такім парадку іх размясцілі дадатковыя паказчыкі. На ачко адсталі кандыдат у майстры спорту Мікалай Салейка (Баранавічы), міжнародны майстар Яўген Кандрачэнка (Гомель) і майстар ФМЖД Кірыл Хайнюк (Мінск).

Пастаянны карэспандэнт звяздоўскай шашачнай рубрыкі Яўген Кандрачэнка перадаў яе вядучаму па электроннай пошце фрагменты з партый, якія заслугоўваюць вашай увагі:



№ 1. БЕЛЫЯ (К. Барэль): b2, c1, d2, d4, e1, e5, f4, g1, g3, h4 (10). ЧОРНЫЯ (Я. Кандрачэнка): a3, a5, a7, b8, c7, d8, e7, g7, h6, h8 (10).

Кандыдат у майстры спорту К. Барэль, які падтрымлівае нашы конкурсы рашэнняў галаваломак на 64-клетачнай дошцы, у гэтай партыі з двойчы чэмпіёнам Беларусі Я. Кандрачэнкам прайграў, але ж паказаў і сваю моц гульні: 12. ...ab4! 13. bc3 gf6! 14. c:a5 ab2! (14. ...fg5? 15. h:f6 e:c5 16. ef6 = ) 15. c:a3 fg5 16. h:f6 e:c1 17. ef6 de7! 18. f:b6 a:e3x.

№ 2. БЕЛЫЯ (Я. Кандрачэнка): a3, c1, c3, e1, e3, f2, f4, g3, h2 (9). ЧОРНЫЯ (кандыдат у майстры А. Барташ, Маладзечна): a5, c5, c7, d6, e5, f6, f8, h6, h8 (9).

16. ...fe7 17. cd2 hg7 18. cb4 a:c3 19. d:b4 cd4 20. e:c5 fg5 21. fe3 gh4 22. ed4! e:a5 23. cb6 h:f2 24. e:g3!x. Не выратоўваў працяг 16. ...fg7 17. cd2! fg5 (17. ...cb6 18. fg5!! f:h4 19. gf4 e:g3 20. h:f4 gf6 21. ab4 c:a3 22. fg5x) 18. cd4! e:c3 19. d:b4 a:c3 20. ed2 c:e1 21. gh4 e:e5 22. h:d8x.

## КАЛІ МАЛАКО НАДАКУЧЫЛА

У Столінскую міліцыю напісала заяву пенсіянерка з вёскі Стахава. Старая паскардзілася, што нехта ў яе выкраў 6 бутэлек алкагольных напояў і грошы. Злодзей залез у хату праз акно. Следства ўстанавіла, што кралі двое: мясцовая жыхарка і даярка з Ляхавіцкага раёна. Няўжо па гарэлку трэба было ехаць за 200 км?

## СМАГА ДАНЯЛА

На братоў з в. Велута Лунінецкага раёна міліцыя завяла дзве крымінальныя справы. Напачатку яны адкрыта выкралі ў аднавяскоўца тры бутэлькі віна і столькі ж піва, а затым у інваліда прыхапілі пакет з прадуктамі і цыгарэтамі. Выпілі і закусілі, а потым у суд?

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

**У суд Сенненскага раёна Віцебскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутнай без вестак **ЦІХАНАВАЙ Людмілы Анатольеўны,** 24.07.1974 года нараджэння, ураджэнкі г. Віцебска, апошняе вядомае месца жыхарства — в. Рулёўшчына Сенненскага раёна Віцебскай вобласці. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Л.А. Ціханаву, паведаміць іх суду Сенненскага раёна Віцебскай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ДАПАМАЖЫ САБЕ САМ

## Умацоўвайце сасуды

**Кажуць, у наш час ніхто не застрахаваны ад інфаркту, інсульту і атэрасклерозу. Аднак ці варта чакаць, калі паставяць такі сур'ёзны дыягназ? Сасуды трэба ўмацоўваць. Для гэтага прапануем самы просты масаж рук. З ім лёгка справіцца самастойна, прычым рабіць такі масаж можна дзе хочаш і калі хочаш.**



**ХАТНЯЯ РЭФЛЕКСАТЭРАПІЯ**

Акрамя ўмацавання сардэчна-сасудзістай сістэмы, гэты просты масаж павышае ахоўныя сілы арганізма, паляпшае дыханне і кровазварот, умацоўвае мышцы ўсяго цела.

Сакрэт яго ў тым, што далонь — гэта збор вялікай колькасці актыўных кропак, якія злучаюцца з усімі ўнутранымі органамі. Таму, масіруючы далоні, мы займаемся рэфлексатэрапіяй і ўздзейнічаем на ўвесь арганізм цалкам. Не выпадкова ў Кітаі качаюць у далонях спецыяльныя масажныя шарыкі. Такія шарыкі знімаюць напружанне і актывізуюць работу ўсіх органаў. А можна мэтанакіравана ўздзейнічаць на пэўныя ўчасткі далоні, ад якіх асабліва залежыць работа сардэчна-сасудзістай сістэмы. На гэта спатрэбіцца ўсяго 10 хвілін у дзень. У час правядзення масажу старайцеся дыхаць носам лёгка і роўна.

**МАСІРУЕМ ДАЛОНІ**

- Перапляціце шчыльна пальцы абедзвюх рук так, каб далоні і пальцы былі накіраваныя да твару. Павольна і з напружаннем цягніце пальцы ў розныя бакі, затым рыўком кісці вызваліце іх. Паўтарыце практыкаванне.
- Счапіце палец адной рукі з адпаведным пальцам другой рукі. Цягніце з намаганнем, пакуль пальцы не разыдуцца ў розныя бакі. Паўтарыце практыкаванне з кожнай парай пальцаў.
- Памасіруйце кончык кожнага пальца на адной руцэ кончыкамі адпаведных пальцаў другой рукі. Затым разатрыце кожны палец (на абедзвюх руках) ад кончыка да асновы. Выконвайце практыкаванне павольна і старанна, каб уздзеянне на кожны палец было размеркавана раўнамерна (на знешні і тыльны бакі пальцаў).
- Моцна заціснiце паміж указальным і сярэднім пальцамі, паклаўшы на перапонку паміж імі, той палец, якому робіце масаж. Павольна пацягніце палец ад самай яго асновы да кончыка, адначасова злёгку «выкручваючы» яго.
- Займіцеся ўнутраным бокам кісці. Масіруйце яе ўказальным і вялікім пальцамі — паміж кожнай з дробных костачак пясці. Памасіруйце далонь вялікім пальцам другой рукі, можна таксама прайсціся па ёй костачкай сагнутага ўказальнага пальца.
- Моцна памасіруйце бугарок у аснове вялікага пальца і бугаркі іншых пальцаў. На гэтым этапе рукі павінны добра разагрэцца. Памасіруйце яшчэ і паміж пальцамі. Звярніце ўвагу на ўсе дробныя мышцы паміж касцямі далоні.
- І на заканчэнне вазьміце клубок суровых шарсцяных нітак велічынёй з грэцкі арэх. Важна, каб яго паверхня была няроўная, шурпатая, бугрыстая. Пакладзіце яго на далонь бліжэй да запясця і пачынайце качаць другой далонню. Качайце кругамі, паступова звужваючы іх. Калі дойдзеце да цэнтра далоні, зноў памасіруйце яе пальцамі другой рукі: патузайце за кожны палец, а затым патрасіце расслабленай далонню, каб скінуць напружанне. Зрабіце тое ж самае з другой далонню.

-2519-

СЕЗОННЫЯ НАРЫХТОЎКІ

## Памідорная пара

**Перапрацоўваць памідоры можна рознымі спосабамі. Аднак асноўнымі застаюцца кансерваванне, марынаванне і саленне.**

**КАНСЕРВАВАННЕ**

Падбярыце плады прыкладна аднолькавага памеру, памыйце, шчыльна ўлажыце ў падрыхтаваныя слоікі, перасыпаючы старанна прамытымі прыправамі: чорным і духмяным перцам гарошкам, гваздзікай, каляндрай, зубкамі часнаку, парасончыкамі кропу, галінкамі эстрагону, пятрушкі, лісцем вішні і чорных парэчак, чырвоным горкім перцам, настругагым коранем хрэну.

**Гатуем заліўку:** на 1 л вады — па сталовай лыжцы цукру і солі. Заліце кіпячы расол у слоікі з памідорамі, вытрымайце 10 хвілін пад накрыўкай, зліце расол, зноў закіпяціце і заліце ў слоікі. Дадайце ў 3-літровы слоік 1 дэсертную лыжку воцатнай эсенцыі, закатайце, перавярніце, накрыйце коўдрай, пакіньце астываць.

*Магчымыя варыянты:* на 1 л вады — сталовая лыжка солі і ўдвая больш цукру; ці на тую ж колькасць вады па 2 ст. лыжкі солі і цукру. У гэтым выпадку эсенцыі можна ўзяць менш (1 ч. лыжку), аднак заліваць памідоры расолам давядзецца не двойчы, а тройчы.

**МАРЫНАВАННЕ**

Гэтак жа шчыльна ўлажыце памідоры ў слоікі ўперамежку з парэзаным салодкім перцам. Можна болей нічога не дадаваць, а можна перасыпаць прыправамі (на свой густ): карыцай, гваздзікай, эстрагонам, кінзой, лісцем сельдэрэю і г.д.



**Гатуем заліўку:** на 1 л вады — 150 г цукру, 2 ст. лыжкі солі. Заліце кіпячы расол у слоікі, накрыйце накрыўкамі, праз 10 хвілін зліце (зрабіце так тройчы). Пасля чаго ўліце ў слоікі 9-працэнтны воцат (на 3-літровы слоік 2 ст. лыжкі). Воцат можна замяніць эсенцыяй, разведзенай з вадой (1:10). Закатайце, перавярніце, ухутайце, дайце астыць.

**САЛЕННЕ**

Соляць звычайна памідоры ў вялікіх ёмістасцях. Аднак у апошнія гады ўсё больш распаўсюджаным становіцца спосаб закаткі салёных памідораў у слоікі: іх зручна захоўваць, памідоры маюць выдатны смак да вясны.

На дно 3-літровага слоіка пакладзіце настругагы корань хрэну (30—50 г), 2—3 зубкі часнаку, 1—2 парасончыкі кропу. Пакладзіце памідоры, дадайце разрэзаную напалам цыбуліну і палавіну яблыка кіслых гатункаў.

У ваду **для заліўкі** пакладзіце лісце ці тонкія галінкі вішні, парэчак, сцябліны кропу, соль (2 ст. лыжкі на 1 літр) і цукар (1,5 ст. лыжкі). Гатуйце 5 хвілін (не больш), размяшайце, працадзіце, заліце ў слоікі з памідорамі. Накрыйце накрыўкамі, вытрымайце 10—15 хвілін. Зліце расол, закіпяціце яшчэ раз і заліце слоікі даверху. Усыпце сталовую лыжку сухой гарчыцы, закатайце, перавярніце, ухутайце, пакіньце астываць.

**ТАМАТНАЯ ПАСТА**

Пераспелыя, не прыдатныя для кансервавання памідоры пойдуць у таматную пасту, пюрэ. Пабланшыруйце памідоры, зніміце скурку, парэжце на частачкі, пакладзіце ў каструлю і паварыце паўгадзіны памешваючы. Пратрыце праз сіта і ўварыце на невялікім агні. пакуль аб'ём не паменшыцца ўдвая. Дадайце 150 г солі на літр атрыманага пюрэ, перамяшайце, каб растварылася соль. Астудзіце, разлажыце ў падрыхтаваныя слоікі невялікага аб'ёму. Можна зусім не класці соль, але тады слоікі давядзецца пастэрызаваць у вадзе, якая кіпіць: 0,5 л — 5 хвілін; 0,7-літровыя — 10 хвілін. Закатайце як звычайна.

-2520-

